VI УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ЛЮТАГА 2021 г. ПЯТНІЦА № 27 (29396)

Адзінства. Развіццё. Незалежнасць

Фота БелТА.

Учора ў Мінску распачаўся, а сёння працягваецца VI Усебеларускі народны сход.

Сёлета гэта падзея ў жыцці краіны стала знакавай асабліва. Пасля ўзрушэнняў 2020-га, выкліканых і знешнімі, і ўнутранымі фактарамі, нам, як ніколі, трэба спакойна абмеркаваць, якім шляхам ісці далей. Спосаб, як гэта зрабіць, беларускае кіраўніцтва ведае, ён праверaны не аднойчы і самы правільны.

«Ужо ў шосты раз у суверэннай гісторыі краіны мы звяртаемся наўпрост да народа. Каб разам абмеркаваць і прыняць кансалідаванае рашэнне па далейшаму развіццю нашай дзяржавы і грамадства», — абазначыў задачы Сходу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да яго дэлегатаў, абраных людзьмі па ўсёй краіне.

У першы дзень самай яркай падзеяй быў, несумненна, даклад кіраўніка дзяржавы (яго мы публікуем сёння ў поўным аб'ёме). Нашы карэспандэнты прысутнічалі таксама падчас іншых выступленняў, пыталіся меркаванні экспертаў і ўражанні дэлегатаў. Аб усім гэтым — у сённяшнім нумары, галоўны загаловак якога, канешне ж, дэвіз Сходу: «Адзінства. Развіццё. Незалежнасць». Тое, што ўсім беларусам сёння патрэбна, напэўна, больш за ўсё.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Даклад Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі на VI Усебеларускім народным сходзе

Дарагія сябры! Я на гэтым настойваю чарговы раз. І прашу вас, каб наша размова была сумленнай, шчырай. Яна ў прамым эфіры, яе глядзяць мільёны людзей, не кажучы ўжо аб нашай Беларусі, але і за межамі нашай краіны. Яшчэ раз падкрэсліваю, нам баяцца няма чаго і няма каго. Саромецца нам таксама не да месца. ***Размова павінна быць адкрытая, сумленная і прынцыповая. Нічога не трэба хаваць. Мы перажываем вельмі сур'ёзны і пераломны перыяд у жыцці не толькі нашай дзяржавы, але і ўсяго беларускага народа.*** Такіх момантаў у гісторыі нашай краіны, калі мы былі ў складзе Савецкага Саюза і незалежнай Беларусі, было няшмат. Сучасны перыяд можна параўнаць з развалам Савецкага Саюза і яго наступствамі. Сучасны перыяд можна параўнаць з першым Усебеларускім народным сходам. Гэта бліжэй. Розніца толькі ў тым, што тады была поўная безнадзейнасць. Не было краіны, не было наогул нічога. Пераломны момант, хаос у розумах людзей. Вельмі многія гэты перыяд памятаюць. Я таксама яго вельмі добра памятаю, бачачы гэта зверху, у якасці дэпутата Вярхоўнага Савета. І ў гэтай зале ёсць людзі, якія былі тады побач са мной. Мы былі разам, мы гэта ўсё перажылі. Прыкладна такі перыяд перажываем і цяпер. ***Асаблівасць — Беларусь падверглася жорсткай атацы звонку.*** Паўтараю, вельмі жорсткай атацы звонку. Яны паступілі правільна, выбудоўваючы сваю стратэгію. Чаму? Таму што паспрабаваць свае метады і методыкі ўжо не на прыкладзе разбуранай і пакоранай краіны, дзе ў галовах раздрай поўны, а на маналітнай і быццам бы нармальнай рэспубліцы для іх было вельмі важна. Атрымаецца — значыць, можна дзейнічаць далей. І перш за ўсё, як я заўсёды казаў, гэта былі для іх пэўныя выпрабаванні іх зброі, гэта быў трамплін для нападу на Расію. Скажыце, я не меў рацыі? Мы ўжо сёння бачым, што адбываецца.

Наклала свае жорсткія асаблівасці ў гэты перыяд і пандэмія. Слухайце, як быццам хтосьці прыдумаў гэты сур'ёзны фон, як у нас прынята казаць, «каляровых рэвалюцый». ***«Каляровая рэвалюцыя» па законах нават гэтых «шарпаў» і іншых у Беларусі была немагчымая. Таму, абапіраючыся на пэўныя ўнутраныя сілы (колькі іх было, вы можаце меркаваць самі, я не буду пра гэта казаць), была зроблена спроба не «каляровай рэвалюцыі», а мяцяжу.*** Па прынцыпе, глядзіце, як назвалі, — бліцкрыг. Вам ні пра што гэта не нагадвае? Ні пра што не гаворыць? Мне нагадвае, хоць я і не перажываў гэтыя часы, і ў зале ў гэтай няма людзей, якія перажылі бліцкрыг у сярэдзіне мінулага стагоддзя ў напрамку Савецкага Саюза, нашай краіны. І ён павінен быў прайсці перш за ўсё па Беларусі. Таму гэта была ніякая не «каляровая рэвалюцыя», гэта мяцеж, і форма яго — менавіта мяцеж. І метад — бліцкрыг. Бліцкрыг не атрымаўся. Мы ўтрымалі сваю краіну. Пакуль.

СТАР. 2—14

Фота БелТА.

ISSN 1990 — 763X

Адзінства. Развіццё.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Я хачу вам нагадаць тое, што я казаў зусім нядаўна. Мы не ведаем дакладна, што яны хочуць і што яны распачнуць. Мы ведаем абсалютна адназначна і дакладна, што яны ад нас не адступяцца. Таму што задзейнічаны вельмі магутныя сілы, і прайграць у гэтай вайне ім быццам бы не выпадае. Але нам трэба выстаяць, чаго б гэта ні каштавала. І 2021 год, гэты год будзе вызначальны. Усё пазнаецца ў параўнанні. Не я прыдумаў і не вы. Гэта аксіёма. Значыць, яна не патрабуе ніякага доказу. Давайце параўнаем, чаго яны хочуць, што хоча сіла, якая супрацьстаіць нам, якая ўзгадаваная і навучаная за мяжой. Якая іх праграма?

Я хачу вам проста нагадаць тое, што павінен ведаць, абавязаны ведаць кожны сёння. Перш чым выкласці нашу праграму, я нагадаю іх праграму. Хутчэй, не для вас, вы людзі спрактыкаваныя, для тых, хто, можа быць, перш за ўсё, мае кароткую памяць і забыўся.

Першае. Эканоміка. Правядзенне павальнай прыватызацыі прадпрыемстваў. Прыватная ўласнасць — гэта ўсё, яна выратуе краіну, і ў ёй перспектыва развіцця. Я не буду каментаваць. Думайце самі.

Другое. Неадкладная ліквідацыя слабых прадпрыемстваў. Пра стратныя гаворкі няма. Ліквідацыя — і кропка. Усе, хто вызваліцца на гэтых прадпрыемствах, а на вуліцу будуць выкінутыя мільёны людзей, цытую, «знойдуць сваё месца ў IT-сферы».

Трэцяе. Забарона продажу расійскім кампаніям аб'ектаў беларускай інфраструктуры. Падкрэсліваю асабліва — расійскім кампаніям. Усім астатнім можна. Польскім, літоўскім, амерыканскім, нямецкім і іншае.

Чацвёртае. Распродаж зямель сельскагаспадарчага прызначэння. Ізноў без каментарыяў. Гэта асноўныя моманты іх эканамічнай праграмы.

У палітычнай сферы — выхад з Саюзнай дзяржавы з Расійскай Федэрацыяй, Еўразійскага саюза, Мытнага саюза і іншых інтэграцыйных утварэнняў, дзе дамінуе Расія.

Другое (палітычная сфера). Аднаўленне пагранічнага і мытнага кантролю на мяжы з Расійскай Федэрацыяй.

Трэцяе. Выкананне ўсіх крытэрыяў членства ў Еўрапейскім саюзе і НАТА. Ну цяпер зразумела, чаму яны збеглі туды, а не на ўсход.

Забарона прарасійскіх арганізацый, а таксама расійскіх фондаў і арганізацый.

У інфармацыйнай сферы. Катэгарычная забарона трансляцыі публіцыстычных, грамадска-палітычных, навінавых праграм расійскіх тэлеканалаў. Далей вы памятаеце: прыцягнуць сюды літоўскія, польскія, заходнія каналы і даць ім поўную волю.

У ваеннай сферы. Выхад з арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, вяртанне поўнага кантролю сваіх сістэм супрацьпаветранай і супрацьракетнай абароны. То-бок, у нас сёння з Расіяй створана адзіная сістэма паветранай супрацьракетнай абароны. А гэта надзейны шчыт, і гэта паказалі падзеі канца мінулага года, надзейны шчыт для абароны і Беларусі, і Расіі. Гэтую сістэму прапануецца знішчыць.

Другое (гэта ваенная сфера). Вывядзенне з тэрыторыі рэспублікі расійскіх ваенных аб'ектаў. Паслухайце, гэта наогул смех. Вілейская база сувязі, сувязі, дзе ў людзей практычна няма зброі, там некалькі расіян-афіцэраў і рабочыя месцы для нашых людзей, якія жывуць у Вілейцы.

Я наведваў гэтую базу. Або Ганцавічы, тое ж самае, абсалютна не ваенная база, але вельмі важная

Фота БелТА.

для нашай сумеснай групоўкі Беларусі і Расіі, якая дазваляе зазірнуць за гарызонты і выявіць любы пуск ракет з таго боку. Там таксама некалькі чалавек, якія ахоўваюць гэты аб'ект са стралковай зброяй. Тут ужо чаго карціць, якія яшчэ базы тут на тэрыторыі Беларусі?

Трэцяе — перавод выхаваўчай работы ў арміі выключна на беларускую мову. Беларуская мова павінна быць адназначна ўведзена і павальна, пачынаючы з дзіцячага садка і заканчваючы намі. Без каментарыяў.

У гуманітарнай сферы — платная адукацыя. Другое — платная медыцына, ахова здароўя, трэцяе — аднаўленне беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы як нацыянальнай альтэрнатывы Беларускаму экзархату Рускай праваслаўнай царквы. Чацвёртае — стварэнне скразной сістэмы адукацыі, пра што я вам казаў, на беларускай мове: ад дзіцячых садкоў да ўніверсітэтаў. Увядзенне крымінальнай адказнасці за публічную абразу беларускай мовы і гэтак далей. Я проста вам нагадаў тое, што вы ўжо чулі, пра што вы чыталі. Для чаго я гэта зрабіў? Паўтаруся. Усё пазнаецца ў параўнанні. Зараз давайце гаварыць і параўноўваць, цяпер я прадстаўлю наш пункт гледжання для таго, каб беларускі народ, а можа, хто-небудзь з вас, хто не вызначыўся, падумалі і вызначыліся. Папярэджваю вас: будзе вельмі сумна, таму што няма папулярных і вясёлых пытанняў у эканоміцы. мы будзем абмяркоўваць перш за ўсё даклад, які будзе агучаны кіраўніком дзяржавы з гэтай трыбуны. Калі вам нешта ў гэтым дакладзе не спадабаецца, пытанні не да мяне. Мой даклад быў трошкі як Прэзідэнта іншы, чым той, які я вам прадстаўлю. І я яго адклаў у бок, шмат у чым зыходзячы з тых пытанняў, якія вы ўзнялі на дыялогавых пляцоўках і на выніковых рэгіянальных дыялогавых пляцоўках перад паездкай сюды. Калі хочаце, гэта ў нейкім сэнсе рэакцыя кіраўніцтва краіны і кіраўніка дзяржавы на тыя прапановы, якія вы там выпрацавалі.

Такім чынам, паважаныя дэлегаты і госці шостага Усебеларускага народнага сходу!

Дарагія суайчыннікі!

Пачынаючы з мінулага стагоддзя, мы вымяраем гісторыю дасягненняў беларусаў пяцігодкамі.

Гэтай традыцыяй пачалося будаўніцтва дзяржаўнасці маладой беларускай рэспублікі.

Нашы дзяды і прадзеды ставілі, здавалася, недасягальныя мэты і здзяйснялі працоўныя подзвігі, падымаючы разбураную войнамі і ўзрушэннямі эканоміку на небывалы ўзровень.

Ствараючы суверэнную дзяржаву на абломках савецкай краіны, мы адрадзілі гэтую традыцыю, каб зберагчы сувязь пакаленняў і вопыту, без чаго немагчыма будаваць будучыню. Заўважу, што не мы былі ініцыятарамі распаду той вялікай імперыі, якая забяспечвала стабільнасць у свеце, з'яўлялася сур'ёзнай процівагай якой на найбліжэйшую пяцігодку вызначыць наш Сход.

Галоўны арыенцір — гэта чаканні, памкненні, магчымасці развіцця сучаснага чалавека. Бо якія б мы ні ставілі мэты, галоўным рэсурсам у іх дасягненні застаюцца людзі — таленавітыя і працавітыя, адданыя сваёй зямлі.

На кожным з беларусаў ляжыць адказнасць за лёс краіны. І галоўнае, ва ўсіх ёсць роўныя, спрыяльныя стартавыя ўмовы для таго, каб стаць паспяховым і мяняць жыццё Беларусі да лепшага.

У гэтым сутнасць справядлівасці, запыт на якую ў свеце, як бачым, толькі расце. У гэтым сэнс нашай мадэлі сацыяльна арыентаванай дзяржавы, якая даказала сваю жыццяздольнасць, нягледзячы на сусветныя санкцыі і палітычны ціск.

Мы на парозе новых лёсавызначальных рашэнняў. І нам ёсць на што абаперціся ў сваім руху да новых мэт.

Дык што ж змянілася за апошнія пяць гадоў?

Мы зацвердзіліся ў статусе самастойнага гульца на міжнароднай арэне і надзейнага ўдзельніка розных інтэграцыйных аб'яднанняў. Захавалі свае міратворчыя пазіцыі. Вылучылі шэраг ініцыятыў глабальнага маштабу.

Мы па сусветных мерках невялікая сяроднееўрапейская дзяржава. Стабільна займаем высокія месцы ў рэйтынгу Індэкса чалавечага развіцця. Па індыкатары чаканай працягласці жыцця Беларусь на другім месцы сярод краін — удзельніц СНД. Мы саступаем толькі каўказскім доўгажыхарам.

У штогадовым рэйтынгу эфектыўнасці нацыянальных сістэм аховы здароўя апярэджваем такіх лідараў, як Злучаныя Штаты Амерыкі і Расія. Ва ўмовах пандэміі наша ахова здароўя праходзіць, калі можна так сказаць, «франтавую загартоўку», якая, перакаларусь на другім месцы сярод краін — удзельніц СНД. Мы саступаем толькі каўказскім доўгажыхарам.

У штогадовым рэйтынгу эфектыўнасці нацыянальных сістэм аховы здароўя апярэджваем такіх лідараў, як Злучаныя Штаты Амерыкі і Расія. Ва ўмовах пандэміі наша ахова здароўя праходзіць, калі можна так сказаць, «франтавую загартоўку», якая, перакаванны, падыме яе на якасна новы ўзровень.

Традыцыйныя галіны — машынабудаванне, хімічная прамысловасць, сельская гаспадарка — працуюць бесперабойна.

Насуперак усім выклікам, мы дасягнулі найбольш высокага ўзроўню самазабеспячэння харчаваннем сярод краін Еўразійскага эканамічнага саюза. Уваходзім у пяцёрку найбуйнейшых экспарцёраў малочнай прадукцыі ў свеце.

У энергетыцы мы стварылі ўмовы для выкарыстання мясцовых відаў паліва. Завяршылі самую маштабную будоўлю краіны — Беларускую атамную станцыю.

Укараняючы зялёныя стандарты ў рабоце прадпрыемстваў, прасуніліся ў сферы экалогіі.

Адначасова мы становімся краінай найноўшых тэхналогій. Фарміраванне касмічнай, атамнай, біяхімічнай галін эканомікі адкрывае новыя гарызонты ў будучыню.

Мы значна ўмацавалі лагістычны патэнцыял рэспублікі. Усе населеныя пункты звязаныя сучаснымі транспартнымі магістралямі. Гарады і рэгіёны сталі бліжэй адзін да аднаго.

Рэалізавана ў поўным аб'ёме і праграма жыллёвага будаўніцтва. Пабудавана першая чарга трэцяй лініі метрапалітэна ў Мінску.

Бясспрэчным брэндам краіны стаў дасягнуты намі высокі ўзровень камфорту і бяспекі. У тым ліку пры правядзенні мерапрыемстваў міжнароднага фармату. Нядаўнія Еўрапейскія гульні — таму прыклад.

Незалежнасць

Безумоўна, гэтыя і іншыя дасягненні ўвойдуць у гісторыю пяцігодкі, але запомніцца яна і ўзрушэннямі.

Узрушэннямі, якія страсянулі ўвесь свет, у тым ліку і нас, пановаму расставілі прыярытэты ў жыцці людзей, акцэнты ў міжнародных адносінах. Можна сумленна і адкрыта сказаць: свет ашалеў.

Цяжкі быў мінулы год для ўсяго чалавецтва. Але затое мы ўбачылі, як у адно імгненне ад ідэй глабальнага развіцця вялікія і малыя дзяржавы перайшлі да стратэгій нацыянальнага выжывання.

Памятаеце, мы ўвесь час змагаліся супраць глабалізму. Яго навязвалі нам ад Злучаных Штатаў Амерыкі, Еўрасаюза да іншых буйных дзяржаў. І як толькі з'явіўся гэты жупел у выглядзе пандэміі, усе скурчыліся. Усе замкнуліся. І пляваць на сяброў і на суседзяў. Усе зачыніліся, усе закрылі свае межы. Дык дзе ж гэты глабалізм? Таму не верце, што кажуць. Дэмакратыя, глабалізм і іншае — гэта каб мазгі дурыць людзям у свеце. І гэта робяць некалькі дзяржаў для таго, каб панаваць у свеце. І як толькі сітуацыя зменіцца, хоць трохі, яны імгненна зменяць сваю палітыку. Так і здарылася. Гэта сведчыць пра што? Пра тое, што нашы інтарэсы рэальна хвалююць толькі нас. І толькі такая моцная дзяржава, як наша, у стане забяспечыць іх абарону і захаванне. Я кажу «моцная», таму што мы былі і ёсць маналіт.

Тым не менш тэма «замежжа нам дапаможа» ўсё яшчэ бударажыць некаторыя розумы. Але, нягледзячы на штучна створаную знешнімі сіламі палітычную напружанасць у грамадстве, дзяржава выстаяла.

Як я казаў, пакуль выстаяла. І павінен вас запэўніць, забягаючы наперад, мы выстаім. Будзьце ў гэтым упэўненыя. Выстаім, чаго б нам гэта ні каштавала, таму што іншага нам не дадзена.

(Апладысменты).

Дзякуючы моцнай уладзе не адбылося ніводнага збою. Пачынаючы з работы галін і дзяржаўных сэрвісаў і заканчваючы штодзённымі дробязямі. Сацыяльныя праграмы і абавязацельствы выконваюцца ў звыклым для грамадзян рэжыме.

Можа быць, і не зусім так, як камусьці б хацелася. Пра гэта сведчаць і апошнія маштабныя сацыялагічныя даследаванні, якія мы нядаўна правялі. І вы ведаеце, я вельмі часта і шмат чытаю інфармацыі аб тым, што адбываецца ўнутры краіны. І паверце, я яшчэ не закасцяневў і нават не забранзавеў. Дакладней, не забранзавеў і нават не закасцяневў. Я ведаю, што робіцца ў краіне. Я атрымліваю масу інфармацыі. Я сам бываю на месцах і бачу, чым жывуць людзі. Праводзячы гэтыя сацыялагічныя даследаванні, мне далажылі велізарную інфармацыю, перш за ўсё негатыўнага характару. Пазітыў мне не патрэбны. Я пра гэта ведаю, пра гэта пішуць, гавораць і гэтак далей і да таго падобнае. Таму, калі нехта кажа, што ў мяне хтосьці тры, чатыры, пяць чалавек вакол мяне ў найбліжэйшым атачэнні фарміруюць маё меркаванне, забудзьцеся. Я не той чалавек, часам на шкоду сабе. Часам трэба было б і прыслухацца да каго-небудзь. Але я ўсё бяру пад сумненне. Гэта мой прынцып. Калі хочаце, ад Маркса, гэта не я прыдумаў. Бяры ўсё пад сумненне. І вам гэта раю рабіць у нашым жыцці.

І ўсё ж такі таму спакойнаму жыццю, нашаму суверэнітэту і стабільнасці кінуты сур'ёзны выклік.

Вытрымаўшы яго, мы павінны добра разумець, якую бяду прадухілілі.

Згадайце, да чаго прывяла чарада так званых «каляровых рэвалюцый», і нават не мяцяжоў на постсавецкай прасторы. Да перманентнай, хранічнай нестабільнасці і збяднення насельніцтва. Не трэба называць дзяржавы? Я думаю, вы гэта добра ведаеце. Усё пачалося з Расійскай Федэрацыі, калі ў сярэдзіне 90-х гадоў вось гэтую праграму, якую я вам напачатку зачытаў, праграму нашых збеглых і пратэстуноў, пачалі рэалізоўваць у Расійскай Федэрацыі. Гэта было на маіх вачах. І наш Вярхоўны Савет з Андрэйчанкам, у якім мы працавалі, і Аляксей Камай, дзякаваць Богу, жывы, здаровы. Вельмі доўга жывіце, я вас вельмі прашу. Вы нам вельмі патрэбны. Вы патрэбны нам як чалавек, які бачыў усё. Праходзіў праз мяцяжы, праходзіў праз гэтыя рэвалюцыі, калі нязначная меншасць у Вярхоўным Савеце перавярнула ўсё. Я гэта ўсё бачыў. Бачылі і некаторыя з вас. Бачылі, што адбывалася. Нам ні ў якім разе нельга дапусціць паўтарэння гэтага. Так, Лукашэнка не той. Так, Лукашэнка непажаданы. Але справа ж не ў Лукашэнку. Прыйдзе час, выбераце новага Лукашэнку ці кагосьці яшчэ там сярод нас, таленавітых. Вас людзей шмат такіх. Але хіба толькі таму, што камусьці ён не падабаецца? Што, бачыце, з аўтаматам бегае там па вуліцах. Яго трэба скінуць. Не, дарагія мае, справа, вядома, не ў Лукашэнку перш за ўсё.

Мэты іншыя — нас трэба зламаць. Мы нежаданыя, мы не павінны былі з'явіцца на міжнароднай сцэне. Нас будуць пастаянна атакаваць, і мы павінны вытрымаць.

Ці паглядзіце яшчэ адзін прыклад — на наступствы «арабскай вясны». Памятаеце, з Туніса пачалося? Потым працягнулася дзе? Потым Лівія. Потым Сірыя. А ў прамежку, а можа быць, і трохі раней — Садам Хусэйн з вядомай краінай. І што? Пасля гэтага людзі сталі жыць лепш? І што ж гэта за дэмакратыя, калі Муамара Кадафі распялі і пасадзілі на кол. Публічна. Прэзідэнта Лівійскай Рэспублікі. Я яго добра ведаў. Быў адданым чалавекам не толькі ўласнаму народу. У яго такі фантом быў — наогул Паўночную Афрыку зрабіць багатай. А гэта ўплывовым людзям не трэба было. Распялі, пасадзілі на кол. А вы не памятаеце публічнае пакаранне смерцю Садама Хусэйна? Вы не памятаеце, як яго павесілі?

Гэта што, дэмакратыя? Гэта што, нармальна, калі са зброяй, самай сучаснай зброяй у руках да цябе прыходзяць у дом і жыхароў вешаюць? Вам нічога гэта не нагадвае? Думаю, нам, беларусам, якія маюць памяць, нагадвае многае. Так было ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў нас, калі прыходзілі, вешалі, спальвалі, дзетак падкідвалі, як мышанят, падстаўляючы штыкі, праколвалі іх. Наш народ не павінен быў жыць. Ён быў лішні для той цывілізацыі, якая прыйшла тады да нас, на нашу зямлю. А яны зараз, нашчадкі той цывілізацыі, нас вучаць жыццю. Ды пабойцеся Бога. Вам трэба кланяцца ў пояс беларусам, нам, дзецям пераможцаў той страшнай Вялікай Айчыннай вайны.

Так, мы ішлі па краі такой бездані, але абышлі яе. І вядома, павінны зрабіць высновы. Мы ведаем мадэратараў вулічнай актыўнасці. Ведаем, якія знешнія сілы стаяць за імі. Ведаем, якія грошы на гэта кінутыя. Але і пэўную ўразлівасць часткі грамадства і сістэмы перад майданнымі тэхналогіямі мы не можам ігнараваць. Тым больш цяпер, калі знаходзімся ў працэсе змены пакаленняў.

Фота БелТА.

Гэтая з'ява аб'ектыўна мае складаны характар. Мы назіраем канкурэнцыю светапоглядаў, несупадзенне пазіцый па многіх пытаннях жыццеўладкавання — ад эканомікі да выхавання дзяцей. І нам жыццёва неабходна, у першую чаргу абапіраючыся на мудрасць і вопыт тых, хто старэйшы, знайсці рашэнні ўзніклых супярэчнасцяў. Нам нельга дапусціць разрыву пакаленняў, як гэта адбылося ў гады распаду Савецкага Саюза.

Праз чвэрць стагоддзя цяжкага, але важнага шляху мы стаім на парозе новых якасных пераўтварэнняў нашай краіны. 2021 год — рубеж. Па сваёй лёсавызначальнасці ён супастаўны з вехамі пачатку XX стагоддзя і сярэдзіны 90-х, пра што я казаў. Але ў адрозненне ад тых смутных часоў (я таксама пра гэта казаў) сёння ў нас ёсць разуменне сітуацыі і план дзеянняў, які дае ўсе шанцы на паспяховае развіццё.

Што ж нам неабходна зрабіць:

першае — павысіць эфектыўнасць дзяржаўнага кіравання;

другое — забяспечыць новы ўзровень камунікацыі ўлады і грамадства;

трэцяе — стварыць умовы для раскрыцця патэнцыялу чалавека, рэалізацыі яго магчымасцяў;

забяспечыць наступнае — якасны рост эканомікі на аснове ініцыятывы, інавацый і сучаснага кіравання;

наступнае — вызначыць бягучыя і доўгатэрміновыя прыярытэты дзяржавы на знешнім контуры.

Тут мы павінны дакладна разумець, што адбываецца ў геапалітыцы, вакол нас, у глабальным маштабе. Відавочна, што на змену глабалізацыі прыходзіць рэгіянальны эгаізм з элементамі пратэкцыянізму. Важна вызначыць, як гэтыя працэсы ўплываюць на наша жыццё і якое прыкладна месца павінна заняць Беларусь у новым перафармаціраваным свеце.

Памятаеце, я казаў, што пандэмія сыдзе. Усё сыдзе — дзе будзем мы пасля гэтага? Я не меў рацыі? Сёння мы пацвярджаем гэты тэзіс. Што адбываецца наогул? Акцэнты ў сусветнай палітыцы ссоўваюцца ў плоскасць усё больш жорсткай канкурэнцыі, яе яркім адлюстраваннем выступаюць рознагалоссі паміж ЗША і Кітаем, Еўрапейскім саюзам і Расіяй, Расіяй і іншымі буйнымі дзяржавамі. Стратэгічнае саперніцтва ўладных людзей мае ўсе шанцы перайсці ў іншую, больш трывожную фазу. Астатнія дзяржавы спрабуюць балансаваць або імкнуцца далучыцца да таго ці іншага лагера, а часам іх вымушаюць зрабіць гэта. І далёка не заўсёды такі выбар на іх карысць. ***Міждзяржаўны дыялог змяніўся банальным працісканнем уласных інтарэсаў, міжнароднае права не спраўляецца з рэгуляваннем спрэчак і канфліктаў, палітыкі перасталі чуць і слухаць адзін аднаго, а прызнаныя шматбаковыя пляцоўкі, створаныя для падтрымання міру і бяспекі, дэградуюць і не могуць эфектыўна выконваць свае функцыі. І пандэмія пры гэтым — каталізатар многіх працэсаў і змен, пра якія я толькі што сказаў.***

Паглядзіце на падзеі за мяжой: лакдаўны, беспарадкі, бітвы вакцын. Пратэстамі, у іх самых радыкальных праявах, ахоплены і так званыя развітыя дэмакратыі — Злучаныя Штаты Амерыкі, краіны Заходняй Еўропы, Польшча, Францыя, Германія і іншыя. Свет палае. Давайце шчыра дадзім ацэнку ўсім гэтым падзеям.

Праблема глыбей, чым здаецца многім. Напрыклад, не ў абортах праблема ў Польшчы, не. Праблема не ў тым, што забаранілі разводзіць у сельскай гаспадарцы нейкіх жывёл, не. Гэта спускавы кручок. Польскі народ выступіў супраць той палітыкі, якая праводзіцца ў Польшчы. Або вазьміце Літву. У былыя гады там жыло чатыры з паловай мільёны чалавек. А колькі засталося? Ніхто палічыць не можа. Менш за два. І нашы рвуцца ў гэты рай. Там вызваліліся месцы. Яшчэ адзін прыклад: нядаўна палякі, убачыўшы, як мы «дрэнна» змагаемся з пандэміяй, наогул знялі ўсялякія абмежаванні — экзамены і тэсціраванне для нашых урачоў і медсясцёр. Толькі прыязджайце, дапамажыце выратаваць народ. Памятаеце, я рэагаваў на гэта. Дык калі ў вас так добра і ка-лі зусім дрэнна ў Беларусі, чаго вы ўвогуле лезеце да нас? Чаго вы просіце нешта ад нас? Паслухайце, мы, беларусы, — святы народ, мы гатовыя дапамагчы кожнаму. Можа, нават на шкоду сабе. Але мы ніколі не дазволім панукваць намі. Хопіць! Дваццаць стагоддзяў нас ставілі на калені — мы прыйшлі да таго, што нам надакучыла стаяць на каленях і кланяцца. Мы будзем будаваць сваю краіну і будзем жыць сваім розумам.

(Апладысменты.)

Так званы агульнасусветны пратэст стаў адлюстраваннем сістэмнага палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і духоўнага крызісу, які ахапіў планету. Я думаю, што прыйшоў час вынесці гэтую тэму на міжнародны ўзровень, пакуль планета не перавярнулася. Паглядзець на яе як на глабальную праблему, якая падточвае асновы не толькі парадку, што склаўся ў свеце, але і парадку ў асобных дзяржавах. Беларусь ведае, як збліжаць пазіцыі і выпрацоўваць рашэнні агульных праблем. Гэтаму служыць шэраг нашых глабальных мірных ініцыятыў — такіх, напрыклад, як ліквабавае добрасуседства. Зроблены практычныя крокі, яны падтрыманыя многімі дзяржавамі. Чаго толькі варта пяцігадовая работа трохбаковай кантактнай групы па мірным урэгуляванні сітуацыі на паўднёвым усходзе Украіны. Так, шмат чаго не зрабілі, але як раней людзі тысячамі не гінуць. Вайна прыпыненая. Так, гэта ў асноўным не наша заслуга, але і наша кропля, наша доля ў спыненні гэтай бойні ёсць. На жаль, пра гэта ўсё менш успамінаюць украінскія палітыкі, ды і кіраўніцтва краіны. Па вядомых прычынах. Але не ўкраінскі народ, я ў гэтым абсалютна перакананы. Украінцы былі і заўсёды

Адзінства. Развіццё.

застануцца нашымі суседзямі, нашымі сябрамі, нашымі братамі.

За апошнія гады ў Мінску прайшлі летняя сесія Парламенцкай асамблеі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, знакавыя міжнародныя форумы па барацьбе з тэрарызмам пад эгідай ААН і АБСЕ. Разам з тым аналіз ваенна-палітычнай абстаноўкі, стану сістэм міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі дэманструе няўхільнае нарастанне рызык і выклікаў, у тым ліку раней невядомых. Усе самыя негатыўныя прагнозы ў трэцім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя, на жаль, спраўджваюцца. Навукоўцы-футуролагі называюць гэта «новай нармальнасцю». Вось якое азначэнне! Але асабіста для мяне ў гэтым няма нічога нармальнага і разумнага. Паглядзіце: спынена дзеянне Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці, вельмі цьмяныя перспектывы Дагавора па адкрытым небе.

Пэўную надзею на прыпыненне гэтай спіралі недаверу і ваенна-палітычнай напружанасці ўсяляе дасягнуты ў апошні момант кансэнсус паміж Расіяй і ЗША па Дагаворы аб стратэгічных наступальных узбраеннях. Праўда, не выключана, што ў ЗША прыйдзе новы прэзідэнт і зноў адменіць гэта. Беларусь, безумоўна, падтрымлівае пашырэнне пазітыўнага эфекту ад гэтай дамоўленасці. Але перспектывы СНУ-3 абсалютна туманныя.

Пад прыкрыццём «прынцыпу ратацыі» фактычна на пастаяннай аснове ў рэгіёне, у тым ліку на сумежнай з намі тэрыторыі, нарошчваецца групоўка войскаў НАТА. У выніку ўзровень замежнай ваеннай прысутнасці ў рэгіёне сёння наогул не кантралюецца. Пастаянныя трэніроўкі войскаў ЗША і НАТА скарачаюць тэрмін іх гатоўнасці да баявога прымянення. Прыпынены вывад войскаў ЗША з Еўропы — новы прэзідэнт прыйшоў, адмяніў дзясяткі старых указаў ранейшага прэзідэнта, у тым ліку і гэты. Прыпынены вывад амерыканскіх войскаў з Германіі і з усёй Еўропы — гэта дэмакраты прыйшлі да ўлады.

Адначасова адкрыта, не саромеючыся, абмяркоўваюцца планы адбіцця міфічнай «пагрозы з Усходу». Да ведама: мы на Усходзе першыя, за намі Расія. Беларусь разглядаецца як яе неад'емная частка. Захад даўно забыў свае абяцанні, што інфраструктура альянсу не будзе пашырацца на ўсходнім напрамку. Я быў сведкам і ўдзельнікам гэтых абяцанняў. Што далей? Новая гонка ўзбраенняў? Адназначна. Трэцяя сусветная вайна?

Як ні парадаксальна, сёння для многіх больш выгадная канфрантацыя, чым мір і згода. Камусьці гэта выгадна. Але гэта на сумленні тых палітыкаў, якія ставяць свае завышаныя амбіцыі вышэй чалавечых жыццяў. Упэўнены, менавіта таму нашы неаднаразовыя заклікі да сусветнай супольнасці спыніць эскалацыю напружанасці, вядомыя як Хельсінкі-2, пакуль, як гэта модна казаць, не ў трэндзе. Як я гаварыў нядаўна на міжнароднай канферэнцыі ў Мінску, «не тая краіна прапанавала»...

<u>У гэтых умовах мы пацвярджаем нязменную ролю Беларусі як донара стабільнасці. Нягледзячы ні на што, Еўропа застаецца нашым агульным домам, нікуды ад гэтага не дзенешся, мы — цэнтрам Еўропы, а Рэспубліка Беларусь — сталым, надзейным партнёрам у сферы рэгіянальнай бяспекі, гатовым актыўна ўдзельнічаць у міратворчых стратэгічных ініцыятывах.</u>

Мы як і раней гатовыя даць пляцоўку для перагавораў па любых пытаннях глабальнай і рэгіянальнай бяспекі, уключаючы тэматыку кантролю над узбраеннямі.

Сама ж Беларусь невыпадкова апынулася ў фокусе ўвагі асноўных міжнародных гульцоў. Па сутнасці, наша краіна сёння — гэта, калі хочаце, апошняя сапраўды суверэнная дзяржава ў Еўропе. Можа быць, і з гэтай прычыны церпім. У гэтым асноўнае пытанне, вакол гэтага шмат у чым ідзе барацьба — барацьба за ўцягванне Беларусі ў арбіту свайго ўплыву.

Не верце тым, хто кажа, што беларускае пытанне не з'яўляецца прадметам геапалітыкі. Паслухайце мяне, Беларусь сёння — гэта пануючая вышыня на полі бою ў цэнтры Еўропы. Памятаеце з фільмаў: ідзе бой, і ўсё б'юцца за гэтую пануючую вышыню, таму што пасля яе захопу ў цябе пад кантролем усё вакол? У такой сітуацыі сёння апынулася Беларусь, за гэтую вышыню ідзе надзвычай лютая бітва. Так было заўсёды ў нашай шматвяковай гісторыі.

Але нягледзячы на ўсе недружалюбныя крокі асобных замежных сіл, я перакананы, што шлях канфрантацыі ў знешняй палітыцы тупіковы. Мы не разглядаем ні адну з дзяржаў у якасці праціўніка, асуджаем любы ваенны канфлікт і паслядоўна выступаем за мірнае ўрэгуляванне спрэчак. Мы нязменна гатовыя выбудоўваць адносіны з усімі краінамі і саюзамі на аснове прынцыпаў раўнапраўя, узаемнай павагі і неўмяшання ў нашы ўнутраныя справы. Гэтак жа, як зацікаўлены мець збалансаваныя і разнастайныя сувязі са знешнім светам. Перш за ўсё эканамічныя. У гэтым уся сутнасць нашай канцэпцыі шматвектарнасці, якая выклікае столькі пытанняў. Нават у нашых братоў.

І не трэба нас крытыкаваць, што мы нібыта сядзім на двух крэслах. У канчатковым выніку мы ставім мэту забяспечыць дыверсіфікацыю міжнародных сувязяў, перш за ўсё эканамічных, — гэта аксіёма для любой дзяржавы, імкнёмся да раўнавагі ў рэгіянальнай бяспецы. Мы проста хочам захаваць асноўным эканамічным партнёрам і стратэгічным саюзнікам была і будзе наша Расія. Яна нам не чужая, таму што там жывуць не толькі нашы людзі і вельмі блізкія расіяне, і перш за ўсё рускі народ. Гэта наш народ, з якім мы жылі доўгія стагоддзі і разам часам спінай у спіну, часам плячом у плячо стаялі і змагаліся на адным баку барыкад.

Я не бачу важкіх прычын адмаўляцца ад падобнай шматвектарнасці. Гэта аб'ектыўная рэальнасць для любога разумнага палітыка, які калі-небудзь будзе кіраваць Беларуссю.

Пацвярджэнне асаблівага значэння беларуска-расійскіх адносін у гэтай сістэме шматвектарнасці выразна выявілася ў святле апошніх падзей. Садзейнічанне Расійскай Федэрацыі мела для нас вельмі важнае значэнне. Пры гэтым, падкрэслю, гэта пазіцыя Расіі — не дапамога дзеючай уладзе, а падтрымка брацкай дзяржавы і беларускага народа ва ўмовах цяперашніх і будучых глабальных трансфармацый.

Памятаеце, я калісьці казаў (вельмі лібералы ўзбудзіліся ў Расіі з нагоды маёй заявы), што прыйдзе час, і нам з Прэзідэнтам Расіі прыйдзецца стаяць спінай да спіны і адстрэльвацца. Што не так? А што яшчэ будзе! І пакуль мы стаім побач, плячом да пляча або спінай да спіны, ніхто нас на калені не паставіць і не нахіліць. У гэтым сутнасць.

Але тым не менш тыя ж у Расіі кажуць: Расія дапамагае Беларусі, Лукашэнку, цытата «дае крэдыты» і гэтак далей. Гэта так. Але дапамагаючы беларусам, яна дапамагае сама сабе. Бо Беларусь — гэта фінішная вытворчасць для многіх галін расійскай эканомікі. Кааперацыя дае работу мільёнам расіян і сродкі для жыцця іх сем'ям.

Ды і крэдыты ад Расіі — гэта зусім не дабрачыннасць. Вы ведаеце, колькі мы плацім у год за тыя крэдытныя рэсурсы, якія атрымліваем? Мільярд долараў. Ва ўсякім разе, год таму назад было так. Мільярд. Расія захоўвае грашовыя свае, скажам так, сродкі і ў іншых краінах, у тым ліку ў Злучаных Штатах Амерыкі. Але атрымлівае ад таго, што яна такім чынам крэдытуе ЗША, на парадак менш па працэнтах ад гэтых грошай, якія яна там захоўвае. Таму так, Расія нам дапамагае, вялікі ёй за гэта дзякуй, як нікому. Але гэта не дабрачыннасць. Часта працэнты, як я ўжо сказаў, на парадак вышэйшыя за агульнасусветныя, ды і вяртаем мы гэтыя крэдыты ў тэрмін, нам ніхто іх не спісвае. Мы з Расіяй, і яна не адзінокая. Выходжу з таго, што і Беларусь для Расіі будзе заставацца абсалютным прыярытэтам. Упэўнены, што і з яе боку будзе сумленнае разуменне нашых памкненняў да супрацоўніцтва з іншымі краінамі.

<u>Сёння, як я ўжо сказаў, расхістваюць і Расію. Спробы арганізаваць, інфармацыйна раскруціць там масавыя пратэсты, а потым, магчыма, сінхранізаваць іх з беларускімі мітынгамі пацвярджаюць нацэленасць знешніх сіл у тым ліку і на зрыў інтэграцыйных праектаў. У гэтых абставінах, толькі згуртаваўшыся, мы захаваем устойлівасць нашых краін, ад звязкі Беларусь — Расія, ці Расія — Беларусь, шмат у чым залежыць мірная і стабільная будучыня рэгіёна, будзе тут мір ці вайна. Ад нашага адзінства з Расіяй усё будзе залежаць.</u>

У апошні час некаторыя так званыя аналітыкі ад палітыкі спрабуюць укараняць у масавую свядомасць тэзіс аб тым, што паглыбленне эканамічнага ўзаемадзеяння з Расійскай Федэрацыяй пагражае нам ледзь не стратай суверэнітэту. А слова «інтэграцыя» ў іх азначае ледзь не паглынанне Беларусі. Давайце раз і назаўсёды расставім кропкі над «і». Беларусь выступала і будзе выступаць за эканамічную інтэграцыю на постсавецкай прасторы як у двухбаковым, так і ў шматбаковым фармаце. І не толькі эканамічную.

Мы адрозніваемся ў саюзе Беларусі з Расіяй ад інтэграцыйных праектаў ЕАЭС і СНД тым, што ў нас вельмі глыбокая інтэграцыя не толькі ў эканоміцы, але і ў палітыцы. Нашы знешнепалітычныя ведамствы дзейнічаюць часам заадно як адзінае цэлае, і перш за ўсё ў абароне. Такога няма ў ЕАЭС. ЕАЭС — гэта эканамічны саюз. СНД сёння перш за ўсё пляцоўка для абмеркавання тых ці іншых пытанняў адносна зоны свабоднага гандлю. Усё! Найбольш прасунутая інтэграцыя — у саюзе Беларусі і Расіі. І што, гэта я выдумаў? Не. Успомніце рэферэндум у 90-х гадах — як вы адказалі на пытанне, ці быць інтэграцыі з Расіяй. І ведаеце, забягаючы наперад (я не ведаю, публікавалі ці не апошнія маштабныя сацыялагічныя даследаванні), мы спыталіся ў людзей, як яны ставяцца да інтэграцыі з Расіяй, Еўрасаюзам і іншае. Баюся памыліцца на паўпрацэнта, на працэнт — 71,5 працэнта выказаліся перш за ўсё за інтэграцыю з Расіяй. І каля 30 працэнтаў са 100 — з Еўрапейскім саюзам. Мы апублікуем гэтыя цікавыя даныя, і вы на іх паглядзіце.

Мы бачылі, як па жывым разрываліся кааперацыйныя сувязі і вытворчыя сувязі паміж рэспублікамі некалі адзінай дзяржавы, якая была раптоўна знішчана. Пачаўся парад суверэнітэтаў. І, разбіраючы тлусцейшыя пасады, ніхто не турбаваўся пра простых людзей. Трэба было хутка разабрацца — пасады, партфелі атрымаць і падзяліць краіну, падзяліць дзяржаўную ўласнасць. Мы, як я ўжо казаў, не былі ініцыятарамі гэтага. Больш за тое, імкнуліся максімальна стрымаць цэнтрабежныя працэсы. У першую чаргу ў інтарэсах нашых народаў і эканомік.

У інтэграцыі (нагадаю, за ўсё адназначна выказаўся беларускі народ) мы прайшлі шмат этапаў — ад СНД да Еўразійскага эканамічнага саюза. Але глыбей за ўсё мы прасунуліся ў фармаце Саюзнай дзяржавы. Сфарміравалі роўныя ўмовы для грамадзян абедзвюх краін: свабоднае перамяшчэнне, адсутнасць двайнога падаткаабкладання, інтэграванае пенсійнае забеспячэнне, адукацыю, медыцынскае абслугоўванне. Цяпер засталося вывесці на гэты ўзровень суб'екты эканомікі. Жыццёвая неабходнасць заключаецца ў роўных умовах гаспадарання, энергаспажывання, доступу да рынкаў, удзелу ў дзяржзакупках, выкарыстання фінансавых інструментаў.

Як бачыце, я не прашу ні бясплатнага прыроднага газу, нафты або бясплатных фінансавых рэсурсаў. Нам трэба адно — роўныя ўмовы суб'ектаў гаспадарання. І мы вырашым любыя праблемы. І тады не 70 працэнтаў, а ўвесь беларускі народ з глыбокай павагай будзе глядзець на Расію і лічыць, што мы тут, у Беларусі, з'яўляючыся апорай нашай адзінай айчыны, будзем паміраць за сваю краіну, і за Расію ў тым ліку. Разумеем, што менавіта ў гэтым павінна, на нашу думку, заключацца накіраванасць эканамічных інтэграцыйных працэсаў у рамках Саюзнай дзяржавы.

Ва ўмовах рэгіянальнай ізаляцыі наша выратаванне — выхад на новы этап вытворчага ўзаемадзеяння. Сёння кааперацыяй

Фота БелТА.

Незалежнасць

Фота БелТА.

звязана больш за восем тысяч прадпрыемстваў Беларусі і Расіі. У ёй задзейнічана каля паловы беларускіх прамысловых арганізацый. Дзякуючы цесным эканамічным сувязям наша невялікая краіна стала для Расіі, удумайцеся, чацвёртым па велічыні знешнегандлёвым партнёрам. Беларуская прадукцыя знойдзецца ва ўсіх кутках Расіі.

Перакананы, супрацоўніцтва рэгіёнаў — трывалы фундамент двухбаковых адносін. Урадам Беларусі заключаны пагадненні больш чым з 70 суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. Ёсць паспяховыя праекты ў сферах прамысловасці, вёскі, энергетыкі. Мы бачым развіццё кааперацыйных сувязяў праз больш шырокі ўдзел айчынных вытворцаў у рэалізацыі нацыянальных праектаў Расіі.

Сёння адкрыта заяўляем пра гатоўнасць да далейшай прадметнай работы па паляпшэнні міжгаліновага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы пры выкананні ўзаемных інтарэсаў і на аснове раўнапраўя двух удзельнікаў саюза.

Падкрэслю асобна: гэты працэс прадугледжвае поўнае захаванне суверэнітэту абедзвюх краін без фарміравання якіх-небудзь новых наднацыянальных органаў. Уся сістэма органаў Саюзнай дзяржавы створана, і яна яшчэ не адпрацавала сваё. Яна жыццяздольная.

Яна не можа быць выкінутая на сметнік. Гэта Парламенцкі сход Саюзнай дзяржавы, Савет міністраў Саюзнай дзяржавы і, нарэшце, вышэйшы канстытуцыйны орган — Вышэйшы дзяржаўны Савет, старшынёй якога з'яўляецца ваш пакорны слуга.

Вось і ўвесь адказ.

Давайце пройдзем гэты шлях і паглядзім, што скажуць народы. Можа, народы сапраўды возьмуць за каўнер Лукашэнку, Пуціна (можа, іншых прэзідэнтаў) і скажуць: «Мала гэтай інтэграцыі! Пойдзем далей!» Але нельга пераскокваць праз этапы. Нельга перанапружваць абстаноўку ні ў Расіі, ні тым больш у Беларусі. Мы ў гэтым фармаце можам зрабіць вялізныя крокі ў інтэграцыі з нашай брацкай Расіяй.

У інтарэсах Беларусі стварэнне таксама паўнавартаснага эканамічнага саюза ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. І трэба прызнаць: тут мы пакуль недалёка сышлі ад агульнасусветных тэндэнцый, па сутнасці, кожны заняты сабой. Вядзем барацьбу за пошліны, за стандарты, акцызы.

Трэба пераадолець інэрцыйны характар развіцця аб'яднання, павысіць эфектыўнасць еўразійскага будаўніцтва. Прынцыпова важна дасягнуць значнага сінергетычнага эфекту ад фарміравання агульнага рынку і аб'яднання эканамічных патэнцыялаў дзяржаў-удзельніц. Тады ЕАЭС стане нашмат больш прыцягальным і для іншых партнёраў, і не толькі на постсавецкай прасторы. На такі вынік было нацэлена беларускае старшынства ў ЕАЭС у 2020 годзе. Гэтую лінію мы настойліва працягнем і ў далейшым.

Беларусь выступае за пошук новых рэгіянальных фарматаў, у тым ліку за прасоўванне ідэй «інтэграцыі інтэграцый» і вялікага еўразійскага партнёрства.

Дадзеныя ініцыятывы павінны быць дапоўнены супрацоўніцтвам у рамках спалучэння ЕАЭС і кітайскага праекта «Адзін пояс, адзін шлях». Такую ж па сіле актуальнасць мае і паглыбленне ўзаемадзеяння з ключавымі эканамічнымі аб'яднаннямі і нацыянальнымі эканомікамі Еўразіі.

Садружнасць Незалежных Дзяржаў, нягледзячы на аб'ектыўныя складанасці, цалкам захоўвае сваю актуальнасць як рэгіянальная арганізацыя. Вядома, страты вялікія з выхадам Украіны. Але спадзяёмся, што Украіна да нас вернецца.

Ключавы прыярытэт Беларусі ў Садружнасці застаецца нязменным — развіваць аб'яднанне як механізм максімальна выгаднага эканамічнага ўзаемадзеяння. На дасягненне гэтай мэты накіравана старшынства Беларусі ў СНД — мы з'яўляемся старшынёй у 2021 годзе.

Асаблівыя адносіны звязваюць Беларусь і Кітай. Наша знешнепалітычная стратэгія адносіць гэтую вялікую дзяржаву да краін далёкай дугі. Але дэ-факта адказнае партнёрства, нягледзячы на адлегласць, зрабіла нас найбліжэйшымі суседзямі.

Наша стратэгічнае супрацоўніцтва з Кітаем стала адной з прычын атакі Захаду на Беларусь у канцы мінулага года. Але нас гэта не павінна спыніць.

Мне проста ў вочы было сказана: вы сыходзіце ад Кітая, Кітая не павінна быць у цэнтры Еўропы. На што я адказаў: калі Еўрасаюз і Злучаныя Штаты Амерыкі атакавалі нас і эканоміку Беларусі раней — гадоў пяць-шэсць таму — маштабнымі санкцыямі, Кітай безумоўна нас падтрымаў. У той час ён адчыніў свае дзверы для нас, і мы ў іх увайшлі. І што, мы цяпер павінны зачыніць Кітаю адзіны шлях у Еўропу і гэтую фортку праз Беларусь? Мы не можам на гэта пайсці. Таму што мы людзі ўдзячныя, мы памятаем, што было тады. Такі быў адказ кіраўніцтву Злучаных Штатаў Амерыкі і іншым зацікаўленым у гэтым пытанні.

Гэты прыклад толькі пацвярджае правільнасць нашага курсу на паглыбленне стратэгічных адносін з Кітайскай Народнай Рэспублікай, выхад на новы ўзровень «жалезнага братэрства» і «ўсепагоднага партнёрства», як яны называюць наша супрацоўніцтва.

Канцэпцыя «супольнасці адзінага лёсу для чалавецтва» Старшыні і майго асабістага сябра Сі Цзіньпіна, нашы арыенціры развіцця шмат у чым супадаюць, што з'яўляецца асновай для далейшага ўмацавання сувязяў Беларусі і вялікага Кітая.

Цяпер КНР аказвае рэальнае садзейнічанне нашай краіне ў будаўніцтве жылля за іх кошт, знакавых аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. На бягучым этапе важна пашырыць дзелавую і інвестыцыйную прысутнасць вядучых кампаній і банкаў у Беларусі, перш за ўсё ў Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень», што мы і робім. У сваю чаргу, нам неабходна больш актыўна асвойваць невычэрпны кітайскі рынак, Кітай адкрыўся для нас у гэтым плане. Сёння рэалізуецца экспартная заяўка па сельгаспрадукцыі, харчаванні, прамысловых таварах. Сотні беларускіх сельгасарганізацый ужо акрэдытаваныя для паставак у Кітай. У сярэднім гэта дадасць да нашага экспарту ў КНР каля 700 мільёнаў долараў і да 1 мільярда.

Усё большую значнасць набывае пашырэнне гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння Беларусі з іншымі традыцыйнымі і новымі перспектыўнымі партнёрамі ў Азіі, Афрыцы, на Блізкім Усходзе, у Лацінскай Амерыцы.

Асобна хацеў бы зрабіць акцэнт на нашым заходнім вектары. Беларусь зноў стала аб'ектам палітычнага і эканамічнага санкцыйнага ціску. І зноў пад лозунгам «дэмакратызацыі» гучаць заклікі да эканамічнага ўдушэння.

Я скажу адно: пасля штурму Капітолія, жорсткіх разгонаў дэманстрацый у Польшчы, Германіі, Францыі, Бельгіі, Нідэрландах, зняволення людзей у «вязніцах», каранціну яны не маюць ні палітычнага, ні маральнага права ўказваць ні нам, ні іншым, як жыць і кіраваць дзяржавай. Самім трэба разабрацца ў сабе.

(Апладысменты.)

І тое, што асобныя заходнія палітыканы праецыруюць свае вузкакарыслівыя пазіцыі на міждзяржаўныя адносіны, тым самым паставіўшы пад удар пытанні бяспекі і развіцця ўсёй Усходняй Еўропы, — гэта як мінімум безадказна.

Мякка кажучы, дыпламатычна кажучы, мы перакананыя, што эскалацыя не выгадная нікому — ні Беларусі, ні ЕС, ні ЗША. Тым больш гэта не наш выбар. У нашых агульных інтарэсах вярнуцца да нармальнага палітычнага ўзаемадзеяння. Паўнавартаснага эканамічнага супрацоўніцтва. Заявы Еўрасаюза, ЗША, іншых заходніх краін аб падтрымцы суверэнітэту Беларусі, прычым яны гавораць пастаянна, мы, безумоўна, адзначаем. Мяркуем, эфект гэты ад гэтых заяў выявіцца ў доўгатэрміновым вымярэнні, а не ў рамках бягучых абвастрэнняў і непаразумення. У кантэксце апошніх падзей хацеў бы таксама звярнуцца да ўсіх аб'яднанняў беларусаў «замежжа». Кожнага, чые карані на беларускай зямлі. Калі вы яшчэ беларусы, калі вы памятаеце сваю маленькую радзіму, вы павінны разумець, што нават за межамі радзімы не перастаеце быць часткай беларускай сям'і. Кожнае ваша слова, справа і нават пазіцыя непасрэдна ці ўскосна ўплывае на жыццё краіны. І гэтай краіне патрэбная падтрымка, у тым ліку пажадана і ваша, а не разбурэнне. Так, сёння мы глядзім на ўсе праблемы праз прызму бяспекі нават на тыя сферы, якія былі заўсёды выключна мірныя, — харчовую, дэмаграфічную, навукова-тэхнічную, экалагічную. На гэтыя, здавалася б, мірныя кірункі нашага развіцця, паўтараю, мы глядзім праз прызму бяспекі. Гэтым і абумоўлена вядучая роля дзяржавы, здольнай забяспечыць абароненасць усіх аспектаў жыцця чалавека і грамадства. У гэтым і сутнасць сучаснага погляду на нацыянальную бяспеку. Незалежна ад якіх-небудзь фактараў развіцця ўзброеным сілам, якія забяспечваюць матэрыяльную цэласнасць краіны, мы заўсёды будзем аддаваць асаблівую ўвагу. У нас адна з найлепшых армій у рэгіёне. Гэта прызнаюць нашы сапернікі. Але гэты статус трэба падтрымліваць баявой падрыхтоўкай, своечасовым абнаўленнем узбраення, ваеннай тэхнікі, мадэрнізацыяй ваеннай інфраструктуры. Яшчэ ў канцы 2019 года мы прынялі план развіцця Узброеных Сіл да 2030 года, вызначылі неабходныя бюджэтныя асігнаванні, і, чаго б нам ні каштавала, запланаванае мы павінны ажыццявіць. Безумоўна, працягнецца ваеннае, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй, іншымі краінамі АДКБ. Умацоўваць абароназдольнасць краіны нас змушае абвастрэнне ваенна-палітычнага становішча ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, канкрэтна каля нашых граніц. Я не адкрыю вялікай таямніцы, у Польшчы, у краінах Балтыі на пастаяннай аснове знаходзяцца шматнацыянальныя сілы НАТА. У Польшчы амерыканцы будуюць свае ваенныя базы, завозяць туды самае сучаснае ўдарнае ўзбраенне, размяшчаюць свае войскі і, што нас больш за ўсё насцярожвае, у мінулым годзе сцягнулі да нашых граніц перадавое камандаванне пятага корпуса сухапутных войскаў. Кожны год праводзяцца дзясяткі ваенных вучэнняў з адпрацоўкай перакідвання вялікіх кантынгентаў войскаў з амерыканскага кантынента ў Еўропу. Два тыдні таму ў польскай арміі нават праводзілі зімовыя штабныя вучэнні. Шуму пасля гэтага ў Польшчы было процьма. І не толькі ў Польшчы. Улічваючы ўсе фактары, яны мадэлявалі на камп'ютарах будучую вайну НАТА з рэгіянальнай групоўкай войскаў Расіі і Беларусі. Памятаеце, напярэдадні вайны ў 1940-м, па-мойму, або ў 41-м, у 1940 годзе падобныя вучэнні на картах былі праведзены, гэта вельмі важная рэч, у Савецкім Саюзе. «Немцамі» камандаваў Жукаў, а нашымі войскамі, савецкімі, камандаваў хто? Паўлаў. І тады савецкія войскі прайгралі. Жукаў, быўшы «немцам» у двукоссі, перамог. І нашы з гэтага не паспелі зрабіць адпаведныя высновы. А хтосьці, можа быць, і не захацеў. І чым гэта абярнулася, мы ведаем. Дык вось, выкарыстоўваючы гэтыя вучэнні і той гвалт, які падняўся перш за ўсё ў Польшчы, яны матывуюць дадатковыя асігнаванні на развіццё сваёй арміі ў Польшчы і войскаў НАТА.

Яны, як кажуць, прайгралі гэтую вайну. А мы сёлета ўвосень правядзём сумеснае з Расіяй вучэнне «Захад-21». У асноўным у нас, у Беларусі, на беларускіх палігонах.

Дарэчы, у тых, хто сёння лічыць, што служыць па прызыве не трэба, армія павінна быць кантрактнай, я хачу спытаць: а калі, не дай бог, мы падвергнемся знешняй агрэсіі, вы пойдзеце абараняць Радзіму, вы, якія лічыце, што не трэба служыць у арміі? Нават не сумнявайцеся! Вы не проста пойдзеце, вы пабяжыце туды! А як, калі вы не трымалі ў руках зброю і не ведаеце наогул элементарнай тактыкі бою? І ўвогуле, што вы за мужыкі? За каго дзяўчаткі нашы замуж пойдуць?

Вось таму ў нас армія і мае змешаны тып камплектавання — і па кантракце, і па прызыве. Каб рэзерв быў падрыхтаваны, і каб мужчыны ўмелі абараняць Радзіму, сваю сям'ю, каханую і нашу зямлю!

Таму развіццю тэрытарыяльнай абароны як формы ўсенароднай абароны Айчыны, а таксама павышэнню эфектыўнасці стратэгічнага стрымлівання будзе ўдзелена самая сур'ёзная ўвага.

Асаблівая сфера — ваенна-прамысловы комплекс. Беларусь ніколі не бразгала зброяй, але мы паслядоўна развіваем кампетэнцыі, у якіх можам мець поспех, забяспечваючы ўласную бяспеку і экспарт прадукцыі ВПК. Больш за тое, па шэрагу пазіцый мы здольныя паспяхова канкурыраваць на сусветных рынках нават з прызнанымі лідарамі абароннай прамысловасці. А гэта мільярды долараў

Адзінства. Развіццё.

для развіцця аднаго з самых высокатэхналагічных нацыянальных вытворчых кластараў.

Мы вырабляем спецыяльную оптыку для космасу. З нуля развіваем ракетабудаўнічую школу. Удумайцеся! Калі мы гэта пачыналі, зусім нядаўна, мы не мелі спецыялістаў, але, напружваючыся, аб'яднаўшыся, сабраўшы ўсё па крупінках і з дапамогай нашых сяброў, мы стварылі сваю беларускую ракету, якая так бударажыць розумы і сэрцы многіх замежных палітыкаў і вайскоўцаў. І гэтым шляхам мы будзем ісці.

Валодаем уласным праграмным забеспячэннем кіравання ваеннымі сістэмамі. Гэта сведчыць аб тым, што наша тэхніка абаронена ад кіберуздзеяння!

Унутры краіны выбудавана надзейная сістэма грамадскай бяспекі. І як бы нас сёння ні падштурхоўвалі да так званых рэформ органаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, памятайце прапановы нашых збеглых і пратэстуноў (скараціць МУС, ліквідаваць унутраныя войскі, скасаваць КДБ, замест МНС зрабіць добраахвотныя паўпрафесійныя пажарныя дружыны), нягледзячы на гэтыя прапановы мы будзем і надалей умацоўваць наш сілавы блок суразмерна з новымі выклікамі і пагрозамі. Пры гэтым я вам павінен сказаць, мы, вядома, не можам інвеставаць у ВПК, і нават не ў ВПК, а ў абарону, бяспеку такія сродкі, як палякі, немцы і іншыя. Там друкуюць грошы за Атлантыкай і прывозяць, і раздаюць ім гэтыя грошы. За кошт гэтага квітнее «абаронка» ў іх, а цяжарам гэта кладзецца на нас, таму што доларам карыстаюцца ў свеце ўсе. Мы не можам укладаць такія грошы і не будзем, таму што мы не збіраемся ні на кога нападаць. Таму што ўзбраенне для атакі, для нападзення нашмат даражэйшае, чым для абароны.

Улічваючы вопыт, хоць мы і значна прасунуліся ў гэтых адносінах, жывём у іншым свеце, але, улічваючы вопыт і той вайны, і ўлічваючы, што наша ваенная дактрына носіць выключна абарончы характар, мы значна меншымі рэсурсамі зможам сябе абараніць.

Пацвярджаю гэта яшчэ і з дапамогай Расіі. Таму што страціць Беларусь для Расіі смяротна небяспечна. І як заўсёды, скажу шчыра, яна будзе вымушана стаяць да смерці з намі ў Брэсцкай крэпасці, пад Мінскам, пад Магілёвам, калі трэба, і пад Смаленскам.

(Апладысменты).

Зыходзячы з тых падзей, якія адбываюцца ў нас тут, у рэгіёне, у свеце, мабыць, надышоў час абнавіць Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі. Тым больш што нашы суседзі з НАТА ўжо мадэрнізавалі свае стратэгічныя дакументы з уліком пагроз і лічбавых тэхналогій.

Да таго ж у непасрэднай блізкасці ад нашых граніц створана неабходная інфраструктура — кібервойскі і сетка натаўскіх кібернцэнтраў. Няма сумненняў, што з усіх рызык нацыянальнай бяспекі бяспека інфармацыйная становіцца галоўным болевым пунктам.

Не прымяншаючы пераваг, магчымасцяў і перспектыў, якія адкрыў чалавеку інфармацыйны свет, мы павінны звярнуць увагу і на яго адваротны бок. На штучную рэальнасць, якая дала зялёнае святло маніпуляцыям, падману, злачынствам, патурае нізкім інстынктам чалавека.

Нельга пакінуць па-за ўвагай тое, што пастаянная прысутнасць чалавека ў сацыяльных сетках, на форумах, медыяканалах фарміруе інтэрнэт-залежнасць.

Людзі проста выпадаюць з рэальнага жыцця і страчваюць элементарныя камунікатыўныя навыкі. Што яшчэ горш, яны страчваюць здольнасць да аналітычнага мыслення, паколькі змест і сэнс таго, што адбываецца вакол, фарміруюць за іх сацыяльныя сеткі, месенджары і пошукавыя алгарытмы. А хто за імі стаіць, вы ведаеце.

Адбываецца гэта не бескантрольна. Свядомасць людзей — у руках найбуйнейшых гігантаў інтэрнэт-індустрыі, паслугамі якіх не грэбуюць карыстацца спецслужбы асобных дзяржаў. Нам гэта вядома па мінулым годзе.

Спецыялісты ўсё часцей гавораць аб лічбавай дыктатуры праз кіраванне вялікімі данымі і кантроль над імі, праз блакаванне нежаданых. Дайшло да таго, што адміністратары сацыяльных сетак блакавалі акаўнты прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі. Вось і ўся дэмакратыя. Але вы ж ведаеце, як модна цяпер казаць у заходніх

Фота БелТА.

дэмакратаў: «Гэта не парушэнне дэмакратыі. Гэта іншае».

Мы жывём у эпоху так званай постпраўды, дзе прыстойныя людзі ачарняюцца, а нягоднікі паказваюцца героямі з бездакорнай біяграфіяй.

Безумоўны лідар па псеўдафактах, вядома ж, каранавірус. Аб дзясятках тысяч загінулых у Беларусі ад COVID-19 ананімныя інтэрнэт-каналы пісалі ўжо ў перыяд першай хвалі.

Чаго былі вартыя такія заявы, як «бальніцы перапоўненыя», «персаналу не хапае сродкаў індывідуальнай аховы, а пацыентам — апаратаў ШВЛ і тэст-сістэм». І гэта ў той час, калі дзяржава мабілізавала ўсе сілы на барацьбу з каранавірусам.

Пасля той хвалі, нават за гэты кароткі прамежак пандэмійны, настала прасвятленне. І хто меў рацыю? Адзіная, невялікая па мерках сусветных, беларуская дзяржава, якая ў адзіночку выбудавала сваю сістэму барацьбы з пандэміяй, апынулася ў цэнтры ўвагі. Тады аб нас выціралі ногі, тады нас штурхалі нагамі. Гэта і цяпер адбываецца. Але ўсе пайшлі гэтым шляхам. І нехта паспрабаваў зачыніць свой народ, як я казаў, у «вязніцах» пандэміі. Паглядзіце, што сёння адбываецца.

Нядаўна я атрымаў, міністр замежных спраў мне перадаў ліст ад некаторых заходніх дзеячаў, СААЗ. Мяне што здзівіла — «Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Яго Правасхадзіцельству А. Р. Лукашэнку». Слухайце, пішуць адно, а на Захадзе вітаюць і кажуць пра іншае, вітаюць, як іншых прэзідэнтаў. Я так чытаю і думаю: «А дзе ж праўда?» Хоць бы напісалі экспрэзідэнту, былому, ці ўвогуле беларускаму народу адрасавалі. Але тым не менш я ўдзячны, што яны разумеюць, хто ў доме гаспадар. *(Апладысменты.)*

Гэта з Еўрасаюза прыйшлі прапановы нам, яны вельмі выгадныя, абмеркаваць пытанні барацьбы з пандэміяй. І да мяне яшчэ звяртаюцца як да старшыні Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Мы адкажам, калі не адказалі ўжо, што мы гатовыя да гэтага, мы гатовыя абмяркоўваць. І калі вы гатовыя нам дапамагчы ў гэтым, нам, праўда, не трэба дапамагаць лячыць людзей (мы выдаткавалі велізарныя грошы на гэта — 1,5 мільярда долараў з усіх крыніц), нам трэба дапамагчы проста далей развіваць ахову здароўя, таму што мы велізарныя грошы ўзялі з будучыні, узялі з іншых сфер.

Калі ласка, дапамажыце нам у гэтым плане. Як у нас кажуць: не вучыце нас жыць, а дапамажыце матэрыяльна.

(Смех, апладысменты.)

Але тым не менш нам няма чаго задумвацца, каму былі выгадныя гэтыя фэйкавыя навіны аб спыненні нашых прадпрыемстваў. У першую чаргу тым, хто спрабаваў заняць нашы рынкавыя нішы. Ім вельмі хацелася спыніць нашу экспартную моц. Асабліва на тэрыторыі Расіі і іншых дзяржаў, каб заняць, каб замест БелАЗа, напрыклад, у Расіі куплялі Caterpillar, каб замест калійных соляў на рынках, а мы другія ў свеце па экспарце, куплялі канадскія, расійскія, яўрэйскія, нямецкія, трохі яны здабываюць гэтых соляў калійных. Гэта ўсё зразумела, для чаго гэта.

Вядома, гэтыя прыклады — кропля ў моры інфармацыйных патокаў, якія штодня б'юць у адну цэль — разбурыць дзяржаву рукамі сваіх жа грамадзян. Безумоўна, настаў час мадэрнізаваць інфармацыйную палітыку.

Першае. Забяспечыць шырыню прадстаўленасці дзяржаўнай пазіцыі ў інтэрнэце. Чым мы і пачалі займацца. Мы тут сур'ёзна прайгралі. Занадта спадзяваліся на нашу моладзь і нашых людзей. Што нас гэтая бяда не закране, мы ж сумленныя і справядлівыя.

Неабходна ў большым маштабе далучаць у агульныя медыйныя праекты блогераў, лідараў думак, прадстаўнікоў грамадскіх інстытутаў, дзеячаў культуры і мастацтва.

Другое. Максімальна развіваць электронныя каналы зваротнай сувязі, дапамагаючы насельніцтву ў вырашэнні праблем, аналізуючы ініцыятывы і прапановы, якія паступаюць ад грамадзян і грамадскіх інстытутаў, уцягваючы жыхароў краіны ў працэсы прыняцця рашэнняў.

Трэцяе. З улікам тэндэнцыі дзесяціразовага за апошнія пяць гадоў росту злачынстваў у інфармацыйнай сферы трэба больш актыўна выяўляць і спыняць экстрэмісцкую, махлярскую і іншую незаконную дзейнасць. Ну і людзям трэба галаву на плячах трымаць. Адначасова з гэтым нам неабходна павышаць інфармацыйную адукаванасць насельніцтва.

Трэба ісці да людзей і размаўляць іх мовай. Прывяду адзін прыклад. Як вы думаеце, якая самая пратэсная ВНУ была ў Беларусі? Так, вядома, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Флагман. Наталля Іванаўна Качанава, упаўнаважаная па Мінску, выконвае мае даручэнні разам з мэрам Мінска, сустракаюцца са студэнтамі. Яны папрасілі мяне прыехаць на сустрэчу.

Была невялікая фортачка, як я ім сказаў, у графіку. Я прыехаў. І не думайце, як тут некаторыя пратэстуны пішуць, што там падабралі аўдыторыю. Маё жалезнае даручэнне было — ні ў якім разе. Там павінны прысутнічаць усе — ад заўзятых апазіцыянераў, іх, вядома, я спадзяваўся і спадзяюся, менш, чым пазітыўна настроеных. Няхай у гэтай прапорцыі прысутнічаюць. Прайшла гэтая сустрэча, яна транслявалася на іншыя ВНУ. І я папрасіў пазаўчора тую ж Наталлю Іванаўну Качанаву і рэктара, калі ласка, правядзіце сацыялагічныя даследаванні ў гэтай ВНУ. Страшна пратэснай. Учора да ночы мне далажылі вынікі. Яны мяне здзівілі. Так, яны не цудоўныя, як па ўсёй краіне. Але каля 55 працэнтаў падтрымліваюць дзеючага Прэзідэнта і дзейсную уладу. Пасля гэтай размовы.

(Апладысменты.)

Пра што гэта сведчыць? Гэты зварот перш за ўсё да вас. Амаль да трох тысячаў тых, што сядзяць тут. Ачомайцеся. Зразумейце, які момант перажываем, і ідзіце да людзей. Растлумачце ім, пасля нашага Сходу ў тым ліку, калі вам падходзіць вось тое, што я скажу, выступоўцы, — гэта будзе ўсё апублікавана. Гэта будзе ў вас на руках. Растлумачце маладым людзям, што адбываецца. Не трэба іх залізваць. Не трэба крычаць гвалтам, што вы — будучыня нашай краіны, без вас нічога. Не трэба. Гэта не будзе мець уздзеяння. Яны гэта і так ведаюць. Вядома, не мы будучыня, а моладзь. Хопіць гэтых штампаў. З імі трэба пагаварыць шчыра.

Вы па тэлевізары ўбачылі, цікава тэлевізійшчыкі паказалі маю ключавую фразу, калі ў нас ішла спрэчка і дыялог з іншадумцамі, нармальнымі людзьмі. Я ім сказаў наступнае, хачу паўтарыць, каб гэта яшчэ раз усё пачулі: «Так, можна мець свой пункт гледжання, трэба мець свой пункт гледжання, трэба ўмець яго адстойваць, але і згаджацца з іншым пунктам гледжання. Але я ім прама ў вочы кінуў: як вы, будучыня нашай краіны, маглі дастукацца да таго, калі нам пагражалі звонку, чаму гэта я як галоўнакамандуючы быў вымушаны разгарнуць палову беларускай арміі і нават прызваць людзей з запасу для таго, каб абараніць сваю краіну, прадэманстраваць — не суньцеся, атрымаеце, як вы маглі выскачыць на вуліцу і пратэставаць?» Такіх шмат было момантаў, была адкрытая і сумленная размова, і вынік яе бачны, такога ж ніколі не было, таму трэба размаўляць з людзьмі, яны ж сядзяць у гэтых айпадах, айфонах, месенджарах. Хто хайпуе, хто посціцца і гэтак далей. А што там? Там жа ўжо артыкуламі ніхто не думае.

(Апладысменты.)

У гэтых айпадах, па апладысментах я бачу, што і вы там седзіце.

(Смех у зале.)

Гэта нармальна, трэба ведаць, што там адбываецца. На жаль, гэта мой вялікі недахоп, мне толькі распавядаюць — то дома, не буду называць хто, то на рабоце. Вось ёсць у мяне і апазіцыя, аб'ектыўная і суб'ектыўная. Я ўсё гэта перажываю ў жыцці. Трэба ведаць, што там адбываецца, трэба ўсё гэта бачыць. Але вы зразумейце — там няма, а калі ёсць аналітыка, наша моладзь у асноўным не цікавіцца, яна жыве ў інтэрнэце загалоўкамі, загаловак прачытала, а пад тэкстам — там, можа, зусім іншае, але гэта па дыяганалі, злева направа, а то і наогул не чытаюць, гартаюць, гартаюць, гартаюць. І фарміруюцца адпаведныя вобразы разумення і ацэнкі. У гэтым свеце мы і жывём, і нікуды ад гэтага не дзенешся. У Капітоліі пачалася стральба ... Малайцы кітайцы, яны выкінулі каля дзесяці мільярдаў долараў і ізаляваліся, стварыўшы свой інтэрнэт. Але і гэта не справа. Трэба, каб тыя, хто гэта стварыў, перш за ўсё ЗША, Еўрасаюз, ды і Расія падключылася да гэтага, і дамовіліся, што гэта ўсё, калі будзе і далей так працягвацца, прывядзе не толькі да хаосу на планеце, планету перавернем і адной нагой уступім у хуткім часе ў Трэцюю сусветную вайну. Гэта ўжо вайна, але яна разгорнута ў інфармацыйнай сферы. Для нас гэта вельмі зразумела, зыходзячы

Незалежнасць

з мінулага года. Таму трэба ісці да людзей, трэба ім расказваць ужывую, адказваць на іх пытанні. Прабачце мне за грубасць, калі і ў морду атрымаем ад іх, трэба цярпець, гэта нашы недапрацоўкі. Калі не будзем працаваць з моладдзю, загінем.

(Апладысменты.)

Таму, паважаныя сябры, гэтая пяцігодка, вы гэта ўбачылі, па праграме стане перыядам інфармацыйнага выбару. Разумею, што гэта прагучыць дзіка і непрыемна, але найбліжэйшыя гады вызначаць, ці будзем мы канчаткова рабамі чужых для нас ідэй або захаваем інфармацыйны суверэнітэт.

У сувязі з гэтым я хачу звярнуцца да нашых вядучых грамадскіх арганізацый, асабліва звязаных з журналістыкай і гуманітарнай сферай.

Вы павінны больш цесна супрацоўнічаць з дзяржаўнымі органамі ў сферы забеспячэння інтарэсаў нашага грамадства ў інтэрнэце.

У інфармацыйным полі мы сёння як на вайне. На чалавека накіраваны тэхналогіі агрэсіўнага і прадуманага ўздзеяння. Уздзеянне на падсвядомасць. Многія сёння сапраўды вельмі ўразлівыя ў сілу сваёй наіўнасці і адкрытасці. Але будзем змагацца за сваіх людзей, абавязкова будзем.

Мы зрабілі інтарэсы беларусаў прыярытэтам нашай эканамічнай палітыкі. Сацыяльная дзяржава — гэта наш нязменны нацыянальны брэнд.

Прынцып раўнапраўнага размеркавання, раўнамернага размеркавання выгод да нядаўняга часу цалкам падмацоўваўся запытам грамадства на апеку дзяржавы. Гэтая логіка закладзена ў аснову такіх найважнейшых інстытутаў, як салідарная пенсійная сістэма, бясплатныя для ўсіх ахова здароўя і адукацыя, падтрымка шматдзетных сем'яў і іншых катэгорый насельніцтва.

Заўважылі, я ў пачатку гаварыў пра іх праграму. У ходзе дыскусій на пляцоўках дыялогу прагучала нямала ідэй і прапаноў у гэтай частцы. У тым ліку і вельмі радыкальных — увядзенне прагрэсіўнай стаўкі падаткаабкладання, страхавой медыцыны, накапляльнай пенсійнай сістэмы. Разам з тым далёка не ўсе групы і слаі беларускага грамадства могуць адмовіцца ад класічных падыходаў у сацыяльнай палітыцы. Дзяржава гатова іх захаваць і дапоўніць новымі элементамі. Але пытанне вельмі складанае і патрабуе абмеркавання нашымі дэлегатамі на гэтым Сходзе.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што задача дзяржавы — стварыць такія ўмовы ўзаемадзеяння паміж сацыяльнымі групамі, каб яны ўсімі і кожным выхоўваліся і ўспрымаліся як справядлівыя.

Менавіта справядлівасць з'яўляецца асновай грамадскай дамовы, ці так званага сацыяльнага кантракта, які павінен знайсці адлюстраванне ў Канстытуцыі.

За мінулае пяцігоддзе даходы насельніцтва ў рэальным выражэнні павялічыліся на 15 працэнтаў, сярэдняя зарплата перавысіла 1200 рублёў.

Можа, гэта і няшмат, і канешне, няшмат, але не варта забываць, што ў дадатак да гэтых грашовых даходаў беларускія грамадзяне маюць сацыяльны пакет, пра які не могуць і марыць не толькі нашы суседзі, але і многія краіны, якія прэтэндуюць на статус развітых. Ільготы па ЖКГ, ільготы па транспарце, ільготы па школьным харчаванні, ужо названыя бясплатная адукацыя і медыцына. Уявіце, вы толькі ўявіце, колькі б каштавала кожнаму чалавеку лячэнне ў стацыянары ад каранавіруса! Хто з вас, якія сядзяць, ну скажам, не бедных, не зусім бедных людзей, змог бы за гэта заплаціць? Калі пачачак лекаў, цэны на іх шалёна растуць, і мы не кіруем гэтымі цэнамі — японскімі, індыйскімі, еўрапейскімі, амерыканскімі, расійскімі прэпаратамі. Дык вось гэты пачачак, якога не хапае на курс, «Актэмра»? Ці як там яе называюць? Больш за тысячу долараў. Хто б змог за гэта заплаціць? А мы трымаемся і мы плацім.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Апошні год мінулай пяцігодкі быў асабліва напружаны. Пандэмія наклала свой адбітак на эканамічныя працэсы ў свеце і на рынак працы: многія краіны закрывалі межы і, па сутнасці, спынялі сваю эканоміку. Былі пабітыя рэкорды па ўзроўні беспрацоўя. Людзі, даведзеныя да адчаю, выходзілі на пратэсты і ўстройвалі беспарадкі. І вось мы гаворым — лакдаўн, зачынілі прадпрыемства, не выпускаюць людзей і гэтак далей. А людзі выходзяць і бунтуюць супраць рашэння ўрада. Памылка. Людзі не супраць гэтага бунтуюць, хоць самі гэтага не разумеюць. Памятаеце, я прыводзіў у перадвыбарчы перыяд прыклад? У аднапакаёвай, двухпакаёвай кватэры жыве міліцыянер або ваенны з жонкай, двое дзетак і яшчэ цешча з цесцем. Як ім? Калі іх там зачыніць усіх. Справа ж не ў гэтым. Пасля гэтых лакдаўнаў хворых не становіцца менш. Гэта мы ўжо ведаем на практыцы. Людзі бунтуюць у прынцыпе супраць таго, што сістэма аховы здароўя, якая сёння там існуе, не спраўляецца з тым аб'ёмам хворых, якія там з'яўляюцца.

Калі мяне папракалі ў першую хвалю, патрабавалі ад мяне каранцін і каменданцкую гадзіну, вы памятаеце, я казаў, нагадаю: не пытанне. Калі вы хочаце каменданцкую гадзіну — я за суткі зачыню краіну, і ніхто не высуне нос. Але нам гэта не трэба было, таму што мы з тым немалым наплывам ковідных спраўляліся ў бальніцах. Нам не трэба было зачыняць людзей у «вязніцах». Зачыняць трэба, калі ў бальніцы не спраўляюцца. У той жа Польшчы, Літве, у Латвіі ды і ў іншых краінах была асабліва моцная ўспышка. Тых, хто захварэў, хто патрабаваў сур'ёзнага медыцынскага ўмяшання, было столькі, што захлынуліся бальніцы. І ўрады прынялі рашэнне людзей зачыніць у «вязніцах».

Мы не ўводзілі лакдаўн. Чаму — вам нагадаць? Я і тады казаў, прабачце, зноў груба, паўтару. Мы можам закрыць людзей і межы можам закрыць, не пытанне, за адны суткі. Мы можам спыніць эканоміку, але пандэмія пройдзе — жэрці што будзем? Памятаеце маю фразу? Я спецыяльна, наўмысна, прадумаўшы, сказаў гэтае слова, каб вы схамяніліся, каб зразумелі.

Ужо тады пандэмія была не толькі і не столькі медыцынскім фактарам. Яе пачалі выкарыстоўваць у эканоміцы, сёння мы ўжо бачым і ў палітыцы. На фоне пандэміі пачаўся паскораны перадзел існуючага сусветнага парадку, існуючых сувязяў. Пачалі дзяліць, разрываць і знішчаць дзяржавы. А я ж год таму вас аб гэтым папярэджваў.

Я вас не папракаю — я проста хачу вас схіліць у будучай частцы свайго даклада: не спяшайцеся. Я прасіў пра гэта нашых культурных работнікаў, «творцаў», якія ну так тварылі, такія карціны пісалі, так выступалі, у тым ліку з гэтай сцэны, а потым хуценька, на працягу некалькіх дзён, «пераабуліся». І дзе яны зараз? Мы правялі тады жорсткую палітыку: «пераабуліся», сышлі — ідзіце. Спыніліся дзесьці і цяпер назад бягуць, назад просяцца. Яны сышлі — «вялікія», на іх месца прыйшла моладзь. Паглядзіце на наша тэлебачанне. Слухайце, часам нават я, чалавек інфармаваны, гляджу, не ўнікаючы нават у сутнасць: прыгожыя маладыя твары, прыгожыя дзяўчынкі, хлопцы — сапраўдныя, гарачыя, ад душы разумеюць і абараняюць нашу краіну. Ну і што адбылося — свет перавярнуўся або наша краіна перавярнулася? Не. І гэтым шляхам, як бы ні было нам цяжка, мы пойдзем. І мы яго пройдзем, і мы выстаім.

Але я хачу звярнуцца да ўсіх палітыкаў і «творцаў» яшчэ раз. Перыяд быў складаны, не кожнаму пад сілу было не тое што прыйдуць да ўлады — яны здрадзяць нікаў адвядуць у бок, таму што ёсць яшчэ адна аксіёма ў жыцці: аднойчы здрадзіўшы, ты здрадзіш і другі раз, і трэці раз.

(Апладысменты).

Не будзем прыхарошваць карціну. Нягледзячы на больш-менш прыстойны ўзровень заробкаў у Мінску, у абласных цэнтрах, рэгіёнах, мы пакуль сур'ёзна прасядаем. Адстаюць па зарплаце сельская гаспадарка, сферы сацыяльная і жыллёва-камунальных паслуг, асобныя катэгорыі бюджэтнікаў яшчэ небагатыя. ***Дзяржава бачыць гэтыя праблемы і працуе над іх вырашэннем. Я думаю, гэта правільна — павышаць узровень зарплаты, планку павагі грамадства да людзей сацыяльных прафесій. За будучае пяцігоддзе іх даходы істотна падцягнуцца.***

Ведаеце, і я ў чымсьці вінаваты, і ўрады, якія я фарміраваў за гэтыя пяць гадоў і ў папярэднія гады. Людзі правільна прад'яўляюць нам прэтэнзіі. Цэны досыць прыстойныя, а даходы — не зусім прыстойныя, скажам так. У чым мая віна? Я прыйшоў у палітыку з вытворчасці. Прама з вытворчай лавы, як і многія тут, можа, нават усе, хто сядзіць. Мала хто не прайшоў праз гэта. І я разумеў, што багацце — гэта не калі ты, прабачце мне за гэтую фразу, грошы пускаеш на ўнітаз або праядаеш іх проста так, а яшчэ прапіваеш і на наркату траціш. А тое, што мы ўкладзём у асноўныя фонды. Створым новыя рабочыя месцы, падымем вёску, у сельскую гаспадарку, у дрэваапрацоўку ўкладзём, калійныя камбінаты новыя пабудуем. Будзем ствараць. Так, трэба пацярпець нейкі перыяд часу, і потым мы атрымаем эфект, як цяпер атрымліваем ад сельскай гаспадаркі (я пра гэта ніжэй скажу). Ад дрэваапрацоўкі 2,5 мільярда долараў мы за апошнія гады атрымалі.

А ўспомніце, колькі крычалі: не туды грошы пайшлі і гэтак далей. Але з-за таго, што мы капіталізавалі гэтыя галіны, будавалі новыя прадпрыемствы, мы, вядома ж, не маглі ў сілу гэтага плаціць вялікія заработныя платы. Надышоў час, і я паставіў ураду такую задачу: так, мы будзем будаваць гэтыя прадпрыемствы, чаго б нам гэта ні каштавала, прыцягваць прыватныя, дзяржаўныя інвестыцыі, крэдытныя рэсурсы, калі гэта нам будзе выгадна, але трэба падымаць зарплату людзям.

З іншага боку, вы не можаце мне прад'явіць прэтэнзіі — мы з вамі пяць гадоў таму вызначыліся, што чалавек будзе мець заробак у 500 долараў у рублёвым эквіваленце — сярэдні, хтосьці менш, хтосьці больш, не можа быць гэтай ураўнілаўкі. Нават у савецкія часы, калі мы спрабавалі ўраўнаваць, нічога не атрымлівалася. Я вам кажу як былы дырэктар і кіраўнік. Хтосьці больш атрымліваў, хтосьці менш, ураўнілаўкі быць не павінна. Гэта гібель для любой вытворчасці і грамадства. Але скажыце — мы ж, як бы ні было складана, гэтую сярэднюю зарплату (і нават трохі больш) дапамаглі людзям зарабіць! А што далей? А далей трэба, цытую самога сябе, «распранацца і працаваць».

(Апладысменты).

Тым не менш мы бачым праблемы. У нас вялікая зона адказнасці — бюджэтнікі. Так, зарплату педагагічных работнікаў давядзём да сярэдняй па краіне. Урачы ў 2025-м будуць атрымліваць у 1,5 раза больш за сярэднюю рэспубліканскую заработную плату.

Сярод негатыўнай інфармацыі мне паступіла заўвага чалавека, які знаходзіцца на пенсіі. Я не паглядзеў — па-мойму, былы настаўнік. Даслоўна: «А хто ж будзе падтрымліваць нашага Прэзідэнта? Вось я за яго галасаваў. Якія настаўнікі будуць яго падтрымліваць, калі ён у іх забраў грошы за класнае кіраўніцтва, за праверку сшыткаў і гэтак далей?»

Прачытаўшы гэтую заўвагу (напэўна, гэты чалавек пачуе мяне сёння), я пачаў думаць: дзе ж мы маглі так па-дурному і неўсвядомлена зрабіць? Бо ў мяне такой палітыкі не было. Я наогул лічу настаўніка і ўрача асновай нашай дзяржавы. А без настаўніка наогул нічога не можа быць — ніякіх урачоў, ніякіх нас. Я сам па першай сваёй адукацыі і прафесіі настаўнік, выкладчык — не магу такім чынам паступіць, таму што ведаю гэтую працу.

А памятаеце, мы па прапанове Міністэрства адукацыі і старога ўрада, яшчэ ўрада Румаса, мадэрнізавалі заработную плату ў адукацыі? Я тады выступаў, па-мойму, у Акадэміі кіравання перад студэнтамі, і мне адзін прафесар задаў гэтае пытанне — вось зарплата і іншае. Са мной побач сядзеў міністр адукацыі, я кажу: «Слухай, як гэта так? Як мы зменшылі заробак? Вы ж уводзілі гэтую сістэму і прапаноўвалі, што мы зробім не 12 паказчыкаў, па якіх плацім настаўнікам і выкладчыкам, а тры-чатыры. Каб менш бухгалтараў было, якія гэта ўсё лічаць: за сшыткі, за класнае кіраўніцтва, за грамадскую работу, за ўсякую лухту. Дапусцім, плаціць

Адзінства. Развіццё.

за стаж працы настаўнікам, гадзіны, яшчэ нейкія да асноўнага акладу надбаўкі — па трох паказчыках. Але ўсё, што яны атрымліваюць па 12 паказчыках, мы ўкарэнім у гэтыя тры. Яшчэ рубель давайце дададзім, каб настаўнікі не сказалі, што мы ў іх забралі зарплату. Можа, у гэтым, Раман Аляксандравіч (Галоўчанка, прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь. — **«Зв.»**), пытанне? Паглядзіце і разбярыцеся з Міністэрствам адукацыі. Калі яны зрабілі не так, як абяцалі, — і міністру і ўсяму Міністэрству адукацыі не месца на гэтых пасадах. Усе павінны пайсці ў школу за гэты заробак. Калі гэта так.

(Апладысменты).

Медсёстры, сацработнікі, занятыя ў сферы культуры будуць мець даход у наступнай пяцігодцы не ніжэй за сярэдні ў бюджэтным сектары. Мы не можам сацыяльных работнікаў і культработнікаў трымаць на гэтай жабрацкай зарплаце. Яшчэ старому ўраду мною была пастаўлена задача: так, сярэдняя зарплата 500 долараў, але некаторыя 350—400 атрымліваюць, іх з падвала трэба падняць, падцягнуць, каб яны не былі жабракамі. Вось давядзём мінімальную да 500 долараў, яшчэ адно вудзільна дадзім усім — ідзіце, лавіце рыбу. Не трэба спадзявацца на дзяржаву, што і лячыць бясплатна будзем, і адукацыю атрымліваць бясплатна, і абарону трымаць, і дзяржаўную бяспеку, і іншае, іншае — і пасля ўсіх гэтых «пернікаў» будзе велізарная заработная плата. Надышоў час варушыцца самім. І я, аналізуючы толькі павярхоўна сацыялагічныя даследаванні, на шчасце сваё, заўважыў наступнае. Не магу працытаваць, але прыкладна гучала пытанне так: што вы будзеце рабіць, калі пагоршыцца сацыяльна-эканамічнае становішча? Каля 70 працэнтаў — па-мойму, 67 — адказалі: будзем разлічваць самі на сябе і імкнуцца выйсці з гэтага становішча самі. Нехта, зразумела, разлічвае на дзяржаву — пенсіянеры, бедныя, людзі з абмежаванымі магчымасцямі і гэтак далей. Але 67 працэнтаў (такога не было ніколі) кажуць: мы самі будзем сабе зарабляць. Добрая тэндэнцыя, так павінна быць. ***Дзяржава не павінна ўсіх несці на плячах, як бы гэта ні выглядала непапулярна. Дзяржава павінна несці толькі тых, хто не ходзіць, вобразна кажучы, хто трапіў у цяжкую сітуацыю. Астатнія павінны варушыцца самі. Зарабляць на сябе, на сваю сям'ю. Але як мінімум мы павінны ім дапамагчы гэта зрабіць. І ў наступнай пяцігодцы мы гэтую праблему павінны вырашыць.***

Са мной, без мяне, але вы, дакладна вы павінны будзеце вырашыць гэтую праблему. У адваротным выпадку ніякай стабільнасці не будзе ў розумах людзей. Пры гэтым людзі, яшчэ раз паўтараю, павінны чакаць толькі аднаго: што мы створым умовы для таго, каб яны маглі зарабіць.

Агульная праблема для ўсёй Еўропы — старэнне насельніцтва. Такая ж тэндэнцыя характэрная і для нас. Адпаведна, і фінансавы цяжар пенсійнай сістэмы не слабее. Разам з тым мы абавязаны прыкласці максімум намаганняў для таго, каб жыццё чалавека ва ўзросце было паўнавартаснае і актыўнае.

Усе будзем старыя. Маладосць — гэта такая рэч, якая праходзіць вельмі хутка. Таму трэба бачыць старых. Дзяржава выконвае свае абавязацельствы па пенсійным забеспячэнні, адаптуючыся да новых рэалій. З 2018 года рост пенсій апярэджвае інфляцыю (ізноў у сярэднім). Гэта значыць, іх памер перакрывае дынаміку цэн, але трэба прызнаць, што зараз узровень пенсій не такі высокі, як хацелася б. Таму я прапаную прадоўжыць удасканаленне пенсійнай сістэмы. ***Бачыцца правільным захаваць статус дзяржавы як апірышча гарантаванай пенсійнай падтрымкі. Паэтапна ўкараняць элементы накапляльнай пенсійнай сістэмы, якая дазваляе кожнаму, хто працуе, гарантавана павялічыць будучую пенсію. Дзяржава стварыць для гэтага патрэбную інфраструктуру.***

Прапануецца падрыхтаваць праграму «тры плюс тры». Яе сутнасць у тым, што работнік зможа пералічваць на свой асабісты пенсійны рахунак да трох працэнтаў зарплаты, столькі ж дадасць і работадавец.

Кантроль за цэнаўтварэннем застанецца адным з прыярытэтаў. У мінулай пяцігодцы мы паказалі, што можам дабівацца нізкай інфляцыі на ўзроўні 5-6 працэнтаў у год. Гэта гістарычныя мінімумы для нашай краіны. Але простаму чалавеку патрэбен не агульны індэкс цэн, а цэннікі, якія ён бачыць на паліцах крам. Таму я падключыў да традыцыйных «цэнавых» дзяржорганаў (гэта ў нас Камітэт дзяржкантролю і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю) яшчэ і дэпутатаў у звязку з прафсаюзамі. Крок сябе апраўдаў. Яны ўзяліся за гэтую праблему вельмі сур'ёзна, не фармальна, стаўшы яшчэ адным фільтрам на месцах. Але скаргаў ад людзей яшчэ нямала.

Для людзей, асабліва з невысокімі даходамі, цэны з'яўляюцца сацыяльнай і палітычнай катэгорыяй. Вось тут справядлівасць сапраўды вышэй за ўсё!

І калі мы закранулі пытанне справядлівасці, разбярыцеся лепш з дармаедамі, якія гадамі нідзе не працуюць, але пры гэтым маюць дарагія дамы, аўтамабілі і плацяць за паслугі краіне па «сацыяльных тарыфах»! *(Апладысменты.)*

Пры гэтым маюць нахабства яшчэ і абурацца, фарміруючы 35-40 працэнтаў удзельнікаў незаконных акцый. Як мне нядаўна далажыў мэр Мінска, там гэты «кірунак» квітнее і пахне. У іх ажно 68 тысяч дармаедаў. На некаторых паглядзелі, як яны жывуць, — вам і не снілася! І яны ўсе хадзілі, яны ўсе малацілі амапаўцаў, міліцыю, ламалі, крышылі, бударажылі грамадства. Яны былі ў авангардзе. Не ў адплату, а трэба ўсіх прымусіць працаваць. Плаціць падаткі трэба для таго, каб мы іх маглі лячыць. Яны ж, калі ў бальніцу прыходзяць або ў школу, мы не глядзім на іх, пратэстуны гэта ці не пратэстуны, збеглыя ці не збеглыя. Прыйшоў чалавек — мы лечым, бомж не бомж, прабачце за гэты выраз. Дармаед ці не. Мы іх лечым, лечым бясплатна. Хоць што значыць бясплатна — за грошы іншых людзей мы іх лечым. Іх трэба прымусіць працаваць. Як хочаце мяне разумейце.

(Апладысменты.)

Пры гэтым я хачу задаць пытанне нашай падатковай службе — пра жорсткую праверку дэкларацый. Служба непрацуючых, як у Амерыцы, як у Еўропе, — дзе Мінпрацы са сваёй базай дармаедаў? Многія гэтыя таварышы не маюць афіцыйных даходаў больш за дзесяць гадоў! Толькі ўдумайцеся ў гэта. Атрымліваюць зарплаты ў канвертах, сядзяць на замежных грантах, не плацяць падаткі — і вас гэта задавальняе? Няўжо Прэзідэнт павінен іх шукаць, трэба чарговае падштурхоўванне з боку Прэзідэнта? Я хачу, каб мяне пачулі бізнесмены і іншыя, у асноўным прыватнікі, якія плацяць зарплату ў канвертах. Наступствы вы ведаеце. Вы ведаеце, што гэта такое. Мы проста забіваем тых, хто сумленна працуе, тых жа бізнесменаў. І яны мне ўвесь час пра гэта кажуць: «Слухай, чаму я афіцыйна вось плачу і іншае». Дык у сацыяльныя ж фонды потым трэба адпаведна з зарплатай плаціць. У канверце даў — плаціць не трэба. Папярэджваю другі раз пасля выбараў: мною дадзена даручэнне Камітэту дзяржкантролю і падаткавікам — як толькі (а гэта нескладана) зловім каго-небудзь, хто грошы раздае ў канвертах, лічыце, што вы былі бізнесменамі. Не крыўдуйце на мяне. Я вас папярэдзіў. І Камітэт дзяржкантролю пачаў жорсткую работу ў гэтым кірунку. Не крыўдуйце, рабіце ўсё сумленна і справядліва, тады вы будзеце паважаныя і народам, і ўладай. *(Апладысменты.)*

Па сямейнай палітыцы. Дзесяцігоддзі яе развіцця дазволілі сфарміраваць магутны комплекс мер падтрымкі сем'яў з дзецьмі. Сістэмай дзяржаўных дапамог ахоплена кожнае чацвёртае дзіця ў краіне. ***У выніку за дзве пяцігодкі амаль падвоілася колькасць шматдзетных сем'яў.***

З 2015 года дзейнічае пашыраная праграма сямейнага капіталу.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Колькасць адкрытых рахункаў набліжаецца ўжо да 100 тысяч на агульную суму больш за мільярд долараў ЗША. Датэрмінова распарадзілася гэтымі сродкамі больш за 27 тысяч сем'яў — практычна насельніцтва такога горада, як Барысаў. Летась праграма прадоўжана на новы пяцігадовы тэрмін.

Вядзецца планамерная работа па развіцці сямейных формаў уладкавання на выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Толькі ў 2020 годзе ўсыноўлена (шчасце, вось для мяне шчасце) амаль 400 малых. Толькі за адзін год — 400! Каля дзвюх тысяч дзетак выхоўваецца ў трох сотнях дамоў сямейнага тыпу. Гэта таксама наша перспектыва. Трэба зрабіць так, каб мы не ў казарме трымалі дзяцей, якія пазбаўлены бацькоўскай ласкі, а каб яны жылі ў гэтых дамах, вы іх ведаеце, і атрымлівалі нашу падтрымку. Каб яны былі ўсыноўленыя. Як у італьянцаў (я памятаю гэта падчас свайго візіту — яны проста шалеюць ад таго, што яны ўсынаўляюць дзяцей, чужых дзяцей, а мы гэтага не рабілі). Мы пераламалі гэтую тэндэнцыю, і нашы людзі з задавальненнем бяруць дзетак. Тых, якіх не могуць узяць, мы абавязкова даглядаем з боку дзяржавы. Дзеці, як і старыя, ні ў чым не вінаватыя, што ў іх такія бацькі.

Сфарміравана разгалінаваная сістэма сацыяльнага абслугоўвання. У сферы сацыяльнай абароны функцыянуе больш за 150 устаноў інтэрнатнага тыпу. Ажыццяўляецца адрасная сацыяльная дапамога і гэтак далей. Аднак час ідзе. Дзяржава павінна трымаць руку на пульсе, ведаць, хто менавіта цяпер не абаронены і хто мае патрэбу ў гэтай дапамозе. Сёння, напрыклад, гэта хворыя на каранавірус, а таксама тыя, хто аднаўляецца пасля гэтай хваробы. Сучасныя тэхналогіі і лічбавізацыя хутка зробяць роўнымі магчымасці грамадзян, зняўшы ўсе абмежаванні з людзей з інваліднасцю.

Беларусь валодае якаснай сістэмай аховы здароўя. Колькасць практыкуючых урачоў расце — амаль на 30 працэнтаў за дзесяць гадоў. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, павялічылася колькасць медыцынскіх устаноў.

Грамадства разлічвае, што вопыт барацьбы з пандэміяй дазволіць вывесці на якасна новы ўзровень стандарты медыцынскай дапамогі.

З гэтай трыбуны хачу сказаць дзякуй усім урачам, усяму медыцынскаму персаналу, якія ўдзельнічаюць у барацьбе з пандэміяй. Я асабіста пабываў разам з імі за гэты час у дзясятках бальніц, у «чырвоных зонах». Бачыў, як яны працуюць. У гісторыю нашай краіны 2020 год увойдзе як год мужнасці беларускіх медыкаў. *(Апладысменты.)*

Мяркуем, што гэта жыццёва важна — арганізаваць бясплатную вакцынацыю жыхароў Беларусі ад каранавіруса, што мы і робім. Мы дамовіліся з Расіяй — мы будзем літаральна праз некаторы час вырабляць сваю вакцыну па расійскіх тэхналогіях. І я ўпэўнены, што ў найбліжэйшы час мы ў Беларусі атрымаем сваю вакцыну. Як бы гэта ні было для нас складана. *(Апладысменты.)*

Мы таксама дамовіліся з Сі Цзіньпінам, што ў хуткім часе (кітайцы гэта робяць вельмі рэдка) яны нам выдзяляць сваю вакцыну. Я думаю, Мікалай Генадзевіч Снапкоў (першы намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. — **«Зв.»**), які тут прысутнічае, адказны за кітайскі кірунак, дамовіцца пасля нашай дамоўленасці з Сі Цзіньпінам, і кітайцы дапамогуць нам арганізаваць па сваіх тэхналогіях вытворчасць іх вакцыны на тэрыторыі Беларусі. У нас ёсць добрыя спецыялісты. Мы заўсёды ў Савецкім Саюзе (і мы гэтую школу захавалі) выраблялі вакцыны, але ў асноўным для жывёл. Тэхналогіі, як мне спецыялісты кажуць, у чымсьці (а хто кажа, і шмат у чым) падобныя. Трэба дадатковае абсталяванне, трэба яшчэ нешта, што мы і робім, і нашы навукоўцы створаць вакцыну. Ведаеце, гэта не толькі для таго, каб цяпер абараніць людзей. Для таго каб цяпер абараніць, мы вырабім расійскую вакцыну.

Нам трэба будзе абараняць людзей у будучыні. Таму мы, ствараючы сёння вакцыны ад коўіду, глядзім у будучыню. Нам гэта спатрэбіцца ў гэтым ашалелым свеце. Вы павінны разумець, што гэта каштуе вялізных грошай! Але калі мы сёння не зробім у дадзеным выпадку гэтую вакцыну, то будзем у дзясяткі разоў больш плаціць за чужую ў будучыні.

Каб арыентаваць беларусаў на здаровае даўгалецце, прапаную рэалізаваць праект «Здаровая нацыя».

Сутнасць гэтага праекта — мабільная медыцына.

Другое — крокавая даступнасць.

Трэцяе — дзень здароўя і клапатлівая паліклініка.

Чацвёртае — высокатэхналагічная медыцына ў рэгіёнах. Вось тут скажу, што гэта перш за ўсё 12 міжрэгіянальных цэнтраў аказання спецмедыцынскай дапамогі, абсталяваных усім неабходным па сталічных стандартах. Гэта акрамя сталіцы, акрамя абласцей.

Незалежнасць

Гэта міжрэгіянальныя 12 цэнтраў. І мы іх сёння фарміруем, каб наблізіць якасную медыцыну да людзей. І будзем рабіць усё для таго, каб ва ўмовах лічбавізацыі, ва ўмовах сучаснага свету, знаходзячыся, дапусцім, у Маладзечне, чалавек мог неадкладна атрымаць кансультацыю прафесара з Мінска, дзе ўсё ж такі сканцэнтраваны самыя моцныя ўрачы.

Пятае — адпачынак для здароўя. Пытанне захавання здароўя — сфера адказнасці не толькі паліклінік. У гэтым плане я хачу сказаць наступнае. Мы так шмат і часта хварэем (хоць не так, як іншыя) толькі таму, што не цэнім сваё здароўе. Бо яно нічога не каштуе. Ну захварэў — бясплатна вылечаць. Калі чалавек трапіць на бальнічны ложак, ён толькі тады пачынае думаць: не дай бог памру, не дай бог нешта здарыцца. А пакуль здаровы — ды пляваць...

Будзем, вядома, лячыць, але майце на ўвазе, што ўрачы таксама не богі. Таму падумайце пра сваё здароўе. Таму я і кажу аб праграме здароўя.

Паважаныя дэлегаты, я таксама хацеў прапанаваць вам сёння распрацаваць праграму «Шматдзетная Беларусь» і закласці ў яе аснову некалькі наступных момантаў.

Першае. Пашырыць межы выкарыстання сямейнага капіталу. Другое. «Мама з трыма дзецьмі — не хатняя гаспадыня!» Праца маці павінна ацэньвацца гэтак жа, як любая іншая. Трэцяе. Мама чатырох малых зарабіла будучую пенсію. Пры нараджэнні чацвёртага дзіцяці даць шматдзетнай маці права на працоўную пенсію, нават калі ў яе адсутнічае стаж працы.

Скажу вам шчыра, мы падрэжам любыя праграмы, але не дэмаграфічныя і не па падтрымцы людзей па жыллі. Галоўнае, ёсць у нас харчаванне, бяспека, мы ўжо па жыллі шмат зрабілі. Але мы будзем і надалей падтрымліваць маладыя сем'і па жыллі. Калі ёсць кут, будуць нараджаць...

... Мы ўсё-такі за апошнія пяць гадоў няхай трохі, але зменшыліся — на 90 тысяч. Няхай трохі, але зменшыліся, мы не пераламалі гэтую традыцыю. А для таго каб апрацоўваць зямлю нашу і жыць у нашай краіне, патрэбныя людзі. Гэта галоўнае. І нам трэба мінімум 15, а лепш 20 мільёнаў чалавек на гэтым, здавалася б, маленькім кавалачку зямлі, а мы пакуль гэтую тэндэнцыю змяншэння не пераламалі. І гэта ў будучыні можа стаць не проста праблемай, а катастрофай, калі ў нас не будзе людзей. Тады на нас будуць глядзець іншыя, дзе раёны густанаселеныя, для таго каб прыехаць у нас жыць. Але мы ж — беларусы. І зямля ў нас беларуская, значыць, і людзі тут павінны жыць — беларусы. Мы не супраць таго, каб да нас прыязджалі і жылі. Але ў пераважнай большасці тут павінны жыць беларусы, каб гэтая зямля была заўсёды беларускай. А для гэтага трэба сёння падтрымліваць маці, якія нараджаюць. Вось і ўсё. Шмат хто кажа: ды вось яны такія-сякія, панараджалі, а нам цяпер іх утрымліваць. Дык зразумейце, вы станеце пенсіянерамі, а плаціць вам пенсію хто будзе? Яны, сённяшнія дзеці, працуючы, зарабляючы, выплачваючы падаткі ў сацыяльныя фонды. Яны будуць нас утрымліваць, таму шматдзетным сем'ям, нараджальнасці мы павінны аддаць асаблівую ўвагу, дзе толькі магчыма...

Па адукацыі. Не кожная краіна ў свеце можа сабе дазволіць дапамагаць сваім грамадзянам у атрыманні першай адукацыі, у павышэнні кваліфікацыі, і, калі трэба, за кошт дзяржавы. Акрамя таго, навуковая дзейнасць — аспірантура, дактарантура — з пункту гледжання фінансавых выдаткаў таксама поўнасцю забяспечваецца дзяржавай.

Ставячы мэты для сферы адукацыі на найбліжэйшыя пяць гадоў, адразу скажу: мы не будзем адмаўляцца ад прынцыповых падыходаў у сістэме адукацыі — дзяржаўнай падтрымкі, мэтавага набору, бясплатнасці, справядлівасці і роўнага доступу да якаснай адукацыі, гарантаванага першага рабочага месца.

Не зменіцца класна-ўрочная сістэма, якую мы захавалі. Нічога лепшага ў свеце пакуль не прыдумалі, і гэта паказалі апошнія падзеі. Проста, зыходзячы таксама з апошніх падзей, дапоўнім гэта дыстанцыйным навучаннем.

Але сістэма патрабуе свайго ўдасканалення. Скажу больш. Вось тыя людзі, тое даследаванне, якое мы правялі... Людзі вельмі незадаволеныя тым, як мы працуем у адукацыі. Гэта выявілася ў канцы мінулага года. Мы пачалі сур'ёзна гэтым пытаннем займацца. Думаю, што на працягу года мы дакладна вызначымся, што нам рабіць.

Па-першае, трэба ўкараняць больш актыўна ў навучальны працэс найноўшыя тэхналогіі.

Па-другое, улічваючы падзеі мінулага года, мы павінны больш сур'ёзна паставіцца да пытання дыстанцыйнага навучання.

Трэцяе. Таксама дыферэнцыравана варта падысці да фармату ўступнай кампаніі. Ужо прапановы Мінадукацыі ўнесла ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Пасля Сходу мы да гэтага вернемся на ўзроўні Прэзідэнта, паглядзець наша тэсціраванне з канкрэтным сумоўем, таму што не заўсёды за тэстамі бачыш будучага добрага спецыяліста і чалавека.

Па-чацвёртае. Што датычыцца пытання вызвалення настаўнікаў ад папяровай валакіты, пытанне не абмяркоўваецца. Губернатары, урад і перш за ўсё міністр, вазьміце гэта як закон для кантролю, вызваліце настаўніка ад непатрэбнай цяганіны. Тое, што трэба, яны будуць дапамагаць нам і рабіць будуць, але непатрэбнага вельмі шмат.

(Апладысменты.)

Гэтае пытанне мы вырашым, вы нават не сумнявайцеся. Больш мы яго падымаць не будзем.

Пятае. Адукацыя — першая прыступка да працоўнай дзейнасці. Сэнс і мэта гэтага працэсу — не толькі даць веды, але і абудзіць у дзіцяці цікавасць да якой-небудзь прафесіі. Так званая прафарыентацыя. Вазьміце вопыт савецкай школы, і нічога не трэба выдумляць. Даць магчымасць дзецям паспрабаваць сябе ў той ці іншай прафесіі ўжо ў школе, каб яны вызначылі, што яны будуць рабіць на рынку працы.

Шостае. Апошнім часам мы сталі забываць, што, акрамя падрыхтоўкі кадраў, для рынку працы асноўнай задачай адукацыі з'яўляецца выхаванне грамадзяніна. І вось тут, дарагія мае калегі, настаўнікі, я вас ва ўсім буду падтрымліваць і вельмі вас разумею, але не шукайце ў мяне разумення, калі вашы школьнікі ходзяць па вуліцах, крышаць і ламаюць усё запар. І калі ў іх пытаюцца: «Вы чаго прыйшлі?» — «Не ведаю». І смяецца. Мякка кажучы, смяецца. Гэта чыя задача? Не толькі сям'і. Гэта задача настаўнікаў. Моладзь сёння трошкі іншая, чым былі мы. Хоць і мы добрыя былі ў той час. Не заўсёды сям'я справіцца з гэтымі пытаннямі. І не заўсёды ў сям'і хапае падрыхтоўкі і адукацыі выхоўваць дзіця. Што мы цямніць будзем адзін перад адным? А школа павінна ліквідаваць гэты недахоп сямейны. Так, адзінства выхавання — гэта сям'я і школа, як нас вучылі Макаранка і іншыя савецкія педагогі. Але тым не менш часы памяняліся, школа павінна ўзяць у гэтым плане на сябе прыстойную нагрузку. У школе трэба навесці парадак. Калі ты пераступіў, школьнік, парог школы, ты павінен з трапятаннем туды прыходзіць, што ты прыйшоў у «храм» навукі. А ў нас што робіцца? Я нават публічна не хачу гэта пералічваць. Вы ўсё гэта ведаеце, таму што ў вас ёсць дзеці, і вы вучыліся разам з імі ў гэтай школе. Кажуць: «Асоба настаўніка не тая». А ад каго гэта перш за ўсё залежыць? Ад самога настаўніка ў тым ліку. І ніякія грошы тут не дапамогуць. Гэта было б занадта проста: дадалі сотню дораз, і ўсё вырашылася. Не, так не будзе. Але часам, ведаеце, поўзаць перад ёй нельга. Яны не ацэняць гэта і правільна зробяць. З маладымі людзьмі трэба размаўляць, як з роўнымі сабе. Яны гэта будуць успрымаць, і глыбока. Моладзь павінна засвоіць, мы проста павінны пры змене пакаленняў цяпер ім убіць у галаву, што без цяжкай працы, без здольнасці і таленту, калі на тое пайшло, багаты ніколі не будзеш! А зараз паглядзіце, як многія з нашай моладзі вучацца ў школе, як яны ставяцца да вучэбных заняткаў. Трохі лепш, вядома, у часы студэнцтва, але час паказаў, што не ўсе цэняць тое, што яны паступілі ў ВНУ і гэтак далей. Гэта значыць, у гэтым плане моладзь — яна ні дрэнная, ні добрая, яна будзе іншай, як некаторыя гавораць. І гэта правільна. У нас моладзь іншая, таму і падыходы ў размовах і выхаванні да яе павінны быць іншыя. І мы ведаем якія. Толькі трэба варушыцца, бо можам страціць гэтую самую моладзь.

Думаючы ў першую чаргу аб моладзі, мы ўдзяляем пільную ўвагу развіццю спорту. Абсалютна пераканаць: культура здаровага спосабу жыцця ляжыць у аснове ўсіх дасягненняў — асабістых, прафесійных, грамадскіх.

Спорт — гэта здароўе нацыі. У Беларусі створаны, як я толькі што прыводзіў канкрэтны прыклад, усе ўмовы для спорту.

Мы пабудуем у найбліжэйшы час 30 тыпавых фізкультурна-аздараўленчых комплексаў з плавальнымі басейнамі. Гэта далёка не ўсё. Гэта ўжо ў рэгіёнах. Што датычыцца прафесійнага спорту — ну вы ўбачылі. Ён не проста стаў палітыкай, ён проста стаў... я нават не магу падабраць азначэння для таго, каб ахарактарызаваць спорт. Сёння ўладныя людзі як хочуць, так і круцяць спортам. Цывілізацыйнае значэнне спорту заўсёды заключалася ў тым, што ён залежыць толькі ад сумленнага выніку. А не, усё паіншаму. Медалі спачатку даюць, потым адбіраюць. Краіны падзяляюць на «правільныя» і «няправільныя», вызначаюць, каму быць на спаборніцтвах, а каму — не. Такія палітычныя інструменты, як санкцыі, блакады, расследаванні, сталі нормай у свеце спорту. Гэта супярэчыць нашаму менталітэту і ўнутранай культуры. Мы з гэтым зміры цца ніколі не зможам. Але і супрацьстаяць, на жаль, гэтаму зараз вельмі цяжка з вядомых прычын.

У нас ёсць спрадвечныя светапоглядныя асновы, якія робяць беларусаў нацыяй. Іх нельга страціць. А значыць, творчасць нашых вялікіх класікаў, вершы і песні народа, у якіх адлюстраваны важныя вехі гістарычнага шляху беларусаў, павінны знаходзіць адлюстраванне ў сучасных праектах, цікавых у першую чаргу моладзі. Гэтае пытанне захавання нашай ідэнтычнасці і суверэнітэту, што немагчыма без разумення свайго гістарычнага і, калі хочаце, кармічнага права быць гаспадаром на сваёй зямлі. Мы, беларусы, жылі на ёй тысячагоддзе. Так, большую частку сваёй гісторыі — у чужых дзяржавах з рознымі народамі. Але ў гэтым вопыце — вытокі нашай талерантнасці, прыязнасці і добрага стаўлення да іншых традыцый і вераванняў. Многія з іх сталі часткай нашай самабытнасці. Зрабілі нацыю культурна і духоўна багатай. У нас дзве родныя мовы. Беларуская і руская. І той, хто сёння адмаўляецца ад

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Патрыятызму, паважаныя сябры, нельга навучыць. Можна толькі паказаць прыклад сваёй шчырай любоўю да роднай зямлі, гонарам за дасягненні свайго народа, беражлівым стаўленнем да гістарычнай спадчыны, павагай да традыцый і каштоўнасцяў многіх пакаленняў беларусаў, канкрэтнымі справамі на карысць краіны.

Усе, хто працуе з сучаснай моладдзю, павінны разумець, што гэта — якасна новы пласт людзей, з уласнымі поглядамі і каштоўнаснымі ўстаноўкамі. Як я ўжо ў пачатку казаў, кланяючыся перад моладдзю, казаў, што яна — будучыня. Таму да зарплаты і настаўнік памяняўся. Ды не.

Аб патрыятызме. Мы ніколі не выстаўлялі сваю любоў напаказ, а проста, як кажуць у народзе, «рабілі»: будавалі, вялі гаспадарку, гадавалі дзяцей. Нашым брэндам стала адданасць сваёй зямлі, дому, малой радзіме, родным і блізкім. І галоўнае — рашучасць абараняць свой дом, сям'ю, каханую!

гэтай вялікай спадчыны, як казаў вялікі Ленін: «Вельмі сур'ёзна рызыкуе». Страціць мову можна. Вялікую рускую мову, дзе шмат нашай беларускай душы. Мова — гэта даволі развітая матэрыя. Калі мы гэта страцім, мы ніколі больш гэта не вернем. Таму беларуская і наша руская мовы — яны будуць заўсёды здабыткам нашай нацыі, і мы не будзем цкаваць людзей... І ціснуць, каб яны не размаўлялі на рускай мове. І ў гэтым таксама наша адрозненне ад таго, што я сказаў у пачатку.

Але і нацыянальныя культуры сёння падвяргаюцца істотным рызыкам. З аднаго боку, глабалізацыя размывае тэрытарыяльныя межы, робячы свет адкрытым. З іншага — і гэта парадокс — людзі ўсё больш замыкаюцца ў клетках сацыяльных сетак, страчваюць такія каштоўнасці, як жывыя стасункі, дабрыня, цяпло, спагадлівасць і добрасуседства. Страшней іншае: мы можам страціць ідэнтычнасць, упусціць у сваё жыццё неўласцівыя нашаму менталітэту мадэлі. Свае стандарты

Адзінства. Развіццё.

паводзінаў, маральныя прынцыпы з пакалення ў пакаленне мы чэрпалі з творчасці вялікіх пісьменнікаў, мастакоў, рэжысёраў, архітэктараў. Тых, хто для сваіх пакаленняў, гаворачы сучаснай мовай, быў лідарам думак. І задача — зрабіць так, каб нашы дзеці і ўнукі сталі захавальнікамі культурнага коду нацыі. Нам жыццёва неабходныя сучасныя Коласы, Купалы, Караткевічы, Шагалы, Пташукі — не проста куміры, а светачы. Дзяржава чакае і гатова ўсяляк падтрымаць такія таленты.

Каб новыя пакаленні беларусаў памяталі і ведалі свае духоўныя і культурныя вытокі, нам таксама трэба будзе сур'ёзна ўкласціся ў гісторыка-культурную спадчыну: завяршыць стварэнне музейнага квартала Нацыянальнага мастацкага музея і ў найбліжэйшы час — рэканструкцыю і рэстаўрацыю Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку, палацава-паркавага ансамбля ў вёсцы Жылічы Магілёўскай вобласці, Крэўскага замка ў Гродзенскай вобласці ды іншых жамчужын, якія вартыя таго, каб пра іх ведалі ва ўсім свеце. Жамчужынай жа нашай гістарычнай памяці з'яўляецца подзвіг беларускага народа. У ім мы бачым найлепшыя рысы нацыянальнага характару беларусаў — мужнасць, самаадданасць, адданасць Айчыне, гатоўнасць абараняць сваю зямлю да канца.

Гэта наш гонар, калі мы можам шчыра ўстаць і сказаць: «Гэй вы, успомніце, што вы вытваралі тут». Мы гэта памятаем, і крыць ім не будзе чым. Таму гэта трэба захаваць, трэба за гэта змагацца, чаго б нам ні каштавала.

(Апладысменты.)

Кажучы пра вытокі нашай нацыянальнай ідэнтычнасці, немагчыма абысці тэму рэлігіі. Мы шматканфесійная краіна, маральным падмуркам якой з'яўляюцца хрысціянскія каштоўнасці.

І што важна, для ўсіх канфесій, прадстаўленых у нашай краіне, Беларусь — агульны дом. Беларуская верацярпімасць і талерантнасць сталі адным з галоўных дасягненняў незалежнай Беларусі.

Наша дзяржава змагла ў поўнай меры забяспечыць рэалізацыю права на свабоду сумлення: даць народу сапраўдную свабоду ў выбары веры ці, наадварот, нерэлігійнага светапогляду. Мы падтрымлівалі і будзем падтрымліваць традыцыйныя канфесіі ў іх стваральнай дзейнасці. Мы зробім усё, як я часта кажу, каб кожны з нас, кожны беларус, і нават госць нашай сталіцы, які прыехаў да нас, меў магчымасць выбраць сваю дарогу да храма. У гэтым наша каштоўнасць, у гэтым наш шлях.

Зразумела, базісам для існавання і развіцця ўсіх сфер грамадскага жыцця — ад навукі і адукацыі да культуры і рэлігіі — з'яўляецца эканоміка. Гэта наступная частка, вельмі важная і сур'ёзная, выходзячы з вашых прапаноў, да якой я хачу звярнуцца. Яшчэ раз прабачце, што я затрымаў вашу ўвагу, але пытанне сур'ёзнае, абыйсці мы яго не можам, яно найважнейшае, таму што ў аснове ўсяго таго, што я сказаў, ляжыць эканоміка. Эканоміка дае жыццё для ўсяго таго, што было сказана раней.

...Ведаеце, адцягнемся трохі для разрадкі, тры хвіліны літаральна. Я вельмі ўважліва назіраю за тым, што адбываецца вакол Усебеларускага народнага сходу і да яго. Я бачу, якой атацы вы падвергліся. Слухайце, і ў «карнікі» вас запісвалі, месца не хапіла ў «карніках», асобны сайт нейкі там адкрылі, і вас запалохвалі, і палохалі. Потым уключаю тэлевізар і бачу, як вы з адкрытым тварам у добрым сэнсе слова наплявалі на ўсіх іх і кажаце тое, што трэба краіне, і думаю: «Ну з такімі ў бой яшчэ можна ісці, і нават без зброі».

(Апладысменты.)

Паверце, не толькі вы, але і тыя, хто стаіць за намі, іх мільёны, іх пераважная большасць. Я нават пачынаю думаць, пасля гэтых выбараў, кажуць, вось там намаляваліі нешта Прэзідэнту дзеючаму, я думаю, ведаеце, вось шчыра, у нашых жа губернатараў ёсць звычка паказаць, у каго лепш, той там паўпрацэнта, працэнт, два мог дапісаць, але слухайце, ну нельга намаляваць 80 працэнтаў. Ну добра, калі камусьці не падабаецца 80, няхай будзе 76, няхай нават будзе 68, як у сярэднім зараз па анкетах, або 74,5 па апытаннях. Няхай, але ўсё роўна мы пераможцы! За намі пераважная большасць народа!

(Апладысменты.)

І нам не трэба гэтага баяцца, як зрабілі вы. Вы проста малайцы! І гэта ваша перш за ўсё заслуга. Вось я аб'ектыўна, мне ніхто — ні аргкамітэт, ні прэм'ер, ні кіраўнік Адміністрацыі — ніхто не далажыў, што нехта спалохаўся ў гэты складаны час. У вас жа няма такой невялікай, але тым не менш абароны, як, дапусцім, у Прэзідэнта. Вы жывяце ў гэтым грамадстве. І гэтыя адмарозкі, я думаю, Тэртэль (старшыня КДБ. — **«Зв.»**) будзе сёння выступаць, ён яшчэ скажа пра гэта. Мы нядаўна паказалі па тэлебачанні, як адна з груп, я не хачу гэтага падонка нават называць, рыхтавала тэракты ў Беларусі. Гэта людзі, якіх яны ўцягнулі ў гэта. Як гэтая жанчына бедная плакала і крычала: «Навошта ты гэта зрабіў, навошта ты прыйшоў у наш дом, і як мне з гэтым цяпер жыць?» Гэта яны ўцягвалі нашых людзей, гэта яны завозілі і куплялі зброю ва Украіне і перапраўлялі. Мы выявілі ўсе ланцужкі. Пра гэта старшыня КДБ вам скажа. І вы ў гэтай сітуацыі не пабаяліся. Я не хачу перабольшваць тут ваша значэнне, і сваё, і іншых. Але гэта наша жыццё. Гэта наша з вамі работа. Але вы ж не завагаліся. Вы, як гэтыя амапаўцы, тады ўціхамірылі іх на вуліцы, так і цяпер змагаецеся за сваю краіну. Я гэта да чаго кажу? Што пройдзе зусім няшмат часу, і вы зразумееце, якую ролю адыгралі мы ў станаўленні суверэннай і незалежнай Беларусі. Таму я спачатку нездарма сказаў: слухайце, вы сюды прыехалі, пагутарылі, убачылі знаёмых, блізкіх, а можа, хтосьці і не ўбачыў, абавязкова «сэлфаніцеся», так моладзь кажа. Сфатаграфуйцеся, сфатаграфуйцеся абавязкова на фоне нейкіх знакавых месцаў. І на вуліцы, і на плошчах, і ў Мінску, і каля помніка, калі будзеце ўскладаць кветкі. Для чаго? Вы пішаце гісторыю свайго жыцця. Я хачу, каб гэта была яркая старонка ў вашым жыцці, якую вы, з часам адкрыўшы, пакажаце сваім дзецям або не проста будзеце вучыць іх маралі, а скажаце, што ў гэту цяжкую гадзіну вы не завагаліся і разам са сваім Прэзідэнтам выступілі на абарону нашай Айчыны. Гэта ваш будзе вялікі здабытак.

(Апладысменты.)

Тым не менш Беларусь часта папракаюць, што мы захавалі элементы савецкай сістэмы планавання, кажучы пра эканоміку. Хоць такія краіны, як Кітай і Японія, карыстаюцца імі ўжо шмат гадоў, вызначаючы не толькі арыенціры, але і пералік, што пабудаваць, за колькі пабудаваць, хто будзе будаваць, якія тэрміны і хто адказны. Дакладна так зрабіў урад гэтым разам, на пяцігодку. Гэта было маё патрабаванне, каб людзі разумелі. «Гродна Азот» — яно будзе, гэта прадпрыемства, пабудавана ў такія тэрміны за такія грошы. І гэта будзе столькі рабочых месцаў, і што гэта, напрыклад, на 40 працэнтаў павялічыць наш экспартны патэнцыял.

Мы заўсёды пяцігодкі планавалі, як я сказаў. Але ў гэтым выпадку будзе поўная канкрэтыка, дзе мы што пабудуем. І чаго б нам ні каштавала, нам трэба дамагчыся рэалізацыі гэтых планаў. На працягу дзесяцігоддзяў нам рэгулярна прадракалі эканамічны калапс. Не выключэннем стаў і мінулы год. Усе міжнародныя фінансавыя інстытуты прагназавалі ў 2020 годзе падзенне ВУП на восем, аж да дзесяці працэнтаў некаторыя. У рэальнасці склалася менш за адзін працэнт. І тое, калі б не было — нават не ў пандэміі справа, хоць яна паўплывала, — калі б не было вось таго, што рабілася ў Мінску і ў некаторых гарадах, мы дакладна гэтых 0,8 або 0,9 працэнта б атрымалі.

Па ключавых параметрах мы захавалі ўзровень папярэдняга года, забяспечыўшы рост рэальных заробкаў на восем працэнтаў, я маю на ўвазе ў папярэднім, 2020 годзе станоўчы гандлёвы баланс у памеры двух мільярдаў долараў. Беспрацоўе склала менш як чатыры працэнты (208 тысяч). А зарэгістраванае беспрацоўе ў нас — тыя, хто хоча працаваць, — наогул там, напэўна, 0,5 працэнта, менш за працэнт. Такога ўзроўню няма нідзе. Гэта сведчыць аб тым, што ў нас хапае рабочых месцаў. Я памятаю, калі наведваў МТЗ, генеральны дырэктар Воўк прывёў такі яскравы прыклад. Вось ён у мяне ўвесь час у галаве. Кажа: «Нам вельмі патрэбныя рабочыя, спецыялісты. Я прапаную добрую зарплату — 1200 рублёў, 1100, але заробленую. На першапачатковым этапе. І інтэрнат як мінімум даём у Мінску». І вы ведаеце, ніхто асабліва не ірвануў...

Рабочае месца, дастойная зарплата — той мінімум, што чакаюць ад нас людзі. Чвэрць стагоддзя дзяржава нязменна была нацэлена на яго забеспячэнне. У папярэдняй пяцігодцы мы, нягледзячы на ўсе складанасці, стваралі больш за 50 тысяч рабочых месцаў штогод.

Гэта, вядома, не тое, што нам хацелася б, але гэта высокапрадукцыйныя, добрыя месцы.

Нас пастаянна крытыкуюць, што мы застылі ў развіцці. Назаву толькі тры асаблівасці нашай эканомікі на сучасным этапе. Кароткая, не расшыфроўваючы.

Змянілася яе структура, па-першае. З'явіліся і атрымалі развіццё новыя галіны — ІТ, біятэхналогіі, ядзерная энергетыка. Доля недзяржаўнага сектара выраслa да 50 працэнтаў. Другое. Праведзена маштабная мадэрнізацыя традыцыйных вытворчасцяў. Цяпер тут ідзе работа па забеспячэнні максімальнай аддачы ўкладзеных сродкаў. Крытыканам хачу сказаць, якія казалі: «Ды нам гэта не трэба, і ніякай сельскай гаспадаркі, не трэба гэта ўсё. Давайце будзем нешта рабіць, чаго мы ніколі не рабілі». Зразумейце, у эвалюцыі ўвесь працэс. ***Эканоміка не церпіць ніякай рэвалюцыі і шарлатанства. Ніякіх шараханняў быць не павінна. Гэта эканоміка. Эвалюцыйна трэба развівацца. Чаму мы не павінны развіваць тыя галіны, дзе ў нас ёсць кампетэнцыі, дзе ў нас ёсць спецыялісты, дзе мы ўмеем нешта рабіць?***

Для прыкладу, забягаю наперад, мы плануем у будучай пяцігодцы стварыць такія кластары, калі да буйных кампаній — дапусцім, МТЗ або «БелаўтаМАЗ», «Гомсельмаш» і гэтак далей — падвяжам шмат малых, сярэдніх прадпрыемстваў, якія будуць вырабляць ім шасцярэнькі, гайкі і балты, якія мы закупляем па імпарце. Мы ж умеем гэта рабіць. І мы падтрымаем гэтыя малыя і сярэднія прадпрыемствы. І «Гомсельмаш» не будзе бегчы ў Германію, каб купіць камплектуючыя, а будзе тут, стварыўшы гэты кластар, атрымліваць іх ад малых прадпрыемстваў. Гэта будзе сур'ёзнае імпартазамяшчэнне. А для гэтага трэба не забываць старыя школы, дзе мы нешта цямім.

Такі прыклад. Стваралі мы ракету «Паланэз». Вельмі трэба было яе стварыць: ніхто нам не прадасць найноўшую зброю, прытым самую сучасную. Ракетную... Кінуліся, а ў нас тры з паловай чалавекі, якія нешта разумеюць у гэтай ракетнай тэхніцы. І тым не менш была пастаўлена задача (дзякуй, кітайцы ў гэтым плане нас падтрымалі фінансамі і тэхналагічна) і мы стварылі гэтую ракету. Зараз працуем над новай, далёкасць якой будзе большая. Мы выпрабавалі пару такіх ракет. Пакуль мы бачым, што над імі трэба сур'ёзна працаваць. Але яна паляцела, і паляцела куды трэба.

(Смех у зале, апладысменты.)

Але нам трэба яе дапрацаваць. Ніхто тут не дапаможа. І я ведаю, як цяжка на роўным месцы, не маючы кампетэнцыі, як модна цяпер казаць, не маючы спецыялістаў, ствараць гэту зброю. Вельмі складана, таму хоць бы на грамадзянцы давайце будзем развіваць тыя кірункі, у якіх мы штосьці разумеем.

Дапусцім, для «Гродна Азот» мы хочам пабудаваць новы сучасны камбінат. 1 мільярд 200 тысяч долараў ён будзе каштаваць. Практычна скампанавалі гэтую праграму, але ў нас ёсць «Гродна Азот», мы адтуль можам узяць спецыялістаў і перакінуць сюды, яны навучаць новых людзей. У нас рыхтуюцца спецыялісты пад гэты праект, мы ўмеем гэта рабіць.

Або калійны камбінат — мы дзве новыя вытворчасці (адна прыватная, адна дзяржаўная)

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

І далёка не кожная краіна мае ў сваёй гісторыі такі яркі прыклад гераізму, які праявілі нашы продкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Кідацца гэтым нельга, гэта наш найвялікшы здабытак. Паверце, калі мы ад гэтага адмовімся, не праблема, гэты здабытак возьмуць іншыя. Ну, напрыклад, расіяне будуць годна несці, што яны і робяць. Праўда, зараз пакуль разам з намі. Ці ўвогуле, калі пахіснуцца расіяне, а там ужо таксама з боку пэўных пратэстуноў ёсць такія тэндэнцыі, аб нас вытруць ногі тыя, хто нас у свой час забіваў, гвалтаваў. Вытруць ногі і скажуць, як яны пачынаюць гэта казаць, што гэта мы развязалі вайну, што гэта мы вінаватыя, што мы агрэсары, што мы проста нелюдзі, горшыя за звера, і гэта ўжо будзе іншая гісторыя, і гэта ўжо будуць іншыя каштоўнасці. Таму нам ні ў якім разе нельга страціць вось гэты дар, які нам прынеслі старэйшыя пакаленні.

Незалежнасць

ужо практычна запусцілі ў Петрыкаве, наступная праз два гады будзе гатова. Чаму не развіваць гэтыя вытворчасці? Навошта мудраваць?

Хоць мы на гэтым не спыняемся. Вазьміце атамную станцыю. Ну так, мы пабудавалі разам з расіянамі, дзякуй Прэзідэнту Расіі, выдзелілі крэдыт нам на гэта. І сёння расіяне кажуць: «Слухайце, нам трэба, Аляксандр Рыгоравіч, каб вашы спецыялісты і будаўнікі паехалі з намі ў Егіпет, у Турцыю, Індыю, для таго каб будаваць падобныя станцыі». Гэта значыць, мы на роўным месцы стваралі гэтую вытворчасць.

Сельскую гаспадарку, дзе ёсць свае рэсурсы, дрэваапрацоўку, дзе таксама ўласныя рэсурсы, — абапіраючыся на іх, мы будзем развіваць.

Трэцяе — мясцовыя рэсурсы. Велізарны пласт схаваны ў гэтым, і мы толькі падышлі да гэтай тэмы. У бягучай пяцігодцы неабходна зрабіць сапраўдны прарыў.

Часта чую: так званыя незалежныя эканамісты, спецыялісты лічаць, што нам не трэба развіваць усё, што мы развівалі ў Савецкім Саюзе. Трэба пакінуць два-тры кірункі і ўсё. Слухайце, я часам думаю: «Божа мой, добра, што яны амаль усе сёння сядзяць у Польшчы ці Літве і не перашкаджаюць». А што мы будзем рабіць з тымі галінамі, якія акажуцца нам не патрэбныя, там жа сотні тысяч нашых грамадзян працуюць, нашых людзей? Мы што, іх закрыем? Гэта — па-першае. А навошта? Давайце напружвацца, давайце вырабляць на гэтых прадпрыемствах, мы ж іх у асноўным мадэрнізавалі, прадукцыю і прадаваць яе на знешніх рынках. Паставіць сабе просценькую задачу і нічога не рабіць — прасцей. Але тое, што нам дасталося ад Савецкага Саюза (вы ж бачыце, што мы нічога не закрылі, якія б ні былі цяжкасці), мы развіваем, падымаем. І нават тых, хто ў складанай сітуацыі — стратныя прадпрыемствы і іншыя, — мы спрабуем падтрымаць, таму што там жывыя людзі, якія ўмеюць рабіць добрую прадукцыю. Проста састарэла вытворчасць, трэба яе мадэрнізаваць.

Мы сёння ганарымся, што ў 2,5 раза перавысілі аб'ёмы саюзнай прамысловай вытворчасці, з'яўляючыся лідарам на постсавецкай прасторы. Толькі ў апошнія гады мы зрабілі 50 тысяч легкавых аўтамабіляў, забяспечылі больш за палову айчыннага рынку беларускімі лекамі.

На мінулую пяцігодку мною была пастаўлена жалезная задача для Міністэрства аховы здароўя і ўрада. Мы 20 працэнтаў усяго выраблялі сваіх лекаў. Усе купляліся за шалёныя грошы. Сёння ўжо больш за пяцьдзясят за адну пяцігодку. Далей. Мы павінны падысці да сямідзесяці — сямідзесяці пяці. Трэба вырабляць. Калі ўжо гэтыя субстанцыі не зможам тут атрымаць — купім іх. Але ўсё астатняе трэба вырабляць тут, наколькі гэта магчыма. Гэта вялікі рынак. Мы зрабілі, як я сказаў, 50 тысяч легкавых аўтамабіляў. Слухайце, хто б мог падумаць, што ў гэтай жорсткай канкурэнцыі, дзе гэтых аўтамабіляў — як мышэй у дрэннай гаспадарцы, мы можам вырабіць свой аўтамабіль і канкураваць з сусветнымі брэндамі! Гэта вельмі цяжкі кірунак, але мы яго зрабілі. Я некалі казаў, што марыў калісьці, каб мы, машынабудаўнічая краіна, атрымалі свой легкавы аўтамабіль. І мы будзем усё рабіць для таго, каб ён быў якасны, надзейны і даступны па цэнах для нашых людзей.

Усе крычаць, што не тая палітыка, не тое робім, усе бедныя і іншае. Скажыце, ці кожная сям'я ў Беларусі сёння, у сярэднім, мае аўтамабіль? Нават не адзін. Я памятаю, у свае маладыя гады — аўтамабіль купіць? Хто мог марыць, што ў 20—30 гадоў чалавек сядзе за руль уласнага аўтамабіля? Мала таго, што чарга — грошай на гэта трэба было зарабіць. Сёння — паглядзіце — мэр Мінска дакладваў, — праблема, якую з telegram-каналаў і іншых там месенджараў атрымаў, — снегам засыпала! Прытым што сёння вакол кожнага дома аўтамабіль стаіць на аўтамабілі...

Апошнім часам, акрамя традыцыйных вытворчасцяў, мадэрнізацыі, мы вельмі шмат зрабілі для стварэння новых галін. Гэта трэба рабіць, бо краіна не будзе такой цікавай і іміджу ў краіны не будзе, калі мы будзем выязджаць толькі на старых вытворчасцях. Але паглядзіце, я ўжо казаў, касмічная галіна. Мы вельмі шмат рабіць можам. Па ВПК — мы не ўсё гэта афішуем, але тым не менш робім. ***Паглядзіце біяхімічныя тэхналогіі: новае буйное прадпрыемства, якое мы будуем, і калі мы яго цалкам пабудуем, то толькі чатыры краіны ў свеце будуць мець такія, з закончаным цыклам, прадпрыемствы.*** Электратранспарт, які мы пачалі рабіць. Таксама на аснове старой мадэрнізаванай вытворчасці будзем развіваць і новыя. Паглядзіце па нафтаперапрацоўцы: сёлета мы поўнасцю скончым мадэрнізацыю двух нашых НПЗ.

Па энергетыцы многія крытыкавалі: здавалася, навошта нам столькі? Сапраўды, запас вялікі. А вось ва Украіне праблемы — згарэлі дзве найбуйнейшыя электрычныя станцыі, іх адразу не пабудуеш і не заменіш. І ці заменяць? Да каго прыйшлі? Да старых сяброў — да нас. Мы ж не бясплатна гэта робім. Мы прадаём ім гэтую электраэнергію. Значыць, яна нам патрэбна.

Або электрычнасць для насельніцтва. Неяк намацалі з дапамогай Мінэнерга (малайцы спецыялісты!), куды будзем дзяваць электраэнергію. Так, электрамабілі, але гэта не той аб'ём, які могуць спажыць. А чаму не будаваць сёння жыллё з вялікім выкарыстаннем электрычнасці. Паспрабавалі. Людзі «памацалі» і з задавальненнем гатовыя да дамоў з электрычнасцю. Таму будзем пераходзіць на гэтыя стандарты. Гэта бяспечна, вельмі зручна, і гэта будзе наша электрычная энергія. Мала таго, мы чвэрць прыроднага газу такім чынам можам замясціць.

Вельмі важны кірунак — імпартазамяшчэнне. Прыкладна 300 відаў імпартазамяшчальных тавараў заяўлена ў нашай праграме. З іх не менш за дзесяць працэнтаў — абсалютна новыя для Беларусі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вось вам і навізна, і не трэба нічога ламаць і крышыць — трэба гэта развіваць. Таму што зламаць можна, пабудаваць можна, але гэта каштуе шмат грошай, дзе мы іх возьмем?

Важнае выкарыстанне мясцовай сыравіны. І хто б нас ні крытыкаваў, але дрэва, скура, лён, торф, іншыя мясцовыя рэсурсы — гэта вельмі сур'ёзная дапамога для эканамічнай бяспекі. Мы перад сабой ставім у гэтым плане амбіцыйныя задачы. Я паглядзеў рэпартаж, выступаў Крупноў — пісьменнік вядомы з Расіі, вялікі сябар Беларусі. Здзівіла мяне, што ён пачаў гаварыць пра лён як нейкую інтэграцыйную сувязь Расіі і Беларусі. Але адзіны мадэрнізаваны, прыгожы льнокамбінат (пабываў ён у Оршы) — у Беларусі, адзіны застаўся на постсавецкай прасторы. Але трэба сыравіну. Ён не ведае, што мы жорстка плануем і самі для сябе вырабляем гэтую сыравіну, трохі закупляем. А мы, кажа, можам даць у Расіі сыравіну і тым самым падымем зноў ільнаводства ў Расійскай Федэрацыі. Але самае галоўнае, за што я парадаваўся: пісьменнік, публіцыст пра гэта кажа. Значыць, не ўсё так дрэнна ў нас.

Аб дрэваапрацоўцы. На новых папяровых, кардонных, пелетных, мэблевых заводах нам трэба забяспечыць не менш за 25 працэнтаў прыросту ўсёй прамысловасці краіны за пяцігодку і штогадовы экспарт у памеры чатырох мільярдаў долараў да 2025 года.

Што датычыцца перапрацоўкі другасных рэсурсаў — пабудова эканомікі замкнутага цыклу (або, як яе называюць у свеце, цыркулярнай эканомікі) немагчымая без перапрацоўкі другаснай сыравіны. Слухайце, мы бязладна ставімся да другаснай сыравіны. Калі мне прывялі ў прыклад, што ў Швейцарыі практычна 100 працэнтаў перапрацоўваюць (і гэта рэспубліка, якая мае рэсурсаў яшчэ менш, чым мы), — гэта было проста абразліва для мяне. Таму год таму была пастаўлена задача адмовіцца ад гэтага пластыку: паперы хапае, мы можам замясціць імпарт і іншае. Не будзем загаджваць сваю краіну, трэба перапрацоўваць другасную сыравіну. Але тут вельмі важна — трэба памяняць свой лад мыслення. Калі мы хочам мець чыстую краіну, зялёны кавалачак лёгкіх Еўропы, то, калі ў разы не павялічым перапрацоўку камунальных адходаў, будзем жыць у брудзе, у страшным брудзе, шкодным брудзе.

Да канца пяцігодкі перапрацоўка другасных рэсурсаў павінна скласці 50 працэнтаў, не менш!

(Апладысменты.)

Энергетыка. Я ўжо пра гэта казаў: атамная станцыя, замяшчэнне прыроднага газу, перавод на чыстую электрычную энергію — многае ў нашай эканоміцы дасць станоўчы эфект. А яшчэ ёсць у нас і драўніна, і шчэпкі, і пелеты.

Задачы на пяцігодку гранічна зразумелыя.

Першае. Развіццё інфраструктуры перадачы электраэнергіі. Ведаеце, у што мы ўперліся? Не хапае слупоў, правадоў і падстанцый. Можам больш жылля будаваць, але гэтую энергію трэба ў большай колькасці падаць да населеных пунктаў. Кажуць, што яна будзе дарагая. Мы знойдзем, як кампенсаваць нейкую долю гэтай цаны, але дадзім (больш электрычнасці. — **«Зв.»**) людзям і ў вёсцы, у аграгарадку. Можа быць, у непапулярныя і неперспектыўныя вёскі не пацягнем правады, а ў аграгарадкі і буйныя вёскі трэба прыйсці. У гарады трэба прыйсці з вялікай колькасцю электрычнасці. І даць новае, чыстае жыццё для нашых людзей. Таму інфраструктуру пачалі будаваць.

Рост электраспажывання пры прымальных тарыфах — гэта наша задача. Па насельніцтве, я ўжо казаў, людзі добра адрэагавалі на электрычнасць у дамах, калі для ежы, цёплай вады і абагравання мы яе выкарыстоўваем, застаецца толькі падвесці халодную ваду, забяспечыць водаадвядзенне. Усё! Гэта будзе нашмат танней, і гэтым шляхам, мы прынялі рашэнне, пойдзем.

Аграрны сектар. Доўга не буду тут казаць. Шмат сказана. ***Наша краіна па праве ганарыцца сваімі дасягненнямі, стаўшы адным з сусветных лідараў. Напрыклад, па вытворчасці малака на душу насельніцтва, як я ўжо казаў, уваходзім у пяцёрку вядучых краін. Інтэнсіўная і экалагічная сельская гаспадарка, сучасная перапрацоўка ў АПК — мы цалкам забяспечылі сваю харчовую бяспеку.***

Чаму гэта важна? Таму што многія з вас і я перажылі, калі мы прыніжана стаялі з талончыкамі ля прылаўкаў. Калі не было чаго практычна купіць і паесці. Ніколі не будзе дзяржавы, калі яна не можа накарміць сваіх людзей! Не таму, што вясковы чалавек, я пачаў гэта. Хоць і таму. Я разумеў, што без сяла, без вёскі не можа быць дзяржавы. І мы заўсёды абяцалі людзям аддаць даўгі. Вёсцы аддаць даўгі. Так аддавалі і выраўноўвалі ўмовы жыцця вёскі і горада, што ледзь не сцерлі вёску. Таму, працуючы там, я разумеў: калі не выратуем вёску, не будзе Беларусі. Не будзе Расіі і Украіны, славянскіх краін не будзе без вёскі. І мы выратавалі вёску. Больш за тое, мы забяспечылі харчовую бяспеку.

Мы накармілі нашых людзей. І гэта вельмі важна. Мы па шэсць мільярдаў долараў —

Адзінства. Развіццё.

хто б мог тады падумаць! — сёння атрымліваем ад продажу сельскагаспадарчай прадукцыі.

І справа не ў тым, што я калісьці працаваў на вёсцы, у тым ліку і дырэктарам. Справа не ў гэтым, а ў тым, што прадукты харчавання — гэта галоўнае для жыцця людзей. Гэта таксама аксіёма. І асабліва важна, калі мы хочам, каб у нас былі нармальныя дзеці, каб мы былі здаровыя, — ежа, як паветра, вада і іншае, з'яўляецца галоўным для здароўя чалавека. Мы накармілі свайго чалавека. Мы прадаём шмат прадукцыі.

Хачу вам прывесці самае галоўнае, да чаго хілю. Са слоў новага прэзідэнта ЗША Байдэна, з-за праблем, звязаных з пандэміяй, сёння (а справа не толькі ў пандэміі, хлусіць) 36 мільёнаў амерыканцаў (добра, што ён прызнаўся) — больш за дзесяць працэнтаў насельніцтва — недаядаюць, з іх 12 мільёнаў — дзеці. Імперыя, вядучая краіна — есці няма чаго. Што казаць пра іншыя краіны! А ў нас ёсць што паесці. Калі ласка, мы можам прадаць. Звяртайцеся, звяртайцеся, у нас ёсць яшчэ рэзервы!

Чаму нас кітайцы пусцілі на свой рынак? Таму што яны ўбачылі якасць. Якія б кітайцы ні былі сябры, яны мацалі кожны кавалачак малочных прадуктаў, мясных і гэтак далей. І няпроста было прабіцца на гэты рынак. Хоць ім гэта вельмі было патрэбна. А сёння мы гаворым: дадаць можам мільярд, прадаючы гэтую і іншую прадукцыю ў Кітайскую Народную Рэспубліку. Вось у чым справа!

Мы апынуліся на правільным шляху. Мы дзве пяцігодкі, нават тры, мадэрнізавалі нашу сельскую гаспадарку. Выратавалі вёску, далі магчымасць працаваць там. Сёння ўжо можна займацца бізнесам на вёсцы. І сярод былых буйных калгасаў і саўгасаў шмат, сотні такіх, якія працуюць нястратна. Таму мы не закапалі грошы ў сельскую гаспадарку. Яна летась адзіная амаль на шэсць працэнтаў у плюс спрацавала. Хоць там мора пытанняў, якія мы павінны вырашаць.

Першае — трэба ўкараняць новыя адаптыўныя сістэмы земляробства і тэхналагічныя рэгламенты.

Другое — забяспечыць сельскую гаспадарку пад нарматыўную патрэбнасць надзейнымі высокапрадукцыйнымі машынамі і вытворчымі комплексамі.

Трэцяе — паглыбіць кааперацыю ў дачыненні да сельгаспрадукцыі. І на сельгаспрадукцыі павінны перш за ўсё зарабляць сяляне, а не пасярэднікі, гандлёвыя сеткі ці яшчэ нехта. Ведаеце, вось мы зараз вельмі жорстка паступілі ў дачыненні да прыватнікаў у Беларусі. Асабліва тых, якія пратэстунамі аказаліся і якія вялі недзяржаўную палітыку. Вельмі жорстка. І вы павінны ведаць, што гэта была мая каманда.

Я заўсёды бізнес папярэджваў, вы памятаеце: хлопцы, у нас не забаронена займацца палітыкай, але, калі вы працуеце ў бізнесе і прыходзіце ў палітыку, — там іншыя законы. Там іншыя правілы. І трэба разумець гэтыя іншыя правілы. Яны туды прыйшлі, растапырыўшы пальцы, са сваімі паняццямі і законамі. Мы іх па-беларуску вымушаныя былі паставіць на месца.

Да чаго я — карыстаючыся гэтай сітуацыяй, ва ўрадзе і міністрам трэба разумець, што нам, калі вобразна гаварыць, трэба даціснуць гэтую сітуацыю і паставіць на месца ўсіх гэтых пасярэднікаў і гандляроў. Яны не павінны нажывацца на працы сялян. Гэта і для прамысловасці вельмі важна — прыбраць пасярэдніцтва, спрэс выкараніць, мы ўжо не аднойчы кажам, у тым ліку гандляроў. Там, дзе яны не патрэбныя, іх быць не павінна. Я не кажу рэзаць усіх запар, але ў нас шмат галін, дзе яны проста ўздуваюць цэны, і тады шматлікія іх дзеткі ў 20-гадовым узросце шыкуюць на «Мерседэсах», БМВ, «Вольва» і іншых аўтамабілях, а іншая моладзь глядзіць і думае: вау, вось дык цуд! А гэта таму, што ў нас Прэзідэнт не той, у нас улада не тая, у нас нешта не тое. І людзі думаюць: ды памяняем — усе на «Мерседэсы» перасядзем. Мы павінны паставіць на месца пасярэднікаў і тых, хто сёння жыруе на сялянах і на людзях, якія займаюцца вытворчасцю. Гэта вельмі важна.

Нам трэба ўзмацніць дысцыпліну землекарыстання: мы яшчэ кепска ў многіх гаспадарках ставімся да зямлі. Але я вельмі рады, што 2500 фермераў, якія ў нас ёсць, ужо становяцца фермерамі. Вельмі шмат хто — я іх ведаю, я іх бачу — вядуць у найвышэйшай ступені культурную вытворчасць. І астатнія да гэтага падцягваюцца. Нарэшце фермеры зразумелі, што можна працаваць і зарабляць. Але тым не менш для сельскагаспадарчых кааператываў, калгасаў, саўгасаў непачаты край работы ў плане стаўлення да зямлі.

Пятае. Забяспечыць біябяспеку АПК. Нельга дапусціць завозу для гаспадарчага выкарыстання біялагічных аб'ектаў, якія могуць нанесці шкоду чалавеку і экасістэме. Але вельмі правільна нядаўна на сустрэчы з навукоўцамі сказаў наш кіраўнік акадэміі навук. Слухайце, папярэдзіў мяне, трэба, Аляксандр Рыгоравіч, не кідацца нам асабліва на гэтую экагаспадарку. Калі разумна весці гаспадарку і не перахімічыць, не перакідаць лішніх угнаенняў, а ў норму, тэхналагічна правільна, мы і пры гэтай сістэме можам атрымаць біялагічна чыстыя прадукты. Калі мы зараз рынемся усе на біялагічна чыстыя прадукты, а вы разумееце, хіміі няма, угнаенняў няма, таго няма, мы можам скаціцца на дзесяць цэнтнераў ураджайнасці, як ён вобразна сказаў. Я, вядома, не магу пад усім гэтым падпісацца, калі ў свеце ёсць попыт на біялагічна чыстую прадукцыю, я гэта падтрымліваю. Я настойваю на тым, каб на гэтым рынку на выездзе з Лагойскага тракта, «Валяр'янава» так званае, — хачу губернатара папярэдзіць, каб вы маю ідэю не загубілі, — каб там была чыстая фермерская і сельскагаспадарчая прадукцыя, і людзі прадавалі самі гэтыя прадукты, каб там было лепш, чым на Камароўскім рынку. Каб гэта быў альтэрнатыўны рынак, дзе папросту можа прыехаць фермер, селянін са сваёй прадукцыяй, але чыстай, і прадаць там гараджанам за добрую цану. Таму я не супраць чыстага земляробства, толькі глядзіце, каб мы сапраўды не скаціліся на ўраджайнасць у 10 цэнтнераў. Але мы пад кантролем трымаем сітуацыю, і гэтага ў нас не здарыцца. Забяспечыць неабходна вывучэнне і маштабаванне перадавога вопыту найлепшых прадпрыемстваў. Ёсць над чым працаваць у нас у сельскай гаспадарцы. Гэта адзін з пунктаў росту нашай эканомікі.

І жыллё, асабліва ў вёсцы. Я ўжо папярэджваў мінчан. Нам трэба сыходзіць ад будаўніцтва жылля празмернага ў Мінску. Нам трэба размяркоўваць прадукцыйныя сілы па ўсёй краіне, мы перанасялілі Мінск. Ужо зараз цяжка. Заторы і іншае. Калі мы будзем і далей за кальцавую дарогу пашыраць і сцягваць у Мінск не толькі з Беларусі нашых грамадзян, але і з-за мяжы сюды паехалі, мы захлынёмся. Калі мы разбудуем Мінск да другой кальцавой дарогі, мы захлынёмся.

У нас не будзе дзе людзям працаваць. Мы не створым столькі вытворчасцяў. Таму пайшлі па шляху стварэння гарадоў-спадарожнікаў. Смалявічы, Лагойск, Рудзенск і іншыя, якія мы развіваем. Там ёсць сучасныя аўтамабільныя дарогі, чыгункі, электрычкі запусцім, каб людзі маглі там жыць і на працягу 20—30 хвілін, ну максімум 40, прыехаць у Мінск на работу і з'ехаць. Менавіта ў гэтым кірунку трэба думаць і развівацца. Такая задача для мінчан пастаўленая. Ну а тыя, хто хоча будаваць прыватнае жыллё, я ўжо распарадзіўся. Там, дзе ёсць кавалачак зямлі, а іх мора, я лячу над краінай і іх бачу, якія сёння не выкарыстоўваюцца, — старыя хутары, старыя вёсачкі. Людзі цяпер шукаюць цішыню. Гэта вельмі дорага цэніцца, і будзе яшчэ больш. Заўсёды беларусам кажу: «Калі недзе можна купіць нядорага кавалак зямлі за 100—150 кіламетраў ад Мінска — купіце. Хай будзе. Потым прадасце. Вашым дзецям будзе за што вучыцца, лячыцца». Трэба, каб беларусам гэта засталося. Многія гэта пачулі. Ну добра, расіяне — гэта нашы людзі, але і іншыя, і ўкраінцы паехалі сюды, купляюць гэтую зямлю, будуюць там свае дамы. І асабліва гэта важна ва ўмовах каранавіруса. У вёсцы так не хварэюць, як у горадзе. І вы гэта ведаеце. Так, ёсць і там гэтая хвароба. Мы ж маем зносіны, дзеці прыязджаюць, прывозяць з Мінска і іншых гарадоў гэтую заразу ў вёску. Але я заўсёды прасіў: з Мінска, калі магчымасць ёсць, на дачу, асабліва восенню, адвязіце старых туды. Хай яны там пабудуць, перачакаюць гэтую бяду. Для будучыні гэта вельмі важна. І гэтыя кавалачкі зямлі, недзе на хутарах і далёка, практычна бясплатна трэба перадаваць людзям, хай яны будуюць там невялікія хаткі, жыллё, каб яны маглі туды летам паехаць, менш будуць па вуліцах боўтацца. У гэтым кірунку мы будзем дзейнічаць і будзем рэалізоўваць адпаведную праграму.

Што датычыцца цэнаўтварэння, таксама сказана нямала. Мы будзем кантраляваць гэты кірунак. Вазьміце, дапусцім, тарыфы па ЖКП. Пяць долараў плюс невялікі працэнт інфляцыі — усё. У год нельга больш павышаць.

Але ж у крамах разбой. І гэта нягледзячы на тое, што мы падключылі прафсаюзы і дэпутатаў. Людзі скардзяцца. Прашу вас, звярніце на гэта асаблівую ўвагу. Гэта, разумееце, гадавыя мэты: тарыфы, капітальна рамантуем колькі і гэтак далей. Але ёсць і сяроднетэрміновыя задачы, якія важна выканаць да 2025 года. Сярод іх — забеспячэнне беларусаў вадой пітной якасці на ўзроўні 100 працэнтаў. Чыстай вадой! Мы за гэтую пяцігодку Мінск поўнасцю, гэта самая вялікая праблема, забяспечым пітной вадой з падземных крыніц. Будзе пабудавана 800 станцый абезжалезвання па краіне і 300 водазаборных свідравін. Такім чынам, мы адыдзем ад спажывання вады з адкрытых крыніц.

Гэта галоўны, напэўна, залог нашага здароўя. Мы вельмі сур'ёзна прасунемся па замене ліфтаў. Будынкаў шмат, старыя ліфты. Новыя навучыліся рабіць у Магілёве на ліфтабудаўнічым. Мы прадаём вельмі шмат ліфтаў за межы краіны, таму што савецкіх клетак і дамоў звышдастаткова ўсюды. Ну і сваю краіну павінны забяспечыць. Ужо заменена дзесяць тысяч штук. Абновім яшчэ пяць тысяч адзінак і закрыем праблему.

Ну і добраўпарадкаванне двароў. У нас іх усяго каля 30 тысяч. Мы іх узялі на ўлік. У парадак прывялі 11 тысяч аб'ектаў. Кожны год, можа быць, з вашым удзелам і да 1000 двароў зробім і вырашым таксама гэтую праблему. Двор павінен аб'ядноўваць людзей тых дамоў, якія там жывуць.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Незалежнасць

Двор павінен быць дваром. Ну вядома, не муралы там трэба будаваць і невядома што ствараць, а для зручнасці людзей. Для таго каб вы не баяліся, выпусцілі дзіцятка ў двор, і не трэба за ім хадзіць. Двор павінен быць закрыты. Ніхто дзіця там не схопіць. Ніхто на яго не наедзе. Ну, ведаеце, як у вёсцы. Там ніхто не бегае за дзецьмі. А ў горадзе ў нас даводзіцца. Таму трэба ствараць вось гэтыя экасістэмы, калі можна іх так назваць, у дварах. Трэба вырашаць гэтыя канкрэтныя задачы.

Наступнае — дарогі. Мы прывялі ў парадак многія з іх. Мая была мара — злучыць Мінск з абласнымі гарадамі. Практычна ўсе злучаныя. Вось я хачу яшчэ ў паўночным кірунку (Полацк — Віцебск) пашырыць, дабудаваць дарогу. І ўсё.

Цяпер пастаўлена задача — мясцовыя дарогі. Да абласцей нармальна. Ад абласцей да раёнаў, ад раёнаў да аграгарадкоў трэба ў парадак прывесці дарогі. Гэтую праблему мы будзем вырашаць. Рамонт не менш як сем тысяч кіламетраў мясцовай сеткі і 50 кіламетраў — рэспубліканскай дазволіць у цэлым вырашыць за пяцігодку гэтыя пытанні. А таксама нам трэба будзе рэканструяваць і давесці да ладу 24 масты.

І пабудаваць нам трэба, губернатары ставяць пытанне, абходы вакол Віцебска, Магілёва і Полацка. Мы гэта ў найбліжэйшы час абавязкова зробім і разгрузім нашы гарады.

Рэзервы ў чыгуначных перавозках і авіязносінах будуць раскрытыя з пачаткам работы маштабных мультымадальных міжнародных комплексаў у парку «Вялікі камень» і «Брэміна-Орша». Яны пачнуць функцыянаваць у поўную сілу на працягу гэтай пяцігодкі.

Так, авіяцыі сёння няпроста. Але, можа быць, гэта дасць штуршок развіццю лаўкастарнай авіяцыі, можа быць, мясцовым аэрапортам, якія ў нас сёння не задзейнічаны. І гэта дасць штуршок развіццю рэгіёнаў. Яго стрыжнем стане палітыка павышэння прывабнасці жыцця, працы і бізнесу па-за межамі сталіцы і абласных цэнтраў. Асноўны прынцып: чым слабейшы патэнцыял тэрыторыі, тым больш стымулаў для развіцця.

У гэтай праграме мы вызначылі пяць асноўных узроўняў развіцця рэгіёнаў. І мы ўжо паспрабавалі вырашаць гэтыя праблемы.

Па-першае, 11 гарадоў, дзе жыве 80 тысяч і больш чалавек;

— адсталыя ў развіцці рэгіёны (іх каля 30);

— гарады-спадарожнікі;

— тэрыторыі, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай станцыі;

— асобыя эканамічныя зоны з пэўнымі льготамі.

Лідары росту — гэта гарады-васьмідзесяцітысячнікі. Па іх ужо шмат зроблена за папярэднія гады.

Вы памятаеце гэтую аршанскую эпапею. Але мы навучыліся, як працаваць з гэтымі гарадамі. Мы далі льготы па зямлі, маёмасці, падатках. І як вынік на Аршаншчыне пачалі працаваць 130 новых прадпрыемстваў. Вось па гэтым шляху трэба ісці, развіваючы 11 буйных гарадоў. Такія як Барысаў, Маладзечна, Баранавічы, Бабруйск, Полацк, вы гэтыя гарады ведаеце. Укласціся ў гэтай пяцігодцы трэба ў гэтыя гарады абавязкова.

Сёння прапанавана як мінімум па два-тры буйныя новыя праекты ў кожнай вобласці. Гэта было маё патрабаванне. У кожнай губернатар павінен бачыць два-тры буйныя аб'екты. Яны ёсць. Пралічана фінансаванне, як я казаў, будзем ведаць, што будзем рабіць.

Мы ў Мінску і абласных цэнтрах на плошчах дзяржпрадпрыемстваў будзем ствараць тэхнапаркі. Як я казаў, «Гомсельмаш», і, калі ласка, няхай абрастае «Гомсельмаш» дробнымі вытворчымі прадпрыемствамі, якія будуць дапамагаць рабіць дробязь і працаваць па імпартазамяшчэнні.

Мясцовыя рэсурсы. У малых гарадах, у сельскіх раёнах будуць развівацца праекты па перапрацоўцы мясцовых рэсурсаў. І такіх у кожным раёне будзе адзін-два.

Гэта таксама патрабаванне маё. Напрыклад, у Івацэвічах з'явіцца паўнавартасны мэблевы кластар на тысячу новых рабочых месцаў. На мяжы Гродзенскай вобласці ў Свіслачы будзе заснаваны дрэваапрацоўчы завод на 250 новых рабочых месцаў. На першым жа месцы пры гэтым — якасць жыцця насельніцтва. Гэта абавязкова.

Тым не менш чалавечы капітал — галоўны рэсурс краіны, на развіццё якога мы заўсёды знойдзем сродкі. Аднак які ён будзе, наш бюджэт, і колькі заробім, залежыць ад нас, ад сумленнасці, ад таго, як будзем плаціць падаткі.

Задача дзяржавы — зрабіць так, каб заплаціць падаткі было лёгка і зразумела, а падатковая нагрузка была справядлівая.

І ў сітуацыі прасунутай лічбавай краіны мы можам зрабіць так, што падаткавікі не будуць бегаць па прадпрыемствах. Можна гэта будзе зрабіць, як у вас модна казаць, — мышкай — клікнулі і сродкі пералічылі.

І падаткавікі будуць працаваць у анлайн-рэжыме са сваімі падаткаплацельшчыкамі. Вы разумець павінны, што лішніх грошай у бюджэце няма, хоць не магу сказаць, што беларусы, у адрозненне ад іншых, не навучыліся жыць па сродках. У грамадзяніна павінен быць выбар, мы яшчэ такіх выбараў у поўным аб'ёме не далі, каб укласці свае грошы. Гэта магчыма ў рамках паўнавартаснага фінансавага рынку.

Каштоўныя паперы арганізацый, дзяржаблігацыі, інвестыцыйныя фонды, крыптавалюты павінны стаць штодзённай задачай дзяржавы, для гэтага трэба стварыць празрыстыя правілы і ўмовы.

Асобны важны кірунак — гэта страхаванне. Тут таксама ў нас вельмі шмат работы, і мы ў гэтым кірунку будзем працаваць.

На вашых дыялогавых пляцоўках гучалі ініцыятывы аб тым, каб узмацніць залежнасць даходаў работнікаў ад фінансавага выніку прадпрыемства. Размеркаванне дывідэндаў або перадача ва ўласнасць часткі акцый патрабуе сумленнага заканадаўчага замацавання.

Але вы павінны пры гэтым памятаць: у Беларусі сёння няма і ніколі не будзе алігархаў, па меншай меры, пры нашай з вамі ўладзе. І кожны павінен атрымліваць за свой вынік адпаведна. Я не кажу, што ўсіх ураўнуем. Той, хто можа дзякуючы свайму таленту і здольнасцям зарабіць і атрымаць больш, хай атрымлівае. Але разбежкі велізарнай быць не павінна. Багаты — падтрымай дзяржаву, падтрымай бедных, падтрымай, каб не была ў 25 разоў розніца паміж беднымі і багатымі. Гэта страшна, гэта катастрофа, гэта будучы развал дзяржавы. Не магу сказаць, што наш прыватны бізнес, асабліва ў вытворчасці, паводзіць сябе дрэнна. Ён разам з намі, з дзяржавай, прайшоў усе этапы з краінай — ад станаўлення да развіцця. І сёння фарміруе палову нацыянальнага прадукту. Адпаведныя рашэнні Прэзідэнта спрыялі гэтаму.

У няпростым 2020 годзе ў асноўным вытворчы бізнес павёў раёнаў, і ходзяць, збіраюць даніну. Няўжо, часам я думаю, нашым вось гэтым іпэшнікам, айцішнікам, «тарбэчнікам» і іншым гэта трэба? Мы ж, у нас гэтага практычна няма, мы спыняем імгненна. Але некаторыя на гэтым нават хочуць пажыць добра, пажыраваць. Гэта ж не проста я выдумаў, гэта зноў жа з гэтага даследавання, мы глядзелі на грамадства, вывучалі яго настрой. Некаторыя, на жаль, так думаюць, але гэта нельга дапусціць. Я вас пераканаўча прашу: выкіньце гэта з галавы. Толькі справядліва, толькі сумленна жывучы ў гэтай краіне, мы можам жыць нармальна.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Іншага нам не дадзена. Людзі не пацерпяць ні карупцыі, ні алігархіі. А на базе гэтай страшнай карупцыі алігархія і вырастае. Нам сорамна будзе нашым ветэранам глядзець у вочы. Таму мы будзем кантроль ажыццяўляць там, дзе трэба, і па тых кірунках, якія трэба, абараняючы людзей і дзяржаву. Але і бізнес павінен быць у гэтым плане адказным і разумець нас.

Але самае галоўнае — нам трэба выключыць лішнюю бюракратыю.

Мы, вядома, усюды не пяройдзем на айфоны, смартфоны. Усё роўна чалавек будзе мець стасункі з дзяржавай. Трэба зрабіць усё, каб ён не крыўдзіўся, што мы занадта бюракратычныя. І гэта мы можам вырашыць. Гэта невялікая праблема.

Мы сёння звярнуліся да Закона «Аб дзяржаўнай службе». У найбліжэйшы час мы яго прымем. І там, як у ваенных, будзе адпаведны статут і кодэкс і патрабаванні да дзяржаўнага служачага. Так, ён будзе ўзняты на небывалую вышыню, але і патрабаваць з яго дзяржава будзе больш, чым з вайскоўцаў. Патрэбны аўтарытэтныя людзі ў кіраванні. У адваротным выпадку ніякіх камунікацый з грамадствам не будзе.

Трэба паглядзець на выхадцаў з сілавых структур, якія, вы ведаеце, да 50 гадоў звальняюцца са службы. Не трэба страчваць гэтых людзей. Хтосьці ў бізнесе сябе знаходзіць. Але гэта — дысцыплінаваныя адукаваныя людзі. Іх трэба таксама выкарыстоўваць і на дзяржаўнай службе. Думаю, азнаёміўшыся з новым законам, які мы прымем, яны абавязкова прымуць маю прапанову працаваць у дзяржаўных структурах. Дарэчы, мы ўжо гэта пачалі рабіць у пэўных органах улады.

Дыялогавыя пляцоўкі паказалі, што цікавасць грамадства да развіцця палітычнай сістэмы краіны і канстытуцыйнай рэформы як ніколі высокая.

Аднак перш чым Сход прыступіць да выпрацоўкі лёсавызначальных прапаноў, неабходна спакойна разабрацца, што адбываецца з намі зараз, якія глыбінныя працэсы ідуць у грамадстве і як мы на іх будзем рэагаваць.

Ведаеце, зноў з сацыялагічнага даследавання, нас людзі перасцерагаюць і пішуць наўпрост мне: «Не зламайце краіну». Мы зараз раскруцілі тэму новай Канстытуцыі. Вы ведаеце, гэта не новая тэма. І тое, што мяне папракаюць: «Вось, Лукашэнка, ён кажа, падманвае, ён не хоча ніякіх зменаў Канстытуцыі». Ды бог з вамі. Два з лішнім гады таму назад я даручыў рыхтаваць новыя праекты Канстытуцыі. Я ў пасланні Прэзідэнта народу і парламенту заявіў аб тым, каб у мяне на стале былі два праекты Канстытуцыі. Але, памятаеце, я казаў, што патрабаваў ад распрацоўшчыкаў асабістага подпісу пад кожным праектам, каб адказвалі за гэта. Адзін з палітолагаў — мне вельмі спадабалася нядаўна, калі мы прыбіралі ПДВ з лекаў — уносіў урад, — прапанаваў: «Трэба, — кажа, — некаторыя законы называць імёнамі распрацоўшчыкаў». Добрая прапанова... Каб людзі ведалі, хто прапаноўваў, хто прымаў. А так многія хочуць пераразмеркаваць паўнамоцтвы, а за ўсё каб адказваў, як і раней, кіраўнік дзяржавы, Прэзідэнт. Сёння я, а заўтра хтосьці іншы. Не, дарагія мае. Давайце пераразмяркоўваць паўнамоцтвы. Мы пачалі ўжо гэта рабіць: Прэзідэнт — урад, Прэзідэнт — парламент, губернатары — мясцовыя органы ўлады. Цэлы план на стале ў Прэзідэнта ляжыць. Вось пасля Усебеларускага народнага сходу мы працягнем больш інтэнсіўна гэта рабіць. Мы перададзім гэтыя паўнамоцтвы. Але толькі я б прасіў насельніцтва і вас, каб вы разумелі, што, пераразмеркаваўшы паўнамоцтвы, тыя, хто іх атрымаў, будуць прымаць рашэнні па іх і адказваць за іх.

Адзінства. Развіццё. Незалежнасць

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1—13)

Вы глядзіце, як атрымалася з гэтымі лекамі... Гэтыя дзесяць працэнтаў ПДВ, якія не плацілі яны, мы прыбіраем. Прапановы былі, прыбралі. Але запэўнілі, што за кошт цаны і іншых фактараў лекі не падаражэюць, асабліва той спектр лекаў, якія патрэбныя практычна кожны дзень. І зноў жа — з гэтага сацыялагічнага даследавання — мяне людзі папярэджваюць, ужо на тэлебачанне выскачыла праблема, што ўсё ж такі некаторыя лекі маюць тэндэнцыю да росту, некаторыя падаражэлі. Я арганізаваў праверку. Камітэт дзяржкантролю і адпаведныя дзяржструктуры падключаны, мы зараз паглядзім і на дзяржаўныя аптэкі, і на прыватныя. І пабачым, абгрунтаваны там гэты рост цэн ці не. Мала не падасца. Але я гэта да таго, што прынялі рашэнне — гэта паўнамоцтвы сапраўды ўрада, ну навошта Прэзідэнту іх цягнуць? А чаму вы мяне зараз папракаеце і прэтэнзіі зноў, і сацыялагічнае даследаванне, і ўсе стрэлы звернутыя ў Прэзідэнта? Так, людзі прывыклі, патрэбен час, каб адвыкнуць. Але трэба хутчэй адвыкаць. Таму што зноў з гэтага сацыялагічнага даследавання — людзі за перадачу паўнамоцтваў ад Прэзідэнта іншым структурам. Але людзі павінны разумець, што Прэзідэнт, вядома, па сігнале людзей умяшаецца, калі трэба, у гэты працэс, але гэта не яго будуць функцыі і паўнамоцтвы. Таму пераразмяркоўваць паўнамоцтвы мы будзем. Радыкальна будзем пераразмяркоўваць. Канстытуцыю — трэцюю ўжо, трэці варыянт мы падрыхтуем.

Адказваю на ваша пытанне прама.

На працягу гэтага года праект Канстытуцыі будзе гатовы, і ён будзе на працягу года абмеркаваны ўсенародна. А ў пачатку наступнага года як мінімум, я думаю, мы справімся, мы занясём яго на разгляд усенароднага галасавання. На рэферэндум.

Прыняўшы новую Канстытуцыю на працягу года, вы разумееце, асабліва юрысты, што пад новую Канстытуцыю нам прыйдзецца перафармаціраваць, перарабіць, па-народнаму кажучы, многія законы, прыйдзецца змяніць заканадаўчую базу. Я ўпэўнены, што мы гэта здольныя зрабіць на працягу наступнага года. І тады адказ на галоўнае пытанне — ну а што, ну а калі ён сыдзе, і яшчэ нешта. Гэтае пытанне вырашыцца. Але мы павінны гэта рабіць спакойна, не наламаць дроў, пра што нас папярэджваюць людзі. 60 з нечым працэнтаў, дзіўна для мяне было, катэгарычна заявілі — нягледзячы на тое што мы ўвесь час усюды гаворым, што трэба мяняць Канстытуцыю, — што яны супраць змены Канстытуцыі, што цяперашняя Канстытуцыя працавала і будзе працаваць. Зразумела, некаторыя людзі пабойваюцца, але я з гэтым не згодны. Канстытуцыю трэба мяняць. Мяняць, па-першае, таму, што такія паўнамоцтвы, якія ёсць сёння ў кіраўніка дзяржавы, у Прэзідэнта, вельмі цяжкія для чалавека, і не факт, што ў будучыні гэты чалавек прыйдзе да ўлады і вытрымае гэтыя паўнамоцтвы. Але самае небяспечнае, я заўсёды прыводжу вось гэты прыклад з мінулага. Ну а калі б яны захапілі ўладу і прыйшоў да ўлады адзін са збеглых ці пратэстуноў, сядзельцаў і іншых і атрымаў гэтую Канстытуцыю? Вы ж разумееце, які сцэнарый нам быў падрыхтаваны. Захоп улады, не атрымалася на выбарах — значыць, мяцеж, захапілі ўладу на суткі, пры гэтай Канстытуцыі дастаткова аднаго чалавека — прэзідэнт, які звяртаецца за мяжу, і тут з'яўляюцца замежныя войскі. Гэта ўсё законна, па Канстытуцыі. Я маю такое права звярнуцца ў любую краіну і будуць уведзены гэтыя войскі. А калі мы атрымаем такога прэзідэнта з такой Канстытуцыяй, што будзе? Таму ёсць надзённая неабходнасць распрацаваць новы праект Канстытуцыі, унесці яе на ўсенароднае абмеркаванне і прыняцце на рэферэндуме. Мы не можам без рэферэндуму змяніць тыя артыкулы Канстытуцыі, якія хочам змяніць.

Далей — палітычная сістэма. Шмат хто кажа аб палітычных партыях. А вы ведаеце, які давер, паводле гэтага маштабнага сацыялагічнага апытання да партый?

Не ведаеце? Ад трох да шасці працэнтаў. І гэта дрэнна. Мы не займаліся партыйным будаўніцтвам. І ў нас з 15, па-мойму, толькі тры партыі адпавядаюць. Гэта значыць, ёсць толькі тры партыі. А ўсе 15 лічаць сябе партыямі. Таму ў Канстытуцыі, вядома, будзе прадугледжаны гэты варыянт...

Трэба аддаць увагу пытанню партыйнага будаўніцтва.

І калі мы ўбачым рэальныя партыі, тады мы будзем казаць, што трэба абіраць парламент па прапарцыянальным спісе, мясцовыя Саветы трэба абіраць па прапарцыянальным спісе. Цяпер народ наогул не ўяўляе, чым хтосьці там займаецца. Таму аддае тры—шэсць працэнтаў партыям. Але партыі павінны быць. Так лягчэй будзе ўладзе функцыянаваць. Але для гэтага трэба падрыхтаваць грамадства. Грамадства павінна быць сталае. І трэба выдатна разумець... Вось гэтыя партыі. У іх ёсць свае погляды на жыццё, на развіццё, на вось гэтую праграму. І калі мы яшчэ па прапарцыянальным прынцыпе абяром парламент і туды паўнамоцтвы перададзім, трэба разумець, што вось гэтыя зверху — ад Алега Гайдукевіча, ад Карпенкі, ад Сокала ўніз пойдуць ідэі. І яны будуць у розумах людзей. І такім чынам мы па партыйным спісе непазбежна падзелім наша грамадства. Уявіце, калі мы гэта зробім у нясталым, непадрыхтаваным грамадстве. Што будзе? Будзе «мадней», чым летась.

Таму, дарагія мае, я за канстытуцыйную рэформу. На працягу года на дыялогавых пляцоўках усюды мы будзем гэта абмяркоўваць. Кожны крок па змяненні. Але цвёрда перакананы: наша краіна павінна заставацца прэзідэнцкай рэспублікай.

Меркаванні дэлегатаў

«Яскравы пасыл службовым асобам і ўсім беларусам»

«Некалькі гадзін даклада Прэзідэнта праляцела як пяць хвілін, — расказаў **ваенны камісар Лідскага раёна палкоўнік Віталій ДАКУЧАЕЎ.** — Вельмі натхняльнае выступленне. Сапраўды, гэта даклад кіраўніка дзяржавы і Галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі. Яскравы пасыл не толькі для службовых асоб, пра іх дзейнасць на найбліжэйшыя пяць гадоў, але і пасыл грамадзянам Беларусі, і не толькі на пяць гадоў, але і на далейшае.

Шмат было сказана пра армію, адназначна ў правільным кірунку. Пасля такога выступлення кожны на сваім месцы павінен задумацца пра будучае і рэалізоўваць тыя думкі і ідэі, якія прагучалі і яшчэ прагучаць на сходзе».

«Мы за Прэзідэнта, мы яго падтрымліваем»

«Вельмі яркае ўражанне ад выступлення Аляксандра Лукашэнкі, — пагадзілася **прадстаўніца Беларускага саюза жанчын, начальнік сакратарыята «ААБ Беларусбанка» Ала РАЙЦЭС.** — закрануты ўсе спектры дзейнасці нашай рэспублікі. Прэзідэнт быў вельмі эмацыянальны, вельмі шчыры, яго прамова выклікала толькі станоўчыя эмоцыі. Мы за Прэзідэнта, мы яго падтрымліваем і гатовыя ісці з ім да канца.

Як прадстаўніцы грамадскага аб'яднання мне былі блізкія тэмы моладзі, сям'і, сацыяльнай падтрымкі шматдзетных сем'яў. Беларускі саюз жанчын ажыццяўляе ўсе гэтыя ідэі.

Як прадстаўніцу банкаўскай сістэмы мяне цікавалі тэмы эканамічнага развіцця. Беларусбанк — самы буйны банк краіны, ён удзельнічае ў дзяржпадтрымцы вялікіх прадпрыемстваў, ва ўсіх дзяржаўных праграмах, таму мне было цікава, куды мы рухаемся, якія праекты будуць ажыццяўляцца ў найбліжэйшыя пяць гадоў».

«Бізнес быў пачуты»

«Даклад сапраўды дастаткова ўсёабдымны, моцны і вельмі цікавы, — падзялілася **дырэктар Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М. С. Куняўскага Жанна ТАРАСЕВІЧ.** — Для мяне было важна пачуць, што ў нас будзе з эканомікай, з развіццём прадпрымальніцтва, прыватнага сектара, новых тэхналогій. Лічу, што недасягальныя задачы не былі пастаўлены.

Рада, што прапановы бізнес-асацыяцый былі пачутыя. Спадзяюся, што размова на гэту тэму будзе працягнутая, што нашы праблемныя пытанні будуць адлюстраваны ў выніковых дакументах. Апошнім часам мы як саюз шмат працавалі ў сферы рэгіянальнага развіцця. Ставілі пытанне пра тое, што неабходна ствараць умовы для прыходу туды бізнесу, які будзе накіраваны на мясцовыя рэсурсы і рынак. І пра гэта я пачула, што добра.

Чаго я хацела б яшчэ? Я вельмі б хацела, каб бізнес прыйшоў у сацыяльную сферу. Не толькі дзяржава павінна несці на сваіх плячах за кошт падаткаплацельшчыкаў гэтую ношу. Сёння людзі ўжо могуць плаціць за паслугі і ў адукацыі, і ў медыцыне, і атрымліваць больш якасныя паслугі. Перашкаджае зарэгуляванасць гэтай сферы ў адносінах да ліцэнзавання, цэнаўтварэння. Навошта, напрыклад, рэгуляваць цану на цырконіевы зуб ці на спа-паслугі? Гэта ж не жыццёва важныя рэчы, гаворка аб прыгажосці. Бізнес прыходзіць туды, дзе яму выгадна. Мяркую, што гэтая тэма яшчэ будзе закранута на сходзе».

«Падабаецца цвёрдая пазіцыя нашага лідара»

«Выступленне кіраўніка дзяржавы пакінула вельмі моцнае ўражанне, — прызналася **намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама Таццяна ШЧАБЯРАКА.** — Як мы і чакалі, бо наш Прэзідэнт — вельмі моцны аратар, да таго ж, мы сёння пачулі шмат новага для сябе. Мне падабаецца цвёрдая пазіцыя нашага лідара. Ведаеце, часам нават дрыжыкі па целе прабягалі. Увогуле, вельмі цудоўна ўсё. Я задаволена. Была дэлегатам на пятым сходзе, цяпер — на шостым. Лічу, што такое веча, сапраўды ў няпростых умовах, вельмі патрэбнае і карыснае. Я курырую эканоміку ў нашым рэгіёне, таму з асаблівай увагай слухала выказванні пра развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, жыллёвага будаўніцтва, пра дэмаграфічную сітуацыю».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗРАБІЦЬ СВОЙ ВЫБАР

Пасля даклада Прэзідэнта, які доўжыўся больш за чатыры гадзіны і закрануў пытанні сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця краіны, выступілі дэлегаты. З трыбуны Вялікай залы Палаца Рэспублікі ў першы дзень слова ўзялі дэлегаты з усіх рэгіёнаў. Выказаць сваё бачанне будучыні краіны змаглі не толькі заслужаныя дзеячы разнастайных сфер эканомікі, але і тыя, хто толькі пачынае свой працоўны шлях.

Першае выступленне на шостым Усебеларускім народным сходзе прысвяцілі праблематыцы развіцця прамысловасці на прыкладзе аднаго з гігантаў галіны — Мінскага

аўтамабільнага завода. **Генеральны дырэктар МАЗа Валерый ІВАНКОВІЧ** адзначыў, што сёння 90 % пасажырскай тэхнікі на дарогах Беларусі — вытворчасці завода. Праграмай развіцця краіны да 2025 года пастаўлена задача росту прадукцыйнасці працы і рэальнага заробку ў прамысловасці на 30 %, павелічэння экспарту тавараў і паслуг — звыш 50 мільярдаў, паставак высокатэхналагічнай прадукцыі да двух мільярдаў долараў.

«Асаблівасцю машынабудавання Беларусі з'яўляецца тое, што яго вытворчы патэнцыял значна большы за ёмістасць унутранага рынку. Таму 90 працэнтаў прадукцыі мы прадаём на экспарт, — адзначыў Валерый Іванковіч. — Пандэмія адкрывае ўнікальныя магчымасці, калі можна заняць новыя нішы».

Летась МАЗ паставіў на экспарт прадукцыі ў два разы больш, чым у 2015 годзе, але, як адзначыў выступовец, завод мог дасягнуць большага. Валерый Іванковіч падкрэсліў, што сыходзіць пакаленне савецкіх інжынераў і канструктараў, але за імі ідуць маладыя, перспектыўныя работнікі.

«Пытанне стымулаў мае першараднае значэнне. Асноўныя стымулы — гэта заробкі і жыллё. Без гэтага нам не стварыць новыя дынастыі», — паведаміў дэлегат. Ён адзначыў, што аўтобусы сёння — самая запатрабаваная прадукцыя МАЗа. А электробусы і дызельныя аўтобусы трэцяга пакалення вырабляюцца толькі пад заказ.

«Магутнасці, на жаль, абмежаваныя. І мы ўжо не можам задаволіць заяўкі ўсіх нашых кліентаў. У снежні мінулага года адкрылі новае зборачнае прадпрыемства электратранспарту ў Жодзіне, але і гэтага сёння мала. Таму распрацаваны праект новага сучаснага аўтобуснага завода. Ён дазволіць нам удвоіць вытворчыя магутнасці, павысіць тэхналагічнасць вытворчасці аўтобусаў трэцяга і ў перспектыве чацвёртага пакаленняў. Праект акупіцца за чатыры гады пасля ўводу ў эксплуатацыю», — заявіў Валерый Іванковіч.



У сваім выступленні на Усебеларускім народным сходзе **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ** заявіў, што Беларусь варта разглядаць не як мост паміж чымсьці, а як сваю зямлю і свой бераг.

«Мы тут жывём і ведаем, як і куды заўтра весці сваю краіну. Каб унесці больш яснасці, МЗС бярэ на сябе абавязак распрацаваць новую канцэпцыю знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь», — паведаміў Уладзімір Макей.

Міністр прызнаў, што Беларусь сёння знаходзіцца на геапалітычным разломе паміж Усходам і Захадам. У сутыкненні гэтых розданакіраваных буйных сусветных гульцоў, на яго думку, галоўная прычына ўнутрыпалітычных праблем у краіне.

«Мы працягваем знаходзіцца ў эпіцэнтры сусветных падзей і інтарэсаў глабальных гульцоў і сёння. Што далей і які выхад? На мой погляд, замацаванае ў Канстытуцыі імкненне Беларусі да нейтралітэту не адпавядае бягучай сітуацыі. У сучасным глабалізаваным свеце, пранізаным інтэрнацыяналізацыяй, нейтралітэту ў яго класічным разуменні не існуе. Прапануецца ўлічыць дадзены аспект у рабоце над папраўкамі ў Асноўны закон нашай краіны», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Ён адзначыў, што Беларусі і далей неабходна падтрымліваць сваю шматвектарную знешнюю палітыку. Але такі курс не выключае перавагі нейкага аднаго кірунку.

«Расія заўсёды была, ёсць і будзе нашым стратэгічным партнёрам, таму на ўзаемадзеянне з гэтай краінай і дзяржавамі постсавецкай прасторы будзе накіраваны асноўны вектар нашага развіцця. Больш за тое, выкажу, магчыма крамольную рэч у парадку дыскусіі, прапанову мэтазгоднасці карэкціроўкі экспартнай формулы «траціна-траціна-траціна» ў сучасных рэаліях. Аб'ектыўна, у знешнеэканамічнай дзейнасці любой дзяржавы краіны-суседкі і тым больш магутныя, маюць пераважнае значэнне», — сказаў міністр, прапанаваўшы сканцэнтраваць палову экспарту на вектары постсавецкіх краін.

Па яго словах, Беларусь выступае за партнёрства Еўрасаюза і ЕАЭС, што неабходна не толькі для развіцця эканомік, але і мінімізацыі канфліктнага патэнцыялу.

«Мы зыходзім з таго, што не можа быць дамінуючай сілы ні ў рэгіёне, ні ў свеце. У кожнай дзяржавы павінен быць голас і яго павінны чуць», — падкрэсліў кіраўнік галоўнага знешнепалітычнага ведамства.

Іван ТЭРТЭЛЬ, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі адзначыў, што Беларусь заўсёды была і будзе аб'ектам разнапланавых памкненняў, а з падзей лета—восені мінулага года, калі сціх інфармацыйны шум, у астатку бачна няўдалая спроба мяцяжу. Па яго словах, Беларусь — адна з нямногіх краін, якая выстаяла ва ўмовах рэалізацыі самага жорсткага сцэнарыя.

«Як бы ні хацелася закулісным гульцам, пік пратэснай актыўнасці пройдзены, краіна вярнулася да нармальнага жыцця і ідзе па шляху далейшага развіцця. Але ўрокі мінулага і даныя, якія паступаюць у КДБ з разнастайных крыніц, у тым ліку ад нашых замежных партнёраў, сведчаць пра тое, што час расслабляцца не прыйшоў», — дадаў старшыня КДБ.

Паводле яго інфармацыі, на тэрыторыі замежных краін сфарміраваны структуры, у якіх пры фінансавай падтрымцы фондаў і спецслужбаў канцэнтруюцца збеглыя, прайдзісветы і здраднікі.

«Найбольш значныя падрыўныя цэнтры функцыянуюць у Вільнюсе і Варшаве. Дакладна ўстаноўлена, што ў іх укладзены значныя фінансавыя рэсурсы, якія павінны быць безумоўна адпрацаваны. У іншым выпадку, спагнанне з боку куратараў будзе жорсткае», — заявіў Іван Тэртэль.

Як ён адзначыў, некаторыя з прадстаўнікоў дэструктыўных сіл пераступаюць «чырвоную рысу», пераходзячы да тэрору. У КДБ ёсць інфармацыя аб намеры здзяйснення актаў тэрарыстычнай скіраванасці на тэрыторыі краіны.

«У цэлым падкрэсліваю, яны гатовыя на ўсё, на любыя злачынствы, не шкадуюць ні жанчын, ні дзяцей», — дадаў кіраўнік ведамства.

Іван Тэртэль адзначыў, што спецслужбы і праваахоўнікі краіны маюць неабходныя рэсурсы і кампетэнцыі для аховы грамадзян.

«Упэўнены, што тыя, чые прозвішчы вядомыя, але па зразумелых прычынах мною не называліся, зараз уважліва мяне слухаюць. Хацеў бы папярэдзіць іх і замежных куратараў, што мы будзем дзейнічаць жорстка, у адпаведнасці з міжнароднай практыкай па стрыманні падобнага роду злачынстваў, працуючы на папярэджанне», — сказаў старшыня КДБ.

ВЕНІЯМІН, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі выказаў думку, што да пандэміі каранавіруса дадалося ўзмацненне палітычнай нестабільнасці ў свеце і сённяшнія падзеі нагадваюць духоўны і сацыяльны крызіс напярэдадні Першай сусветнай вайны.

«Сёння беларускае грамадства стаіць на ростанях. Нам варта зрабіць выбар і гэты выбар неабходна зрабіць самастойна і адказна, кіруючыся не эмоцыямі і запаламі, а розумам і ўсведамленнем памылак, што здзейснены», — заявіў мітрапаліт.

Ён адзначыў, што Беларуская праваслаўная царква падтрымлівае палажэнні праграмы развіцця краіны, накіраваныя на ўзмацненне традыцыйнага інстытута сям'і, сацыяльнай падтрымкі людзей, захаванне спрадвечных каштоўнасцяў народа, удасканаленне духоўна-маральнага выхавання маладога пакалення.

Алена БОГДАН, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» падкрэсліла ў сваім выступленні, што ў эпоху шматкратнага росту інфармацыйных патокаў чалавек найбольш уразлівы і безабаронны. «Мы бачым, як спрабуюць раскалоць наша грамадства. Даходзіць да адкрытага ганення, абраз у дачыненні да вядомых спартсменаў, артыстаў, нават звычайных людзей і іх дзяцей. Толькі за тое, што яны з'яўляюцца патрыётамі, цэняць мір і спакой, ганарацца дасягненнямі нашай краіны», — адзначыла Алена Богдан.

Яна лічыць, што ў дадзенай сітуацыі задача дзяржавы — абараніць такіх людзей, перш за ўсё дзяцей. «Мяркую, што трэба зрабіць больш жорсткім заканадаўства ў адносінах да тых, хто ўцягвае нашых грамадзян у экстрэмізм, заклікае да правапарушэнняў, займаецца булінгам», — заявіла Алена Богдан.

Кіраўнік саюза жанчын не бачыць прычын саромецца або асцерагацца такіх мер — вопыт суседніх краін сведчыць, што калі гаворка заходзіць пра бяспеку грамадзян, пра здароўе, меры прымаюцца неадкладна і дастаткова жорстка.

Таксама падчас выступленняў дэлегатаў у першы дзень уздымаліся пытанні маладзёжнай палітыкі, работы прамысловага комплексу і сельскай гаспадаркі.

Марыя ДАДАЛКА.
Фота БелТА.

«На наступны год мяркуем утрымаць цэны на сацыяльна значныя тавары ў межах 4,9 працэнта»

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пра гэта паведаміў **Андрэй КАРТУН, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю,** каментуючы даклад Прэзідэнта на VI Усебеларускім народным сходзе.

«Прэзідэнт ключавую ўвагу звярнуў на кантроль за цэнаўтварэннем. Гэта значыць, што неабходна сумеснымі намаганнямі не дапускаць іх неабгрунтаванага росту, а на выклікі рэагаваць аператыўна. Што мы і робім. Мінулы год паказаў: неабходна мець інструмент хуткага рэагавання. Напрыклад, у першую чаргу мы абнавілі пералік сацыяльна значных тавараў. Гэта нам дазволіла збіць ажыятаж, які ўзнікаў у сферы цэнаўтварэння з-за поўнага закрыцця граніц і праблем з рухам тавараў. Дадзены інструмент паказаў сваю эфектыўнасць. Але гэта не значыць, што неабходна татальна ўсё рэгуляваць, — адзначыў Андрэй Картун. — Ужо на заключнай стадыі намаганні па выхадзе маніторынгу ў рэжым анлайн. Гэта дапаможа фактычна кожны дзень бачыць, што адбываецца з цэнамі. Прычыны змен цэн могуць быць разнастайныя — мы сочым за ўсім ланцужком іх утварэння ад вырабу тавараў сельгасвытворцамі да паступлення на паліцы магазіна.

Што датычыцца ролі прафсаюзаў у рэгуляванні цэн, у такім фармаце мы ўзаемадзейнічаем ужо трэці год, падключыліся да яго Савет Рэспублікі, дэпутацкі корпус. Мы стварылі экспертны савет, з якім штомесяц сустракаемся, абмяркоўваем праблемы ў цэнаўтварэнні, выпрацоўваем сумесныя рашэнні.

Наша краіна дасягнула пэўных вынікаў у абмежаванні інфляцыі. У цэлым у апошнія пяць гадоў (за выключэннем мінулага) інфляцыя была каля пяці працэнтаў. На наступны год паставілі задачу — утрымаць цэны на сацыяльна значныя тавары (так званы індэкс цэн) у межах 4,9 працэнта. Задача няпростая, але мы будзем на яе арыентавацца і адпаведна будаваць сваю палітыку.

У дакладзе Прэзідэнта асноўныя для нашага ведамства, зразумела, былі задачы па кантролі за цэнамі. Кіраўнік дзяржавы даў сігнал, што мы ўсё правільна робім, і расслабляцца нельга.

Другі момант для ведамства — імпартазамяшчэнне. Калі паглядзець структуру спажывецкага імпарту, то каля 40 працэнтаў у нас займае крытычны імпарт — тыя тавары, якія мы не ствараем і не можам замяніць. Тут ёсць поле для дзейнасці, і Прэзідэнт на гэтым акцэнтуе ўвагу».

«Адна з задач — развіць добраахвотнае назапашвальнае страхаванне пенсій»

Пра гэта паведаміў **Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны.** Ён расказаў пра планы рэфармавання пенсійнай сістэмы на будучую пяцігодку:

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Задачы, якія стаяць на будучую пяцігодку, вядомыя і закладзены ў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця. У першую чаргу гэта забеспячэнне 40 працэнтных суадносін сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй заработнай платы.

Мы разумеем, што сёння ў краіне амаль 2,5 мільёна пенсіянераў. Для многіх з іх пенсія з'яўляецца адзінай крыніцай даходаў. Мы павінны падтрымаць пенсіі на такім узроўні, каб гэтыя людзі маглі дазволіць сабе купіць і адзенне, і прадукты, і аплаціць камунальныя паслугі.

Наступная задача — узмацненне дыферэнцыяцыі ў памерах пенсіі. Якраз у рамках падрыхтоўкі да Усебеларускага народнага сходу паступалі зусім супрацьлеглыя прапановы. Ёсць пенсіянеры, якія прапаноўваюць ажыццяўляць пераразлік пенсій не на нейкі працэнт усім пенсіянерам, а на пэўную фіксаваную суму. Калі пайсці такім шляхам, мы проста звядзём дыферэнцыяцыю ў памерах пенсіі на нішто. І фактычна памер пенсіі не будзе залежаць ад стажу і заробкаў у перыяд работы. Мы разумеем: чалавек, які мае больш доўгі стаж і больш высокі заробак, павінен атрымліваць больш высокую пенсію.

Наша задача на бягучую пяцігодку — павялічыць дыферэнцыяцыю. За гэта выступаюць не толькі пенсіянеры, але і працоўныя, якія выплачваюць узносы і жадаюць, каб іх пенсія ў будучым залежала ад іх укладаў.

Яшчэ адзін кірунак, яго агучваў Аляксандр Лукашэнка, гэта ўвядзенне добраахвотнага назапашвальнага страхавання. Нават не ўвядзенне, а яго пашырэнне, паколькі ўжо каля 30 гадоў у Беларусі існуе праграма такога страхавання. Работнік і яго наймальнік могуць пэўныя сродкі накіроўваць у страхавыя арганізацыі, дзе на індывідуальным рахунку застрахаванага акумулююцца гэтыя сродкі, інвестуюцца ў эканоміку. Інвестыцыйны даход дзеліцца паміж усімі застрахаванымі асобамі. Пры наступленні страхавога выпадку (дасягнення пенсійнага ўзросту) чалавек мае права атрымаць да дзяржаўнай дадатковую пенсію.

Сума, якую работнік накіроўвае на добраахвотнае страхаванне, вызваляецца ад падаходнага падатку. Наймальнік таксама мае льготы па выплаце ўзносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і ў Белдзяржстрах.

На жаль, такая форма не атрымала распаўсюджання. У нас сёння застрахаваных менш чым пяць працэнтаў працоўных. І адна з задач — развіць гэты кірунак у наступную пяцігодку, пра гэта казаў Прэзідэнт».

Марыя ДАДАЛКА.

Беларусь мае ўласныя адказы на новыя геапалітычныя выклікі

Прыклад супрацьдзеяння пандэміі каранавіруса прадэманстраваў іх паспяховасць, лічыць кіраўнік Аналітычнага цэнтра ЕсооМ Сяргей МУСІЕНКА.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Калі кіраўнік дзяржавы гаворыць ад сябе, ад душы, не па напісанаму, становіцца відавочна, што ён наймацнейшы палітолаг у краіне, — пракаментаваў ён «Звяздзе» выступленне Прэзідэнта на VI Усебеларускім народным сходзе. — Ён адчувае тэму, знаходзіць дакладныя параўнанні, зразумелыя вобразы, не плоскасныя, бо тут спасылкі і на ваенную стратэгію, і на літаратурную спадчыну, дзякуючы чаму ўзнікае шматмерная гісторыя. Прэзідэнт канкрэтна гаворыць пра тое, што цяпер адбываецца.

Сітуацыя з пандэміяй — яскравае таму сведчанне. Мы часта не ўяўляем (і гэта недапрацоўка, на мой погляд, прэсы) каранціннае шаленства ў свеце. Калі людзі не могуць выйсці з дому, каб не паведаміць у паліцэйскі ўчастак пра мэту свайго выхаду. Да таго ж вызначаны пэўны пералік, куды выйсці можна. Калі пры спазненні на 15 хвілін штраф у 800 еўра з кожнага, хто знаходзіцца ў машыне.

Я дасылаю сваім сябрам і знаёмым фатаграфіі з нашага гандлёвага цэнтра «Галерэя Мінск», дзе натоўпы людзей, а яны мне дасылаюць фота з пустых гандлёвых цэнтраў у Берліне або зачыненых цэнтраў у Ізраілі. Крамы крокавай даступнасці аказаліся дазволеныя, а гіпермаркеты зачынены. Праўда, чэргі ў першыя — на некалькі гадзін — за хлебам. Мы гэтага не бачым і не разумеем.

Паліцыя збівае і затрымлівае людзей, якія ў адзіноце гуляюць каля мора. Такія выпадкі адбываюцца ў Іспаніі, Францыі, Ізраілі. Гэта тлумачыцца «новай рэальнасцю». Свет цяпер кіруецца праз каранцін, праз медыцынскія патрабаванні. Цяпер, паверце, будзе вайна ковідных пашпартоў: «Ты якой прышчапіўся вакцынай: кітайскай? Рускай? Не, у нас толькі еўрапейская прызнаецца». Да гэтага ўсё ідзе...

Вірус стаў геапалітычным фактарам. На сусветным рынку аслабеў уплыў нафты і газу, і трэба было ўвесці нейкі рэгулятар. Вось яго ўвялі, ён спадабаўся.

Цяпер многія сусветныя фармацэўтычныя кампаніі спрабуюць схаваць узровень даходаў, якія яны атрымалі за гэты час: уводзяць у афшоры, мінімізуюць, выкарыстоўваюць для гэтага спецыяльныя тэхналогіі. Справа ў тым, што адбыўся вялізны рост іх даходаў. Тое ж самае — з прыватнай медыцынай. Сярэдні чэк чалавека, які лячыўся ад ковіду летам у Нью-Ёрку, — 30 тысяч долараў, у Еўропе — 10,5 тысяч еўра (у Германіі). У некаторых людзей страхоўкі на Захадзе не хапае, каб пакрыць гэтыя выдаткі. Калегі дасылалі мне фатаграфіі людзей, якіх супраць іх волі паліцыя забірае разам з хуткай дапамогай у бальніцу.

Гэта страшная псіхатропная зброя. Ва ўсіх краінах вялізны рост колькасці зваротаў па псіхіятрычную дапамогу. Людзі баяцца выйсці на вуліцу, карыстацца грамадскім транспартам, яны баяцца адзін аднаго. І ёсць тыя, хто ўжо нічога не баіцца, яны ладзяць дэманстрацыі ў Італіі, Іспаніі, Францыі, Германіі...

Мы жывём у іншай рэальнасці: у нас усё працуе, мы падтрымліваем бізнес і сябе. Уявіце псіхалагічны стан чалавека, які прасядзеў дома дзевяць месяцаў, выходзіў толькі па дазволе і жыў пад страхам вялізных штрафаў. Гэта што? Новае жыццё, да якога нас прывучаюць? Атрымліваецца, так. І калі пра наш прыклад кажуць у Аўстрыі з трыбуны парламента, гэта можа некаму не спадабацца.

Швецыю зламалі. Наш знаёмы шведскі прафесар пра артыкул у англійскай газеце аб тым, што Швецыя быццам бы прызнала сваю мадэль памылковай, сказаў, што гэта не так — ніхто такога не прызнаваў, маўляў, пераклалі са шведскай няправільна. Нявыгадная інфармацыя замоўчваецца.

Мы на першым этапе выкарысталі мадэль, якая была распрацавана ў савецкі час. Тады стратэгію распрацоўвалі грамадзянскія эпідэміёлагі разам з ваеннымі, якія вучыліся па падручніках, дзе быў сабраны вопыт барацьбы з эпідэміямі ў Сярэдняй Азіі, чорнай воспы ў Маскве. Старая савецкая школа, якую мы захавалі не толькі ў эпідэміялогіі, адыграла станоўчую ролю. Галоўнае, што мы не дапусцілі палітызацыі дадзенага працэсу. Наша сістэма, з ФАПамі на вёсцы (чаго няма ў Італіі і Францыі), вытрымала гэтую нагрузку, бо дазволіла папярэдзіць вялізны наплыў хворых людзей адначасова ў адну бальніцу.

Першым часам мы не дапрацавалі ў медыя. Справа ў тым, што таму, хто вырашае новую, складаную задачу, як правіла, не да размоў. Але праз некаторы час гэта было выпраўлена. І гэта таксама наш геапалітычны адказ свету. І цяпер СААЗ кажа, што беларуская мадэль барацьбы з каранавірусам жыццяздольная і паказвае добрыя вынікі. А на першым этапе яны рэкамендавалі ўвесці каранцін і ўсім схавацца.

Пандэмія — гэта новая форма псіхаэмацыянальнага і фізічнага ўздзеяння. Не кожная сістэма аховы здароўя і не кожны сямейны бюджэт яго вытрымлівае. Мы, дзякаваць богу, выкарыстоўвалі іншую мадэль, і я думаю, што на Усебеларускім народным сходзе гэты курс будзе ўхвалены, бо ён адлюстроўвае і меркаванні людзей, і кіраўніцтва краіны. Нягледзячы на пэўныя ваганні, якія ў нас ёсць у ліберальна-эканамічным блоку, фінансавым, мы гэты курс захаваем».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

12 лютага 2021 г. № 5 (590)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ІНІЦЫЯТЫВА

Фота БелТА.

ВЫХАВАННЕ НА ЎЛАСНЫМ ПРЫКЛАДЗЕ

Сёлетняя зіма нарэшце парадавала нас снегам, але ж азадачыла пытаннем: хто яго будзе аператыўна прыбіраць?

Жыхары дома па вуліцы Сурганава, 15 у Магілёве не чакаюць, калі да іх дойдзе дворнік і пачысціць снег каля пад'ездаў. Па-першае, яны добра ведаюць, што дворнікаў у іх шостым ЖЭУ дакладна не хапае, па-другое, яны не прывыклі жыць у неахайнасці. У іх пад'ездах чысцей, чым у кватэрах некаторых. Ну як яны могуць махнуць рукой на тыя гурбы снегу, што ляжаць каля ўвахода ў дом? Выйшлі і... атрымалі задавальненне. Гэта ж цудоўна, калі разам, ды на свежым паветры, ды дзеля прыгажосці.

— І гэта не адзіны дом на нашым участку, дзе жывуць добрасумленныя людзі, — заўважае **начальнік ЖЭУ № 6 Маргарыта ЦІТОВА.** — Не менш старанныя жыхары дома № 28 па вуліцы Арлоўскага, дамоў 21 і 55 па вуліцы Якубоўскага, дома № 25 па вуліцы Бакуніна. Прыкладаў шмат. У асноўным ініцыятыву ў свае рукі бяруць шматдзетныя і пенсіянеры. Мы, у залежнасці ад пары года, забяспечваем іх рыдлёўкамі, расадай, грунтам. І яны наводзяць прыгажосць каля сваіх пад'ездаў. Асабліва актыўна народ даглядае сваю маёмасць пасля рамонтаў, кожнаму хочацца бачыць свой двор, дом, пад'езд чыстым і дагледжаным.

(Заканчэнне на 18-й стар.)

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Сяргей РАЧКОЎ:

«Беларусь заўсёды старанна ўзважвае палітычную і эканамічную мэтазгоднасць і дзейнічае выключна ў нацыянальных інтарэсах»

Што прынесла «арабская вясна» Егіпту, ды і наогул усяму Блізкаму Усходу? Якія агульныя рысы «каляровых рэвалюцый» і падзей жніўня-2020 у Беларусі? Ці павінна наша краіна прыняць адэкватныя меры рэагавання ў адказ на санкцыі Еўрасаюза? На гэтыя пытанні мы папрасілі адказаць старшыню Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАЧКОВА.

(Заканчэнне на 19-й стар.)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Новы фармат камунікацыі

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.

Прыём прайшоў у Калодзежскім сельскім выканаўчым камітэце Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці і быў арганізаваны ў новым фармаце, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента. Акрамя традыцыйнай формы звароту задаць пытанне віцэ-спікеру Савета Рэспублікі можна было таксама падчас анлайн-трансляцыі ў сацыяльных сетках.

— Такі фармат дазваляе грамадзянам атрымаць яшчэ адзін канал камунікацыі з прадстаўнікамі ўлады, а таксама пачуць адказы на падобныя пытанні, з якімі звяртаюцца заяўнікі, — адзначыў Анатоль Ісачанка.

На думку намесніка старшыні Савета Рэспублікі, прадстаўнікам улады неабходна больш актыўна выкарыстоўваць інтэрактыўныя сэрвісы і сацыяльныя сеткі ў рабоце з людзьмі.

Падчас прыёму да парламентарыя звярнуліся жыхары вёскі Ведрыца Чэрвеньскага раёна з просьбай падключыць электрычнае ацяпленне, бо існуючая паветраная лінія была пабудавана яшчэ ў 1968 годзе і не адпавядае тэхнічным умовам для падключэння электрычнага ацяплення. Таксама быў разгледжаны шэраг зваротаў, якія датычыліся бытавых праблем грамадзян.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

На карысць будучыні

Старшыня пярвічнай арганізацыі ГА «БСЖ» Сакратарыята Савета Рэспублікі абрана ў склад праўлення і прэзідыума рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

У Мінскай гарадской ратушы прайшла VII Рэспубліканская справаздачна-выбарчая канферэнцыя ГА «Беларускі саюз жанчын». У мерапрыемстве бралі ўдзел старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, прадстаўнікі аб'яднаных, абласных і Мінскай гарадской арганізацый. На сходзе падвялі вынікі работы саюза за тры папярэднія гады, вызначылі асноўныя кірункі далейшай дзейнасці арганізацыі. Таксама быў прыняты шэраг кадравых рашэнняў.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, старшыня першаснай арганізацыі ГА «БСЖ» Сакратарыята Савета Рэспублікі Тамара Лявончык абрана ў склад праўлення рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын». Акрамя таго, на пасяджэнні праўлення ГА «БСЖ» прынята рашэнне аб яе абранні ў склад прэзідыума рэспубліканскага саюза.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Выслухаць і дапамагчы

СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ правёў прамую лінію.

Заяўнікі звярталіся па пытаннях, якія іх хвалююць. Гаворка ішла аб садзейнічанні ў працаўладкаванні, зямельных адносінах, аказанні паслуг арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, сямейных адносінах і іншых тэмах.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, па ўсіх зваротах парламентарыем дадзены вычарпальныя тлумачэнні. Пытанні, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, узяты на кантроль і накіраваны для разгляду кампетэнтным дзяржаўным органам.

Новыя падыходы да разгляду зваротаў

ПЕРШУЮ сёлета прамую лінію правёў старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ.

Што хвалявала людзей? Скардзіліся на пралікі гарадской службы жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў зімовы перыяд, у прыватнасці, на несвоечасовую і недастаковую ўборку снегу ў дварах і на вуліцах, зацягнутыя капітальныя рамонты шматкватэрных жылых дамоў, недахопы ў рабоце іншых гарадскіх службаў.

Выказваліся і канкрэтныя прапановы пра далейшае стварэнне безбар'ернага асяроддзя ў Мінску, больш камфортнае ўладкаванне прыпынкаў грамадскага транспарту, нават пра барацьбу з такой небяспечнай інвазіўнай і агрэсіўнай раслінай, як баршчэўнік. І гэта ўзімку. Гаварылі пра павышэнне пенсій для шматдзетных маці, ільготы для людзей з інваліднасцю, вырашэнне іншых сацыяльных пытанняў.

Зразумела, усе звароты разгледзяць, іх аўтарам будуць дадзены канкрэтныя адказы.

Дарэчы, літаральна напярэдадні гэтай прамой лініі Андрэй Бугроў удзельнічаў у выязным пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі. Яно прайшло на базе адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска, дзе размова таксама ішла і аб выніках работы дэпутатаў Мінгарсавета са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у мінулым годзе. Тады старшыня гарсавета казаў пра эфектыўнасць разгляду праблемных па змесце пісьмаў з выездам на месца, абавязковай сустрэчай з дзеючымі асобамі непаразуменняў ці канфліктаў, бо інакш складана атрымаць аб'ектыўную інфармацыю.

— А ці былі падчас гэтай прамой лініі падобныя звароты? — цікаўлюся ў старшыні.

— Такіх, якія б запатрабавалі тэрміновага ўмяшання з выездам на месца, дык не. Але нагода наведаць адзін адрас з'явілася. Жанчына паскардзілася на асацыяльныя паводзіны жыхароў суседняй кватэры. Там амаль штодзень лаянка, скандалы, п'янкі, бойкі. Нейкі прытон утварыўся. На заўвагі змяніць паводзіны жанчына чуе ад суседзяў пагрозы ў свой бок. Яна кажа, што некалькі разоў звярталася ў міліцыю, але дзеянні яе супрацоўнікаў пакуль не далі выніку — часовае зацішша і зноў за старое. Я паабяцаў у найбліжэйшы час асабіста прыехаць і вывучыць сітуацыю на месцы,— гаворыць Андрэй Бугроў.

У час пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі прагучалі заўвагі ў бок адміністрацыі Маскоўскага раёна і гарсавета, сенатарамі былі выказаны парады і рэкамендацыі па паляпшэнні работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб. Андрэй Бугроў лічыць гэтыя прэтэнзіі справядлівымі, а сустрэча была карысная, насіла дзелавы і канструктыўны характар. Пашыранае пасяджэнне Прэзідыума ў пэўным сэнсе дало імпульс членам гарсавета шукаць новыя формы ўзаемадзеяння з жыхарамі сталіцы.

Па яго словах, з той размовы гарсаветам зроблены адпаведныя высновы. У практыку разгляду зваротаў насельніцтва плануецца ўкараненне новых падыходаў. Ужо ў лютым мяркуецца распачаць так званы «Адзіны дзень дэпутата»: у пэўны дзень усе дэпутаты гарсавета ў сваіх выбарчых акругах будуць праводзіць прыёмы людзей. На думку Андрэя Бугрова, гэта дазволіць палепшыць работу са зваротамі, больш аператыўна разам з раённымі адміністрацыямі Мінска разбірацца ў сутнасці пытанняў і адпаведна хутчэй прымаць канкрэтныя рашэнні.

Леанід ТУГАРЫН.

ВЫХАВАННЕ НА ЎЛАСНЫМ ПРЫКЛАДЗЕ

Фота БелТА.

Мастак Аксана КРАСНОВА і жыхарка дома № 15 Таццяна ШАРАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 17-й стар.)

Дом № 15 па Сурганава доўгі час быў без капрамонту, жыхары вельмі перажывалі. І летась мы зрабілі за іх кошт тры пад'езды з чатырох. Наша таленавітая мастачка Аксана Краснова так прыгожа размалявала пад'езды, што іншыя жыхары мікрараёна таксама сталі запрашаць нас у свае дамы. А натхняе суседзяў па доме № 15 на Сурганава 38-гадовая шматдзетная маці Таццяна Шараева, якая з'яўляецца там старшай. Дзякуючы такім аднадумцам як яна, у нас разам атрымліваецца зрабіць вельмі шмат. Побач з дарослымі шчыруюць і дзеці. Не дзіўна, што потым ніхто нічога не ламае і не размалёўвае. Падлеткі з дзяцінства бачаць іншы прыклад.

У тэму

СКАЗАНА — ЗРОБЛЕНА!

Старшыня Мінгарсавета дэпутатаў Андрэй Бугроў заклікаў гараджан далучыцца да расчысткі сваіх двароў ад снегу. Найбольш актыўных абяцаюць заахвоціць.

— Сябры, адным з элементаў мясцовага самакіравання, з'яўляецца аператыўнае вырашэнне праблем сваіх дваровых тэрыторый! — напісаў на сваёй старонцы ў адной з сацыяльных сетак старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Бугроў. Ён уласным прыкладам паказаў, як гэта патрэбна рабіць: у снежнае надвор'е народны абраннік на вечарах пасля рабочага дня расчышчае свой двор ад снегу.

Так рабіць ён заклікае кожнага, хто неабыякавы да свайго жылля, двара, горада.

Дарэчы, аб такім падыходзе ішла гаворка на гэтым тыдні падчас даклада старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміра Кухарава Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку. Кіраўнік дзяржавы выказаўся адназначна: *«У такія надзвычайныя моманты трэба, каб людзі самі падключаліся да прыбірання»*.

Ён адзначыў, што дзейнасць у вялікім горадзе па ачыстцы снегу неабходна арганізоўваць. У прыклад самаарганізацыі прывёў моладзь, валанцёраў, ваенных, якія падключыліся там, дзе трэба. Па словах Прэзідэнта, гараджане павінны разумець: *«Канешне, трактарам ці МАЗам мы туды заедзем калісьці, але колькі гэта будзе каштаваць? А грошай лішніх няма ў сувязі з той сітуацыяй, што складваецца»*.

Таму лагічна, што кіраўнік дэпутацкага корпуса сталіцы не застаўся ўбаку ад карыснай справы:

— Паважаныя сябры, мінчане! У сувязі з чарговымі цяжкімі ўмовамі надвор'я, як старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, мінчанін, ваш сусед, звяртаюся да ўсіх неабыякавых жыхароў з просьбай прыняць удзел ва ўборцы снегу на прыдамавых тэрыторыях! — напісаў ён.

Кіраўнік прадстаўнічай улады сталіцы адзначыў, што камунальнымі службамі сталіцы ва ўзмоцненым рэжыме працягваюцца работы па ўборцы і вывазе снегу ў дварах. Ачысткай сталічных вуліц ад снегу займаюцца 660 адзінак спецтэхнікі і 690 прыбіральшчыкаў тэрыторый. У той жа час у Мінску пражывае больш за два мільёны чалавек, прыгадаў ён.

— Гэта наш горад, наша з вамі сталіца! Зрабіць пасільны ўнёсак у карысную справу можа кожны жыхар нашага горада! Сказана — зроблена!

Акрамя таго, старшыня Мінгарсавета дэпутатаў анансаваў пэўнае заахвочванне найбольш актыўных удзельнікаў. Для гэтага ён прапанаваў дасылаць свае фатаграфіі прыбраных двароў, пешаходных дарожак, тратуараў, прыступак і гэтак далей у фармаце «да і пасля» на электронную пошту: gorsovet.priem@minsk.gov.by.

— Найбольш актыўныя жыхары нашай сталіцы будуць адзначаны гарадскім Саветам, — паабяцаў Андрэй Бугроў.

Нэлі ЗІГУЛЯ, Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

Таццяна РУНЕЦ: СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

«Жорсткая падатковая дысцыпліна — важная ўмова эканамічнай бяспекі краіны»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах прыняла ўдзел у пасяджэнні калегіі Міністэрства па падатках і зборах, на якім абмяркоўваліся вынікі работы падатковых органаў па выкананні даходнай часткі бюджэту летась і задачы на бягучы год, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Так, за 2020 год падатковыя інспекцыі забяспечылі паступленне даходаў у бюджэт краіны ў памеры 27,07 мільярда рублёў, што складае 100,9 працэнта да планавых прызначэнняў кансалідаванага бюджэту, у тым ліку ў рэспубліканскі бюджэт — 10,5697 мільярда рублёў (101,1 %), у мясцовыя бюджэты — 16,5027 мільярда рублёў (100,7 %). Звыш плана ў бюджэт паступіла 231,3 мільёна рублёў.

Разам з тым сенатар звярнула ўвагу кіраўніцтва прафільнага міністэрства і ўсіх удзельнікаў пасяджэння на шэраг праблемных пытанняў, над вырашэннем якіх трэба больш актыўна працаваць сёлета.

Гаворка ў першую чаргу ідзе аб зніжэнні даходаў кансалідаванага бюджэту. Тэмп росту да ўзроўню 2019 года ў супастаўных цэнах склаў 91,7 %, у тым ліку рэспубліканскага бюджэту — 86,2 %, мясцовых бюджэтаў — 95,6 %.

Па-другое, за 11 леташніх месяцаў прыбытак да падаткаабкладання ў цэлым па краіне знізіўся на 44,6 %, а колькасць арганізацый, якія маюць чыстую страту, узрасла на 23 %.

Акцэнтавала ўвагу сенатар і на агульнай суме запазычанасці арганізацый і фізічных асоб рэспублікі па падатках (зборах) у бюджэт, якая па стане на 1 студзеня 2021 года склала 128,7 мільёна рублёў. Агульная сума запазычанасці суб'ектаў гаспадарання, якія знаходзяцца ў працэсе ліквідацыі (спынення дзейнасці), па падатках, зборах (пошлінах), пенях і адміністрацыйных штрафах на гэтую ж дату склала 633,8 мільёна, у тым ліку па падатках, зборах — 438,8 мільёна рублёў.

Акрамя таго, за 2020 год прызнана безнадзейным доўгам і спісана запазычанасць па плацяжах у бюджэт 2 368 плацельшчыкаў у памеры 367,9 мільёна рублёў.

Таццяна Рунец таксама адзначыла, што бюджэт на 2021 год мае сацыяльную накіраванасць. Таму асаблівае значэнне набывае наяўнасць у дастатковай колькасці бюджэтных рэсурсаў для своечасовага выканання фінансавых абавязацельстваў перад грамадзянамі і грамадствам у цэлым.

— У сувязі з гэтым важным элементам нацыянальнай бяспекі будзе забеспячэнне жорсткай падатковай дысцыпліны і дзейсны кантроль за паступленнем іншых абавязковых плацяжоў у бюджэт, — рэзюмавала яна.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

ШАГ — КРОК НАСУСТРАЧ МОЛАДЗІ

Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Сяргей СІВЕЦ сустрэўся са сталічнымі школьнікамі.

У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве з навучэнцамі сярэдняй школы № 117 Заводскога раёна сталіцы ў рамках праекта «Школа актыўнага грамадзяніна», паведамілі ў профільнай камісіі.

Падчас мерапрыемства парламентарый расказаў пра паўнамоцтвы Савета Рэспублікі і асаблівасці яго заканадаўчай дзейнасці як верхняй палаты беларускага парламента.

Для навучэнцаў арганізавалі экскурсію па музеі Савета Рэспублікі. Напрыканцы сенатар адказаў на пытанні моладзі і пажадаў навучэнцам далейшых поспехаў у вучобе.

Развіццё рэгіёна і маніторынг цэн на базавыя тавары

Сенатар Сяргей АНЮХОЎСКІ сустрэўся з працоўным калектывам прадпрыемства «Бабруйскагрэмаш».

На сустрэчы ў фармаце дыялогу абмеркавалі ключавыя аспекты Усебеларускага народнага сходу: работнікі расказалі, чаго яны чакаюць ад маштабнага форуму.

У гутарцы таксама закранулі пытанні, якія датычацца заканатворчай дзейнасці сенатара, рэалізацыі Дэкрэта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях», налічэння пенсій і падліку працоўнага стажу, крэдытных праграм на будаўніцтва або набыццё жылля, тэрмінаў заканчэння дарожна-рамотных работ у пятым мікрараёне Бабруйска і іншыя тэмы.

«Беларусь заўсёды старанна ўзважвае палітычную і эканамічную мэтазгоднасць і дзейнічае выключна ў нацыянальных інтарэсах»

Егіпту пагражаў голад

— Сяргей Анатолевіч, вы, як ніхто іншы, можаце ацэньваць наступствы «каляровых рэвалюцый» — узначальваючы дыпмісію ў Егіпце, вы былі сведкам падзей «арабскай вясны» ў гэтай краіне. Скажыце, вынік быў варты таго?

— Калі адказаць коратка — не варты. Вынікам «каляровай рэвалюцыі» можа стаць толькі адно — знішчэнне краіны ці яе значны адкат у развіцці прыкладна на 10—15 гадоў. Іншага, як паказвае практыка, не бывае.

Дарэчы, гэта вельмі хутка зразумелі самі егіпцяне. Яны ледзь не страцілі сваю дзяржаву. Толькі дзякуючы ўзброеным сілам, якія падтрымала копцкая царква, егіпецкаму народу ўдалося спыніць падчас «каляровай рэвалюцыі» (якой, дарэчы, споўнілася 10 гадоў) разбурэнне дзяржавы, вярнуць яе на свецкі шлях развіцця пры глыбокім шанаванні ісламскай рэлігіі і павазе насельніцтва, якое шануе копцкія хрысціянскія рэлігійныя каштоўнасці.

Але цана захавання старажытнай егіпецкай дзяржавы была каласальная! У выніку «каляровай рэвалюцыі» загінула каля тысячы чалавек, паранена больш за пяць тысяч. Здарыўся сур'ёзны палітычны крызіс: краіна засталася без кіраўніцтва і парламента. Было прыпынена членства Егіпта ў Афрыканскім саюзе і Лізе арабскіх дзяржаў. У гэты перыяд некаторыя арабскія краіны паспрабавалі выкарыстаць сітуацыю, якая склалася ў Егіпце, і пазбавіць яго лідарства ў Лізе, у тым ліку перанесці штаб-кватэру гэтай уплывовай міжнароднай арганізацыі з Каіра ў сталіцу Катара, а таксама перадаць пасаду генеральнага сакратара Лігі, якую заўсёды займаў прадстаўнік Егіпта, Саудаўскай Аравіі.

Варта адзначыць, што пратэстоўцы патрабавалі барацьбы з беспрацоўем, павелічэння заработнай платы, вырашэння праблем недахопу жылля, вырашэння пытання з ростам цэн на прадукты харчавання, свабоды слова і павышэння ўзроўню жыцця. Пасля «каляровай рэвалюцыі» здарылася ўсё наадварот. Егіпет панёс значныя эканамічныя страты. Рост ВУП знізіўся з васьмі працэнтаў да менш чым аднаго працэнта, егіпецкі фунт дэвальваваўся ў чатыры разы, золатавалютныя рэзервы скараціліся на 40 працэнтаў, беспрацоўе дасягнула ўзроўню 30 працэнтаў (сярод моладзі — 50 працэнтаў). Рэзка ўпалі даходы ад турызму і Суэцкага канала — асноўных крыніц паступлення замежнай валюты, неабходнай для фінансавання імпарту і, у першую чаргу, закупкі пшаніцы. Краіне пагражаў голад.

Егіпет пачаў апускацца ў цемру тэрору і беззаконня. Па патрабаванні пратэстоўцаў было ліквідавана Міністэрства бяспекі. Падчас пратэстаў тысячы злачынцаў збеглі з месцаў зняволення. Вынікам гэтага стаў рэзкі рост узроўню злачыннасці, пачасціліся выпадкі згвалтаванняў і выкрадання

(Заканчэнне. Пачатак на 17-й стар.)

дзяцей багатых бацькоў з мэтай выкупу. Рэвалюцыя паспрыяла ўзнікненню канфлікту на Сінайскім паўвостраве з ісламісцкімі баевікамі, які перарос у бесперапынныя ваенныя дзеянні.

Сітуацыю з бяспекай у краіне пасля «каляровай рэвалюцыі» магу праілюстраваць, абапіраючыся на свой уласны вопыт. На працягу некалькіх гадоў пасля рэвалюцыйных падзей я, як пасол Беларусі, наведваў рэгіёны Егіпта выключна пад аховай супрацоўнікаў службы бяспекі, узброеных аўтаматамі АК-47, і асабістых целаахоўнікаў. Так егіпецкі ўрад забяспечваў маю бяспеку.

«Арабская вясна» каштавала Блізкаму Усходу больш за 600 мільярдаў долараў

— У нядаўнім мінулым вы былі прадстаўніком Рэспублікі Беларусь у Лізе арабскіх дзяржаў. Калі ў цэлым даваць ацэнку падзеям, што адбываліся ў рэгіёне, іх асноўнай мэтай была відавочна не барацьба за дэмакратычныя каштоўнасці на Блізкім Усходзе...

— Барацьба за дэмакратычныя каштоўнасці з'яўляецца ключавым інструментам прасоўвання краінамі Захаду сваіх нацыянальных інтарэсаў, у аснове якіх ляжыць імкненне падпарадкаваць іншую краіну, прымусіць яе абслугоўваць заходнія дзяржавы, ісці ў фарватары іх знешняй палітыкі. Як правіла, пад прыкрыццём барацьбы за дэмакратычныя каштоўнасці ідзе выцягванне эканамічных рэсурсаў з краін Блізкага Усходу. Пры гэтым іх тэрыторыя выкарыстоўваецца для размяшчэння ваенных баз.

У гэтым кантэксце хачу згадаць «міратворчае» выступленне былога прэзідэнта ЗША Барака Абамы ў Каірскім універсітэце ў чэрвені 2009 года, у якім ён заклікаў умацоўваць мір на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы. Той жа Барак Абама праз два гады падтрымаў «арабскую вясну», якая ўвяла краіны гэтага рэгіёна ў грамадзянскую вайну, тэрор, разгул злачыннасці, палітычную нестабільнасць і турбулентнасць. Па даных Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, «арабская вясна» каштавала Блізкаму Усходу больш за 600 мільярдаў долараў ЗША.

Асаблівасць «беларускай» версіі «каляровай рэвалюцыі» — работа па дэзынтэграцыі грамадства

— Ці можна правесці аналогію паміж падзеямі «арабскай вясны» і жніўнем 2020 года ў Беларусі? Метады і інструменты ўплыву на людзей былі даволі падобныя.

— Безумоўна, аналогія паміж гэтымі падзеямі ёсць: яны арганізоўваліся па лякалах «каляровых рэвалюцый». Калі «арабскую вясну» называлі твітэр-рэвалюцыяй, то тое, што адбываецца ў нашай краіне, можна вызначыць як спробу рэалізаваць телеграм-рэвалюцыю. Падчас пратэстаў ужываліся агульныя метады арганізацыі пратэсных акцый: дэманстрацыі, шэсці, флэшбомы, забастоўкі, лакальныя тэракты, шырока выкарыстоўваліся сацыяльныя сеткі для арганізацыі і каардынацыі ўсіх супрацьпраўных дзеянняў. Арганізатары ўздзейнічалі на падсвядомасць людзей і іх эмоцыі шляхам падману, фэйкаў, маніпулявання інфармацыяй.

Асаблівасцю падзей у Беларусі стала актыўнае знешняе ўмяшанне ва ўнутраныя справы, працяглая своечасовая падрыхтоўка пратэсных дзеянняў, іх буйное знешняе фінансаванне. Пасля правалу брутальнага бліцкрыгу арганізатары паспрабавалі ўжыць тактыку, па іх словах, мірных акцый, падчас якіх здзяйсняліся жорсткія напады ўдзельнікаў на праваахоўнікаў. Яшчэ адна асаблівасць «беларускай» версіі «каляровай рэвалюцыі» — работа па дэзынтэграцыі беларускага грамадства з выкарыстаннем пагроз, хейтрыда, дэананімізацыі сілавікоў і нязгодных.

— Як старшыні профільнай Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі, вам напэўна былі зразумелыя наступствы вулічных пратэстаў. Што неабходна зрабіць дзяржаве, каб мінімізаваць падобныя выклікі, якія ставяць пад пагрозу нацыянальную бяспеку краіны?

— Не толькі як старшыні профільнай Пастаяннай камісіі, але і як непасрэднаму сведку наступстваў «арабскай вясны», мне было відавочна, што калі б нашы праваахоўныя органы не спынілі вулічныя пратэсты 10—12 жніўня 2020 года, краіна магла б скаціцца да грамадзянскай вайны, страты суверэнітэту і сваёй тэрытарыяльнай цэласнасці.

Упэўнены, што ў адрозненне ад арабскіх краін, якія перажылі «каляровыя рэвалюцыі», устойлівасць нашай краіне забяспечыла дзяржаўная палітыка апошніх 25 гадоў, накіраваная на паступальнае эканамічнае і сацыяльнае развіццё, стварэнне годных умоў жыцця, у першую чаргу, у сферы занятасці, пенсійнага забеспячэння, даступнасці якаснай адукацыі і аховы здароўя. Не выпадкова па індэксе чалавечага развіцця, паводле даных ААН, Беларусь уваходзіць у склад 50 высокаразвітых краін свету.

Каб мінімізаваць выклікі, якія ставяць пад пагрозу нацыянальную бяспеку краіны, неабходна, на мой погляд, рэалізоўваць меры па трох прыярытэтных кірунках: мадэрнізаваць эканоміку і вырашаць задачы сацыяльнага развіцця; умацоўваць прававарадак і сістэму праваахоўных органаў; актуалізаваць ідэалагічную работу з насельніцтвам у мэтах фарміравання грамадзянскасці, патрыятызму і высокай палітычнай культуры. Асаблівую ўвагу трэба аддаваць інфармаванню людзей і стварэнню сучаснай сістэмы, якая забяспечвае інфармацыйную бяспеку.

Акрамя таго, падзеі 2020 года выявілі яшчэ адзін аспект, які патрабуе значнай увагі. Нашы адукацыйныя ўстановы павінны не толькі займацца перадачай маладому пакаленню сучасных ведаў, але і актыўна ўдзельнічаць у дзейнасці па фарміраванні грамадзян, адказных за лёс сваёй краіны, па выхаванні сапраўдных патрыётаў.

У нас ёсць уласныя прыярытэты і нацыянальныя інтарэсы

— Спробы ўмяшання іншых дзяржаў ва ўнутраныя справы нашай краіны былі, ёсць і будуць. Ці існуюць механізмы супрацьстаяння агрэсіўнаму ўплыву?

— На жаль, Беларусь не па ўласным жаданні была ўцягнутая ў сур'ёзныя геапалітычныя гульні. Спроба рэалізацыі ў нашай краіне сцэнарыя «каляровай рэвалюцыі» з'яўляецца доказам высокіх ставак у гэтым проціборстве. На дзяржаўную палітыку Беларусі хочуць паўплываць як з Захаду, так і з Усходу. У кожнага геапалітычнага гульца — свае мэты і інтарэсы ў дачыненні да Беларусі. Аднак у нас ёсць уласныя прыярытэты і нацыянальныя інтарэсы, якія адпавядаюць жыццёвым памкненням беларускага народа — мірна жыць на сваёй зямлі, будаваць суверэнную дзяржаву, мець добрыя адносіны з суседзямі, сябраваць з тымі, хто хоча сябраваць з намі.

Папярэдні год быў беспрэцэдэнтны па колькасці спробаў умяшання іншых краін у нашы ўнутраныя справы. Толькі па лініі заканадаўчых органаў замежных дзяржаў і Еўрапейскага парламента было прынята больш за дзесяць рэзалюцый і законапраектаў па Беларусі на аснове аднабаковай і палітызаванай інфармацыі пра сітуацыю ў нашай краіне. Савет Рэспублікі не пакінуў без жорсткага адказу ні адзін дакумент замежных парламентарыяў антыбеларускай накіраванасці. Мы лічым непрымальным умяшанне ва ўнутраныя справы нашай краіны ў парушэнне Статута ААН. На маю думку, агрэсіўнаму знешняму ўплыву можа супрацьстаяць толькі моцная дзяржава і адзінства беларускага народа. Не выпадкова 2021 год абвешчаны Годам народнага адзінства.

Зараз у Нацыянальным сходзе распрацоўваюцца новыя законапраекты, якія будуць спрыяць супрацьдзеянню спробам як унутраных, так знешніх дэструктыўных сіл разбурыць беларускую дзяржаву.

Наш адказ

— Наколькі ўвядзенне санкцый Захаду ў дачыненні да беларускіх прадпрыемстваў можа паўплываць на нашу эканамічную бяспеку? І ці можа Беларусь у сваю чаргу ўводзіць контрсанкцыі ў адносінах да замежных брэндаў і заходніх кампаній?

— Вядома, увядзенне санкцый у дачыненні да асобных беларускіх прадпрыемстваў — непрыемнае развіццё сітуацыі. Гэта не спрыяе падтрыманню канструктыўных міждзяржаўных адносін, стварае перашкоды для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, у тым ліку гандлёвага. Што датычыцца згаданых абмежаванняў, наўрад ці гэта можа стварыць сур'ёзную пагрозу эканамічнай бяспецы нашай краіны. Яны, хутчэй, выкарыстоўваюцца як рычаг ціску на нас і сігнал для змены сваіх паводзін з намі. Але такія спосабы зносін з Беларуссю не прыносяць жаданых вынікаў.

У арсенале знешнепалітычных сродкаў Беларусі контрсанкцыі не значацца. У нас выкарыстоўваюцца меры ў адказ рэагавання на недружалюбныя дзеянні замежных дзяржаў, прадпрыемстваў або міжнародных структур. Практыка паказвае, што яны не меней дзейсныя, чым эканамічныя санкцыі. Іх эфектыўнасць пацвердзіў вопыт асобных краін і міжнародных структур. Таму лепш не пераадольваць чырвоную рысу і выбудоўваць адносіны з Беларуссю на аснове канструктыўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

З іншага боку, наша краіна мае магчымасць карэктаваць сваю знешнеэканамічную палітыку з улікам санкцыйных дзеянняў асобных дзяржаў, у тым ліку ўносіць змены ў пералік прыярытэтных знешнегандлёвых партнёраў. Так, цяпер аналізуюцца магчымасці перанакіравання беларускіх грузапатокаў, уключаючы нафтапрадукты і калійныя ўгнаенні, з партоў Літвы ў парты Расіі. Гэта звязана з грубым умяшаннем Літвы ва ўнутраныя справы Беларусі і можа стаць зваротнай рэакцыяй на недружалюбную палітыку балтыйскай краіны ў адносінах да нашай дзяржавы, якая нанясе сур'ёзную фінансава-эканамічную шкоду Літве.

Вызначаючы спосабы рэагавання на санкцыйную палітыку асобных краін, беларускі бок заўсёды старанна ўзважвае палітычную і эканамічную мэтазгоднасць і дзейнічае выключна ў сваіх нацыянальных інтарэсах.

Гутарыла
Вольга АНУФРЫЕВА.

МІНІ-ПАЛІГОНЫ І ЛЯСНЫЯ ПРАСЕКІ

Актуальныя праблемы навядзення парадку на зямлі і папярэджання наступстваў прыродных з'яў абмеркавалі на пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама

ДНЯМІ на пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама разгледзелі шырокі спектр пытанняў, якія датычацца навядзення парадку на зямлі. Гэтыя праблемы пастаянна ў полі зроку як прадстаўнічай, так і выканаўчай улады рэгіёна. Гэтым разам асаблівы акцэнт быў зроблены на ўпарадкаванні палігонаў цвёрдых бытавых адходаў.

Несанкцыянаваныя звалкі ў сельскай мясцовасці

— Летась органы Мінприроды выявілі ў Брэсцкай вобласці больш за 1,7 тысячы выпадкаў несанкцыянаванага размяшчэння адходаў. Гэта, дарэчы, на 60 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе, — паведаміў **намеснік старшыні камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей ШЫЛІНЧУК.** — Часцей за ўсё такая сітуацыя фіксуецца ў сельскай мясцовасці. Вясковыя людзі, на жаль, вельмі часта вывозяць адходы самастойна і пакідаюць іх дзе прыйдзецца: на закрытых і рэкультываваных палігонах, а то і на краі лесу ці поля.

Значыць, трэба ўдасканальваць работу па санітарнай ачыстцы населеных пунктаў, установы кантэйнераў, стварэнні сцыянарных пляцовак для збору смецця — зроблена выснова.

У рэгіёне вядзецца работа па скарачэнні міні-палігонаў цвёрдых бытавых адходаў, але іх колькасць па-ранейшаму застаецца самай вялікай у краіне. Зараз у вобласці налічваецца 121 міні-палігон. Больш за ўсё іх у Пінскім, Лунінецкім, Драгічынскім раёнах. Летась былі рэкультываваны 33 такія палігоны, сёлета запланавана рэкультываваць 27 аб'ектаў.

Новыя праекты і пустыя ўчасткі

Таксама на тэрыторыі вобласці 29 палігонаў цвёрдых бытавых адходаў, чатыры з якіх закрытыя і не эксплуатуюцца. Цалкам зрасходавалі свой рэсурс палігоны ў Ганцавіцкім, Іванаўскім, Івацэвіцкім, Столінскім раёнах. Патрабуецца будаўніцтва новых картаў захавання адходаў на палігонах для Брэста, Баранавіч, Пінска.

— Цяпер у вобласці з адходаў вымаюць больш за 27 працэнтаў другасных матэрыяльных рэсурсаў, — адзначыў **генеральны дырэктар абласнога ўпраўлення ЖКГ Аляксандр МАКСІМЧУК.** — Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у краіне. Работа будзе працягвацца. Плануецца рэалізаваць праект па рэканструкцыі сартавальнай перагрузачнай станцыі ў Баранавічах коштам у 5,9 мільёна рублёў. Магутнасць станцыі будзе павялічана да 74,8 тысячы тон адходаў. Для рэканструкцыі палігона плануецца прыцягнуць 6,5 мільёна еўра крэдытных рэсурсаў Сусветнага банка.

Вядома, што будучае чысціні зямлі, бяспекі яе нетраў напрамую залежыць ад аб'ёму перапрацоўкі таго, што чалавек кожны дзень апускае ў сметніцу. Цяпер яшчэ дабаўляюцца мільёны масак і іншых сродкаў аховы аднаразовага карыстання, пластыкавых флаконаў ад антысептыкаў, другіх прадметаў, колькасць якіх у разы павялічылася з прычыны пандэміі. Усё гэта стварае дадатковую пагрозу для зямлі, вады, паветра, значыць, паўстаюць дадатковыя задачы для збору і перапрацоўкі.

Яшчэ адно рашэнне выканкама датычыцца навядзення парадку з зямельнымі ўчасткамі ў садовых таварыствах. Многія з іх гадамі не выкарыстоўваюцца, зарастаюць бур'яном. Таму будзе праведзена іх інвентарызацыя і вызначаны далейшы лёс.

Напрыклад, летась за невыкарыстанне і неасваенне зямель у грамадзян забралі 488 участкаў, з якіх 161 быў выдзелены для будаўніцтва і абслугоўвання дома, 327 — для садаводства, агародніцтва і вядзення дапаможнай гаспадаркі. Акрамя таго, юрыдычныя асобы пазбавіліся 17 зямельных участкаў, ІП — трох, фермерскія гаспадаркі — 517 гектараў зямлі з тых жа прычын.

Прынятыя меры разам са зносам сельскагаспадарчых аб'ектаў і пустуючых дамоў у сельскай мясцовасці дазволілі за год прыцягнуць у гаспадарчае абарачэнне 1306 гектараў зямель. У тым ліку 254 гектары вызваліліся пасля раскарчоўкі старых садоў, 992 гектары — у выніку асваення зямель, якія раней не выкарыстоўваліся. Усё гэта, несумненна, спрыяе навядзенню парадку на зямлі.

Дызель-генератары

Пасяджэнне праходзіла ў дзень, калі яшчэ не ўсе наступствы цыклону «Ларс» былі пераадоленыя. Таму сітуацыю абмеркавалі з прыцягненнем спецыялістаў і прадстаўнікоў раёнаў, якія найбольш пацярпелі. На Брэстчыну абрынуліся снегапады, якіх даўно не бачылі ў рэгіёне.

Першы намеснік старшыні аблвыканкама Валерый РЭБКАВЕЦ адзначыў, што ў многіх месцах не аказалася

ў запасе спраўных перасоўных электрастанцый, хоць яшчэ ў 2013 годзе, пасля цыклону «Хаўер», такія задачы былі пастаўлены кожнаму раёну. Усяго ж святло прапала ў 13 раёнах вобласці. Часта провад абрывалі пры падзенні дрэвы. У асобных вёсках у цемры аказаліся не толькі жылыя дамы, але і школы, і фермы.

Вырашана забяспечыць дызель-генератарамі ўсе раённыя прадпрыемствы электрасетак у дастатковай колькасці і правесці трэніроўкі па іх выкарыстанні, каб пазбегнуць падобных праблем на будучае. Як высветлілася, не ўсе наяўныя генератары аказаліся гатовыя да работы ў экстрэмальных умовах.

А яшчэ прынята рашэнне пашыраць лясныя прасекі. У большасці выпадкаў адключэнні электрычнасці звязаны з наліпаннем мокрага снегу на провад і падзеннем дрэў на лініі электраперадачы. **Генеральны дырэктар РУП «Брэстэнерга» Сяргей ШЭБЕКА** паведаміў, што лясныя прасекі на асобных участках ліній электраперадачы будуць істотна пашыраныя. Летась гэта работа праведзена на 230 гектарах лесу. І апошнія падзеі паказалі, што не было ніводнага выпадку падзення дрэў на лініі на тых участках, якія былі пашыраны.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара. Здымкі носяць ілюстрацыйны характар.

КАРЫСНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

ЦІ ВЫКІДВАЦЬ ТАБЛЕТКІ Ў СМЕЦЦЕ?

Кантэйнеры для пратэрмінаваных лекаў з'явяцца ў аптэках і паліклініках Мінска

ГЭТА адзін з канкрэтных вынікаў работы дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета, якія аддаюць пастаянную ўвагу своечасовай і правільнай утылізацыі бытавых і цвёрдых адходаў, арганізацыі іх раздзельнага збору і наступнага выкарыстання ў якасці другаснай сыравіны.

Пра распрацоўку новых падыходаў у гэтай справе неаднойчы летась гаварыў прадстаўнікам СМІ, у прыватнасці журналістам «МС» і **старшыня Мінгарсавета Андрэй БУГРОЎ.**

І вось днямі ён паведаміў журналістам аб тым, што па ініцыятыве дэпутатаў сёлета ў красавіку ў Мінску ўпершыню распачнецца збор пратэрмінаваных лекаў і медыцынскіх прэпаратаў, якія з-за няправільнай утылізацыі могуць уяўляць небяспеку для экалогіі, здароўя людзей. Гэта, па словах Андрэя Бугрова, значны сацыяльны праект. Падрыхтоўку і ход яго будучай рэалізацыі сумесна з гарадскімі ўладамі дэпутаты грунтоўна абмеркавалі на чарговай сесіі Мінгарсавета. Пытанне няпростае, бо, скажам, самы надзейны шлях утылізацыі пратэрмінаваных лекаў — іх спальванне.

Нагадаем, у свой час у Мінску з'явіліся спецыяльныя скрыні для батарэек і электралямпачак, якія адпрацавалі свой рэсурс. У выніку ўдалося пазбегнуць заражэння навакольнага асяроддзя таксічнымі адходамі.

Леанід ТУГАРЫН.

Мясцовае самакіраванне

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 11 лютага 2021 года.

ПАДНЯБЕСНАЯ «ГУКАЕ ВЯСНУ»

У Кітаі сустрэлі новы 4719 год

Амаль сярэдзіна лютага на календары, а чарада свят усё працягваецца. У нас маразы і завеі, а ў Паднябесную прыйшло Чуньцзэ — Свята вясны. Так рамантычна тут называюць пачатак новага года. Сёлета гэта 4719-ы. І сустрэлі кітайскі Новы год не толькі на яго «радзіме». Яго таксама ад усёй душы адзначылі ў многіх краінах, дзе пражывае значная колькасць кітайцаў, перш за ўсё ў дзяржавах Усходняй Азіі. У Кітаі з гэтай нагоды распачаліся вялікія святочныя канікулы. Каларыту месяцоваму Новаму году надае і сённяшняя люстраная дата — 12.02. 2021. Чым жа адметнае Чуньцзэ і як правільна «гукаць вясну» ў лютым?

АД ЖОЎТАГА ІМПЕРАТАРА

Кітайскі каляндар папулярны таксама ў Камбоджы, Манголіі, В'етнаме і іншых азіяцкіх краінах. Гэта сістэма з 60-гадовым цыклам. Яна грунтуецца на... астранамічных цыклах Юпітэра. На працягу 60 гадоў такая планета робіць пяць абаротаў вакол Сонца. Выходзячы з гэтага, азіяцкія астролагі падзялілі шлях Юпітэра на 12 частак. Дні пазначаліся камбінацыяй з дзесяці знакаў, так званых ствалоў, у якія ўваходзілі пяць «зямных стыхій» — дрэва, агонь, зямля, метал, вада. Гэтыя знакі яшчэ класіфікуюцца па прыкметах «ян» (мужчынскі) і «інь» (жаночы), а таксама па 12 «галінах», якія пазначаліся задыякальнымі сімваламі жывёл.

«У нас у Кітаі свая сістэма задыяка, ці «шу» — па жывёлах, і яна больш папулярная, чым звыклыя вам, еўрапейцам, «вадалей-блізняты», — растлумачыў парталу ria.ru Фан Фэй, заснавальнік падкаста і пабліка «Шэры Мока». Дарэчы, такім хітрым спосабам кітайцы таксама высвятляюць і ўзрост новага знаёмага, прыкідваючы, у якім годзе ён мог нарадзіцца.

У адпаведнасці з кітайскай традыцыяй гады адлічваюцца ад пачатку праўлення Хуан-дзі — з 2698 года да н. э. Такім чынам і атрымліваецца, што сёлета наступае 4719-ы. Хуан-дзі, або Жоўты імператар, — легендарная асоба, ён лічыцца заснавальнікам даасізму і — ні больш, ні менш — першапродкам усіх кітайцаў. Прынята лічыць, што жоўты колер суадносіцца з характэрным адценнем вады ракі Хуанхэ. Цікава, што гэты колер у Кітаі стаў імператарскім, кіраўнік насіў адзенне залацістажоўтага колеру, на спіне звычайна вышываўся залатымі ніткамі іншы сімвал імператарскай улады — лун, які з'яўляецца адначасова і адным з рачных божастваў.

Хуан-дзі пасля цяжкай барацьбы здолеў падпарадкаваць сабе правадыроў асобных плямёнаў і стварыў першую кітайскую дзяржаву ў гарах Куньлунь — на захад ад ракі Хуанхэ. Устанавіўшы мір, Жоўты імператар прынёс ахвяры багам, прызначыў чыноўнікаў-кіраўнікоў і ўвёў першыя ў краіне законы. Усяго Хуан-дзі меў 25 сыноў, 14 з якіх сталі родапачынальнікамі вядомых кітайскіх кланаў. Яму прыпісваецца вынаходства сякеры, лодкі і вёслаў, ступкі і таўкачыка, лука і стрэл, сукенкі і туфляў, а таксама падзел зямлі на надзелы. Яго паплечнікі стварылі іерагліфічную пісьменнасць і каляндар. Хуан-дзі прыпісваюць аўтарства многіх класічных твораў, у тым ліку асноватворных медыцынскіх трактатаў Хуан-дзі Нэй цзін, а таксама кароткага сачынення ў вершах Іньфуцзін, ушанаванага ў даасізме. Прывязку да легендарнага імператара мае таксама «Жабіны канон», які змяшчае прадпісанні па акупунктуры і лячэнні прыпяканнямі.

Дасюль захаваўся маўзалей Хуан-дзі — месца, дзе быў пахаваны легендарны Жоўты імператар. Ён знаходзіцца за 140 кіламетраў па аўтатрасе на поўдзень ад цэнтра гарадской акругі Яньань правінцыі Шэньсі. Маўзалей з'яўляецца адным з першых збудаванняў, якія былі ўключаны ў спіс ахоўваемых аб'ектаў культурнай спадчыны Кітая. Ён складаецца з дзвюх частак — храма Хуан-дзі і залы маўзалея. Паводле легенды, імператар узышоў на неба, таму ў маўзалеі захоўваюцца толькі яго адзенне і капялюш. Шматлікія кіраўнікі Кітая са старажытных часоў прыязджалі сюды ўшанаваць Хуан-дзі.

У 2637 годзе да н. э. па загадзе заснавальніка кітайскай цывілізацыі ўстанавілася сістэма летаслічэння, у якой базавым стаў поўны 60-гадовы цыкл. Падчас Сіньхайскай рэвалюцыі ў 1911-м кітайцы перайшлі на еўрапейскую сістэму, але, нягледзячы на гэта, дасюль выкарыстоўваюць старажытны каляндар.

КОЛЕР НАСТРОЮ — ЧЫРВОНЫ

На працягу тысячагоддзяў у Паднябеснай і па ўсім свеце адзначаецца Свята вясны. Штогод дата Чуньцзэ змяняецца, паколькі вызначаецца выключна па месяцава-сонечным кітайскім календары. Адсюль і другая назва — месяцавы Новы год. Пачатак святкавання прыпадае на другі маладзік пасля зімовага сонцастаяння і таму перамяшчаецца ў межах месяца — паміж 21 студзеня і 21 лютага. Сёлета Свята вясны адзначаюць з 12 лютага, пры гэтым афіцыйныя канікулы ў кітайцаў будуць доўжыцца амаль тыдзень.

Перад святам краіна літаральна расцвітае кумачом. Паўсюль вісяць плакаты з вытанчана выпісанымі на іх іерогліфамі «фу» (шчасце) і «сі» (радасць), гірлянды ліхтароў і іншыя ўпрыгажэнні, і ўсе яны — выключна чырвонага колеру, які азначае поспех і дабрабыт. На дзвярах жыхары налепліваюць парныя каліграфічныя надпісы, выкананыя чорнай тушшу на чырвонай паперы. Змест зводзіцца да выказвання жыццёвых ідэалаў гаспадара хаты або добрых пажаданняў на новы год. На дзверы налепліваюць таксама выявы духаў-ахоўнікаў і бажаства багацця ў надзеі, што яны прынясуць у хату шчасце і дабрабыт.

Традыцыйна перад святам у Паднябеснай настае час «суботнікаў» — напярэдадні Чуньцзэ кітайцы павінны прыбраць свой дом, прычым робяць яны гэта грунтоўна. Пасля таго як дом вычышчаны, усе мяцёлкі, саўкі, анучы прыбіраюцца ў месца, дзе б іх ніхто падчас свята не змог убачыць. Падчас Чуньцзэ займацца ўборкай непажадана. Паводле народных легендаў, перад наступленнем Новага года багі дораць людзям удачу, якая асядае ў выглядзе пылу. Вось і атрымліваецца, што, прыбіраючы ў гэтыя дні, можна спудзіць поспех.

ТОФУ І ХУНБАА

Жыхары Паднябеснай, мабыць, самыя актыўныя карыстальнікі «сусветнага павуцiння» ў свеце, таму ўсё часцей лічаць за лепшае віншаваць сяброў і блізкіх анлайн. На змену традыцыйным званкам і паштоўкам прыйшлі паведамленні па месенджары WeChat. Адзін з самых папулярных спосабаў — адпраўка «стыкера» — анімаванай карцінкі. Часта карыстальнікі сумяшчаюць традыцыйныя пажаданні — кітайскія ідыёмы (чэн'юй) — з пацешнымі малюнкамі або фатаграфіямі знакамітасцяў. Не стаў выключэннем і год Белага Металічнага Быка.

Навагодняя вячэра адрозніваецца не толькі багаццем і разнастайнасцю страў, але і старадаўнімі традыцыямі. Напрыклад, меню не абыходзіцца без страў з курынага мяса, рыбы і «доўфу» — соевага тварагу (у нас яго называюць «тофу»), бо ў кітайскай мове назвы гэтых прадуктаў сугучныя са словамі, якія азначаюць «шчасце» і «дабрабыт».

Паводле паданняў, у пачатку года ў кожны дом зазірае міфічная істота Нянь і знішчае запасы збожжа, жывёлу, а ў некаторых выпадках — нават дарослых і дзяцей. Таму ў першы дзень Чуньцзэ на ганку пакідаюць трохі ежы, каб задобрыць Няня і такім чынам адкупіцца ад яго. Па адной з легендаў, яшчэ ў старажытныя часы кітайцы аднойчы ўбачылі, як ненасытная істота спалохалася маленькага дзіцяці ў чырвонай вопратцы. Тады людзі вырашылі, што Нянь апасаецца гэтага колеру, і з тых часоў падчас Свята вясны яны апранаюць нешта чырвонае. Акрамя таго, кітайцы з першага да апошняга дня святкавання ўзрываюць феерверкі і петарды, каб гучным шумам адпудзіць злых духаў.

На Свята вясны ў Кітаі прынята абменьвацца падарункамі. Самым распаўсюджаным з'яўляецца чырвоны канверт з грашыма — «хунбаа». Яго прэзентуюць родным і сябрам, а таксама традыцыйна кіраўніцтва кампаній віншуе такім чынам сваіх падначаленых. Чырвоныя канверты — гэта не толькі грошы, але і пажаданне ўдачы і працвітання іх атрымальніку. З развіццём тэхналогій рабіць такія падарункі стала яшчэ прасцей. Той жа WeChat з 2015 года даў свабоду ім карыстальнікам магчымасць адправіць грашовыя «хунбаа» ў асабістыя і публічныя чаты. У старадаўнія часы грошы дарылі ў выглядзе караляў, якія складаліся са ста манет. Гэта было своеасаблівае віншаванне — пажаданне пражыць да ста гадоў. Дарэчы, каралі са ста манет і сёння вельмі папулярныя ў Кітаі.

БЫК ПРЫНЯСЕ ЎДАЧУ

На поўначы Паднябеснай на Новы год прынята есці пельмені, а на поўдні — «няньгаа» (скрылькі, прыгатаваныя з клейкага рысу). Паўночнікі аддаюць перавагу пельменям, бо на кітайскай мове слова «цзяацзы» сугучнае са словамі «праводзіны старога і сустрэча новага». Таксама лічыцца, што пельмені нагадваюць сваёй формай традыцыйныя зліткі з золата і срэбра і сімвалізуюць пажаданне багацця. З той жа прычыны жыхары поўдня ядуць «няньгаа», якія сімвалізуюць паляпшэнне жыцця.

Падчас свят кітайцы пераапранаюцца ў ільвоў і драконаў, а таксама ладзяць свае знакамітыя выступленні ў маляўнічых касцюмах і на хадулях. Прынята хадзіць у госці да сяброў, блізкіх і сваякоў і ўручаць падарункі ў чырвонай упакоўцы. Існуе традыцыя, паводле якой, прыходзячы ў госці на Новы год, трэба прыносіць два мандарыны. А падчас сыходу ўжо гаспадары аддаюць свае два мандарыны. Уся справа ў тым, што фраза «пара мандарынаў» на кітайскай гучыць практычна як слова «золата». І атрымліваецца, што такім чынам і госці, і гаспадары жадаюць адзін аднаму дастатку. Навагоднія святы завяршаюцца пасля свята Ліхтароў (Юаньсяацзэ або Дэнцзэ) — на пятнаццаты дзень першага месяца па месяцавым календары.

Белы Металічны Бык сімвалізуе моц, непахіснасць, імклівасць і адвагу. Людзям з такімі якасцямі гэты год прынясе ўдачу, абяцаюць астролагі. Нездарма ж сучасныя жыхары Паднябеснай, калі хваляць іншых, нярэдка кажуць: «Ты — класны» (у кітайскай мове для абазначэння слова «класны» выкарыстоўваецца іерогліф «бык»).

Захар БУРАК.

❍ З нагоды

«Наша дружба вытрымала шматлікія выпрабаванні»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна з традыцыйным Святам Вясны, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дзякуючы дальнабачнасці і эфектыўнай сацыяльна-эканамічнай палітыцы Кітай у 2020 годзе поўнасцю пазбавіўся ад беднасці і фактычна дасягнуў першай з «мэт двух стагоддзяў» — пабудовы грамадства сярэдняга дастатку.

«Уражальныя поспехі ў барацьбе з каранавіруснай інфекцыяй у чарговы раз прадэманстравалі ўсяму свету, што моцны і сучасны Кітай здольны абараніць народ і сваю дзяржаўнасць», — адзначаецца ў віншаванні.

Прэзідэнт высока ацаніў падтрымку і своечасовую дапамогу, аказаныя Беларусі ў няпросты перыяд кітайскім бокам, адзначыўшы, што яны дарагога вартыя. «Запэўніваю вас, што і Кітай заўсёды можа разлічваць на Беларусь. Наша дружба вытрымала многія выпрабаванні, якія мы пераадольваем разам, таму па праве называем сябе «жалезнымі братамі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Перакананы, што ў 2021 годзе мы выведзем двухбаковае партнёрства на новы ўзровень, працягнем сумесную работу па выбудоўванні міжнародных адносін у духу павагі, роўнасці, справядлівасці і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Сі Цзіньпіну за асабісты ўклад у развіццё саюзніцкіх сувязяў паміж Пекінам і Мінскам, пажадаў яму добрага здароўя і шчасця, а вялікаму кітайскаму народу — поспехаў і дабрабыту.

❍ Даслоўна

«Важна пашырыць інвестыцыйную прысутнасць вядучых кітайскіх кампаній і банкаў у Беларусі»

Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на VI Усебеларускім народным сходзе.

«Асаблівыя адносіны звязваюць Беларусь і Кітай. Наша знешнепалітычная стратэгія адносіць гэтую вялікую дзяржаву да краін далёкай дугі, але дэ-факта адказнае партнёрства, нягледзячы на адлегласць, зрабіла нас найбліжэйшымі суседзямі. Наша стратэгічнае супрацоўніцтва з Кітаем стала адной з прычын атакі Захаду на Беларусь у канцы мінулага года, але нас гэта спыніць не павінна. Мне проста ў вочы было сказана: «Вы сыходзіце ад Кітая, Кітая не павінна быць у цэнтры Еўропы». На што я ім адказаў: «Калі Еўрасаюз і ЗША атакавалі нас і эканоміку Беларусі гадоў пяць-шэсць таму маштабнымі санкцыямі, Кітай безумоўна нас падтрымаў, у той час ён адчыніў свае дзверы для нас, і мы ўвайшлі. І што, мы цяпер павінны закрыць Кітаю адзіны шлях у Еўропу, гэтую фортку праз Беларусь? Мы не можам на гэта пайсці, таму што мы людзі ўдзячныя і памятаем, што было тады. Вось такі быў адказ кіраўніцтва ЗША і іншым зацікаўленым у гэтым пытанні», — адзначыў беларускі лідар.

Гэты прыклад, на яго думку, толькі пацвярджае правільнасць курсу на паглыбленне стратэгічных адносін з Кітаем. «Нашы арыенціры развіцця шмат у чым супадаюць, што з'яўляецца асновай для далейшага ўмацавання сувязяў Беларусі і Кітая. Цяпер КНР аказвае рэальнае садзейнічанне нашай краіне ў будаўніцтве жылля за іх кошт, знакавых аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. На бягучым этапе важна пашырыць дзелавую і інвестыцыйную прысутнасць вядучых кампаній і банкаў у Беларусі, перш за ўсё ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень». Нам у сваю чаргу неабходна больш актыўна асвойваць невычэрпны кітайскі рынак», — лічыць Прэзідэнт. Тым больш Кітай, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, адкрыўся для Беларусі ў гэтым плане. Цяпер рэалізуецца экспартная заяўка па сельгаспрадукцыі, харчаванні, прамысловых таварах. «Сотні беларускіх сельгасарганізацый ужо акрэдытаваныя для паставак у Кітай. У сярэднім гэта дадасць да нашага экспарту ў КНР каля $700 млн і да $1 млрд», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 25 февраля 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-13331, общая площадь – 250,8 кв. м, наименование – столовая, назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности: одноэтажная кирпичная столовая с пристройкой 1, навесом 2, сараем 3, в том числе устройство стоянки на 10 автомобилей а1, металлическое ограждение столовой а2, водоотводной канал возле столовой а3, ограждение столовой а4, благоустройство территории вокруг столовой а5, система водоснабжения столовой а6, система канализации столовой а7, система наружного освещения столовой а8; котел КЧУ-7-63А Эффект зав. № 3858 (инв. № 196338), система пожарной сигнализации столовой Логоза (инв. № 175819), система охранной сигнализации столовой Логоза (инв. № 175839)
Местонахождение продаваемого имущества	Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, д. Логоза, ул. Центральная, 1
Сведения о земельных участках	Площадь – 0,1032 га, кадастровый номер 623284502604000021, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой; площадь – 0,0148 га, кадастровый номер 623280806404000022, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой
Продавец имущества	ОАО «МТЗ», 220070, г. Минск, ул. Долгобродская, 29
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К.Маркса, 39, к.10
Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС	137 151,02 бел. руб.
Сумма задатка	13 700,00 бел. руб.
Условия торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 25.02.2021.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 20 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **25 февраля 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.02.2021 по 23.02.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 363 38 42; (017) 333-49-67.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 333-49-67 (ОАО «МТЗ»).

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»

Лот № 1, состав:

1. **А 1/к. Здание склада,** инв. № 500/С-24336, 744 кв. м, г. п. – 1972.
2. **Склады,** инв. № 500/С-65757, 329,7 кв. м, г. п. – 1973.
3. **Склады,** инв. № 500/С-65956, 58,9 кв. м, г. п. – 1975.

Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 14, 14/1, 14/2. Обременение: аренда.
Начальная цена, бел. руб. – 633 042,00 с НДС.
Задаток, бел. руб. – 63 304,20. Шаг аукциона – 5 %.
Земельный участок площадью 0,4758 га с кадастровым номером 500000000004000019. Право аренды (по 28.02.2050). Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится 24.02.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **22.02.2021 в 11.00.**

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ И ПРЕДМЕТАХ АУКЦИОНА

Дата, время и место проведения аукциона: 22.03.2021 г. в 10.00 по адресу: Минская область, Смолевичский район, г. п. Зеленый Бор, ул. Социалистическая, д. 9. Помещение Зеленоборского сельисполкома.

Лот № 1 – земельный участок с кадастровым номером 624855700001000478 в г. п. Зеленый Бор, ул. Минская (участок № 1), площадь 0,1014 га; назначение – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, начальная цена 4 000 руб.
Лот № 2 – земельный участок с кадастровым номером 624855700001000477 в г. п. Зеленый Бор, ул. Минская (участок № 2), площадь 0,0982 га; назначение – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, начальная цена 4 000 руб.
Лот № 3 – земельный участок с кадастровым номером 624855700001000486 в г. п. Зеленый Бор, ул. Комсомольская (участок № 3), площадь 0,1500 га; назначение – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, начальная цена 7 000 руб.
Лот № 4 – земельный участок с кадастровым номером 624885706601000065 в дер. Островы, ул. Лесная (участок № 4), площадь 0,1500 га; назначение – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, начальная цена 4 000 руб.

Извещение о проведении аукциона опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by((http:// gki.gov.by/ru/auktsion и Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by/(http://minsk-region.gov.by/dlya delovykh lyudey/auktsiony).

Антикризисный управляющий общества с ограниченной ответственностью «Фермерский Агро Альянс» – ООО «Форхэнд» (организатор торгов) извещает о проведении 01.03.2021 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности общества с ограниченной ответственностью «Фермерский Агро Альянс»:

